№ 42 (400) 12 лістапада 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Што з Разанавым**
Геніяльны паэт у шпіталі.
старонка 15

**Аскірка&Антусевіч**
Як выйграваць у лукашэнкаўцаў.
старонка 5

**Сяргей Жалток**
Спартоўцы і сьмерць.
старонка 7

**Аляксандар Квасьнеўскі**
сьвяткуе 50-годзьдзе.
старонка 6



### Парлямэнт неабраных

Валер Шчукін стварае Народную асамблею з тых, хто ня трапіў у нацыянальны сход. **Старонка 2.**

### Усё лепшае — дзецям

Трэці беларускі GSM-апэратар «Best» будзе на 100% дзяржаўным. Яго сузаснавальнік — прадпрыемства ВПК «Агат», на якім працуе прэзыдэнтаў сын Віктар. **Старонка 2**.

### Юшчанка абышоў Януковіча

Пасьля 10 дзён падліку галасоў украінскі Цэнтравыбаркам прызнаў перамогу Віктара Юшчанкі ў першым туры выбараў. **Старонка 3**.

### Хроніка супрацiву

Па 70 базавых велічыняў штрафу атрымалі Віктар Сазонаў і Сяргей Мальчык за ўдзел ва ўшанаваньні памяці Каліноўскіх у Сьвіслачы.
У Бабруйску 7 лістапада падчас раздачы ўлётак затрыманыя Юры Радзімоўскі і 83-гадовы вэтэран вайны Міхаіл Мязяк.
Іншыя паведамленьні з хронікі — **старонка 10**.

### Свой сьвет штотыдзень

«Наша Ніва» з Новага году будзе выходзіць на 24 старонках штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Дык падпісвайся!

# Самі з вушамі

75 працэнтаў беларускай музыкі на FM ад Новага году: музыканты за, радыйшчыкі круцяць носам



WWW.KRAMBAMBULYA.COM

**Міністар інфармацыі Ўладзімер Русакевіч адклаў увядзеньне 75-працэнтнае квоты беларускай музыкі на радыё да Новага году.**

У аўторак у міністра інфармацыі Русакевіча сышліся ўсе 13 кіраўнікоў FM-станцый, каб абмеркаваць гарачае пытаньне «75 працэнтаў». Нарада была закрытай для журналістаў, аднак удалося даznаць, што там адбывалася.

Радыйшчыкі выбралі наступную тактыку: каб трансьляваць столькі беларускай музыкі, яе столькі трэба мець. Трэба мець якасныя студыі, вялікую колькасьць таленавітых аранжыроўшчыкаў ды музыкаў, спрыяльныя ўмовы для раскруткі — усё тое, чаго цяпер бракуе.

**Працяг на старонцы 2.**



**Эпоха Кашкурэвіча**

Старонка 8.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Сацыёлягі: вынікі выбараў высcаны з пальца

**Кампанія «Gallup-Baltic Surveys» паведаміла абагульненыя вынікі экзыт-полу (апытаньня выбарцаў на выхадзе з участкаў для галасаваньня 17 кастрычніка). У дадатак да вынікаў «рэфэрэндумнага» экзыт-полу «Gallup» (толькі 48,4% «за») была прэзэнтаваная інфармацыя пра тое, як беларусы галасавалі на выбарах. Большасьць падтрымала дэмакратычных кандыдатаў, сьцьвярджаюць сацыёлягі!**

Вынікі экзыт-полу ставяць пад сумнеў амаль усе вынікі, абвешчаныя Л.Ярмошынай. Паводле сацыёлягаў (памылка ня можа быць большаю за 1%), з 20 акруг, у якіх праводзілася апытаньне, толькі ў сямі знайшліся кандыдаты, якім у першым туры аддалі свае галасы больш за 50% апытаных (паводле выбарчых камісій, дэпутаты былі выбраны ва ўсіх 20-ці акругах). Прычым з гэтых сямі ў трох выбары былі безальтэрнатыўнымі.

**Працяг на старонцы 3.**

# Музыканты за, радыйшчыкі круцяць носам

Працяг са старонкі 1.

Асноўныя праблемы — запісы айчынных выканаўцаў, якія дасылаюцца цяпер на радыёстанцыі: а) несуаднесеныя з фарматам — на «Расейскім радыё», напрыклад, «Крамбамбулі» не пачуеш; б) нізкай якасьці (як заўважыў адзін з кіраўнікоў FM-станцыі, ці не палова беларускіх музыкаў пішуцца ў сябе на кухні). Тым ня менш, усе пагалоўна кляліся ў сваім жаданьні падтрымліваць беларускую музыку, «калі трэба». Пакуль было вырашана пакінуць усё як ёсьць, г.зн. у творчых канцэпцыях FM-станцый застаецца лічба 50%, аднак міністар інфармацыі вызначыў deadline «на падумаць» — да Новага году. Праз паўтара месяца ўсе зьбяруцца ізноў, каб нарэшце вызначыцца.

Словы Лукашэнкі, прамоўленыя на нарадзе, прысьвечанай «Славянскаму базару», пра тое, што Пугачова гучыць з кожнага праса, а беларускай музыкі на радыё вельмі мала, змусілі кіраўнікоў FM-станцый перагледзець музычную фанатэку на прадмет наяўнасьці там песень беларускіх выканаўцаў. Лукашэнка захацеў, каб айчынная музыка займала яшчэ болей месца ў этэры — уведзеная раней норма ў 50% мусіць павялічыцца яшчэ на 25%, прычым не ўначы, як гэта было раней, а ў спрыяльны для слуханьня час.

Што значыць для FM-станцыі, у якой фармат, напрыклад, «сучасная замежная поп-музыка», аддаць большую частку вяшчаньня на беларускіх выканаўцаў? Зь іншага боку, пры адсутнасьці квотаў для беларускай музыкі, нацыянальная культура аказваецца безабароннаю перад агрэсіўнай расейскай поп-індустрыяй.

Лідэр групы «J-Морс» Уладзімер Пугач, песьні якога знаходзяцца ў жорсткай ратацыі на ўсіх айчынных радыёстанцыях, дзьвюма рукамі падтрымлівае ўвядзеньне большае квоты: «Няроўныя ўмовы? Знайдзіце беларускіх выканаўцаў на ТВ. Там гучаць у асноўным расейскія. 75-працэнтная квота можа заахвоціць і лэйблы, і музыкаў, і студыі на вытворчасьць больш якасных фанаграм».

Лідэр «Палацу» Алег Хаменка адрэагаваў эмацыйна: «Да папулярызацыі роднай музыкі трэба ісьці гадамі, а то беларус Сярога становіцца зоркай ва Ўкраіне, а ў нас невядомы. 20 айчынных калектываў не пускаюць на ТВ! Плюс пастановы: калі будуць круціць бальшыню беларускай музыкі, грошы з адлічэньняў застануцца ў Беларусі».

**Сяргей Будкін**

### Штурм FM працягваецца

Актывісты маладзёвай ініцыятывы «Вока» працягваюць штурмаваць менскія FM-станцыі, просячы уключыць для іхных сяброў песьню на беларускай мове ў часе канцэртаў па замовах слухачоў. Пасьля «Альфа-радыё» надышла чарга радыё «Пілёт», на якім удалося замовіць... адну песьню.

Затое дырэктар «Альфа-радыё» запрапанаваў сустрэцца з прадстаўнікамі ініцыятывы, каб папрасіць прабачэньне за непаразуменьні, калі супрацоўнікі станцыі патрабавалі ад юнакоў гаварыць па-расейску, калі яны хочуць трапіць у эфір станцыі.

Паводле «Вока» дзьве радыёстанцыі яны не зьбіраюцца штурмаваць. Гэта «Аўтарадыё», дзе пускаюць шмат беларускай музыкі, прычым у беларускім блёку гучаць песьні толькі па-беларуску. Другое — радыё «Мір», якое не ганьбавала беларускія песьні нават да славутых 50%.

К А М Э Н Т А Р   Р Э Д А К Ц Ы І

### Лукашэнка мае рацыю, радыйшчыкі лукавяць

Пытаньне квоты на беларускую музыку прынцыповае. Павінны мы ці не павінны абараняць нацыянальную культуру заканадаўча? Чужая яечня вечна ці ня вечна? 50% беларускай музыкі ў рэальнасьці азначалі ня больш, чым проста зьяўленьне лічаных працэнтаў беларускіх і адзінкавых беларускамоўных кампазыцый у дзённым эфіры. І 75% будзе значыць ня больш як адноснае павелічэньне гэтых малых лічбаў. Гэта як з мовай: пасьля ўвядзеньня дзьвюхмоўя ніякага раўнапраўя моваў не засталося. Пануе расейская, носьбіты беларускай не наважваюцца размаўляць на ёй нідзе па-за кватэрай. Калі ж дзяржаўнаю была адна беларуская мова, краіна паволі набліжалася да рэальнага раўнапраўя.

Праціўнікі квотаў гавораць аб парушэньні раўнапраўя, але ў рэальнасьці гарантаваць мінімальныя ўмовы для разьвіцьця беларускай музыкі могуць толькі квоты. Прычым квоты для дзённага эфіру, якія б абумоўлівалі наяўнасьць 40% беларускамоўных песень.

Узровень? Мне заўжды здавалася, што прымітыўнейшай за цяперашнюю FMную папсу можа быць толькі творчасьць узорнага ансамблю бабуінаў-балалаечнікаў. Заўважу, што Скрыпка ва Ўкраіне стаў тым, кім ёсьць цяпер, толькі праз некалькі гадоў пасьля ўкраінізацыі мэдыяў. Калі мы хочам якаснага культурнага прадукту, трэба спачатку стварыць попыт на яго.

Няма якасных запісаў, студый? Гэта пытаньне тэхнікі, пра якое, урэшце, могуць паклапаціцца самі станцыі. Такія інвэстыцыі акупяцца. Хто вінаваты, што ляўрэаты «Басовішча» запісваюцца не на «Альфе», а на правінцыйным радыё «Беласток»?

Тое, што рабілася ў FM-сфэры, — ніводнага беларускамоўнага радыё, ніводнае беларускае песьні і «тэлефанаваньні па-беларуску не падыходзяць пад наш фармат» — інačай як культурным фашызмам не назавеш. Фашызмам, які элегантна душыць культурную альтэрнатыву.

Сваімі аргумэнтамі супраць 75% радыйшчыкі вешаюць локшыну на ўласныя вушы. Сёньня найпрасьцей зарабляць на чужой папсе. Як на перакупных апэрацыях найпрасьцей было ствараць пачатковы капітал. Але ўкладаньні ў вытворчую сфэру таксама выгадныя. І непазьбежныя, калі хочаш мець стабільны рынак. У пэрспэктыве раскрутка сваёй музыкі прывядзе ня толькі да памнажэньня культурных здабыткаў, але і да грашовых прыбыткаў, як ва Ўкраіне й Літве, якія аналягічныя захады пазьбыўнай дыскрымінацыі ўвялі яшчэ 10 гадоў таму.

Абарона культурнае адметнасьці Беларусі — гэта тая галіна, дзе дзяржава ня толькі мае права, але і абавязана навязваць квоты.

**Барыс Тумар**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Усё лепшае — дзецям

## Трэці апэратар GSM бяз тэндэру дастаўся «Агату»

Трэці беларускі GSM-апэратар будзе называцца «Best» і будзе на 100% дзяржаўным, прычым сузаснавальнікам стане навукова-вытворчае аб'яднаньне «Агат», якое належыць да сфэры ВПК. Доля «Агату», у якім адно з падразьдзяленьняў узначальвае сын Лукашэнкі Віктар, складзе ў новай кампаніі больш за 70%. Другім заснавальнікам «Bestu» будзе дзяржаўны «Белтэлекам».

Бізнэс-плян з тэрмінамі ўводу абсталяваньня, аб'ёмам фінансаваньня праекту і памерам абанэнцкай базы новай кампаніі зьявіцца пры канцы лістапада. Пасьля вызначэньня канкрэтнай сумы патрэбных інвэстыцый будуць прыцягнуты крэдыты пад гарантыю ўраду.

Беларускі ўрад аддаў трэцяга апэратара ў дзяржаўныя рукі, што, на думку некаторых эканамістаў, прывядзе да захаваньня высокіх тарыфаў на сотавую сувязь. А як выглядае сытуацыя з мабільнай сувязьзю ў нашых суседзяў?

У Польшчы, дзе, паводле прагнозаў, да канца гэтага году будзе 21 млн карыстальнікаў мабільных тэлефонаў (у Беларусі — 2,5 млн), ёсьць тры асноўныя апэратары GSM. У кампаніях «Era» ды «Plus GSM» кантрольныя пакеты акцый належаць замежным кампаніям. Толькі ў кампаніі «Centertel», якой належыць «Idea», кантрольны пакет акцыяў мае «Telekomunikacja Polska» (66%), рэшта ў руках францускай «France Telecom» (34%). Вядуцца размовы пра чацьвёртага апэратара GSM, якім ужо зацікавіліся швэды, фіны ды галяндцы.

Падобна выглядае сытуацыя ва Ўкраіне. Галоўнымі інвэстарамі ўкраінскіх апэратараў мабільнай сувязі былі замежныя кампаніі. Толькі пры заснаваньні кампаніі «UMC» 51% акцый належаў «Укртэлекаму», рэшта замежным інвэстарам, але ў 2003 г. кампанія перайшла ў рукі расейскай «МТС». Дарэчы, заўважнае моцнае зацікаўленьне расейскіх кампаній украінскімі апэратарамі. Галоўным акцыянэрам вядучага ўкраінскага апэратару «Kyivstar» зьяўляецца кампанія «Telenor» (54%).

**Алесь Трафіменка**

# Парлямэнт неабраных

## Валер Шчукін стварае Народную асамблею з тых, хто ня трапіў у нацыянальны сход

У Беларусі выбухнула піяр-бомба: рыхтуецца стварэньне Народнага парлямэнту. Ідэя сабраць 110 дэмакратычных кандыдатаў у дэпутаты, якія мелі праблемы з рэгістрацыяй ці ня здолелі здабыць дэпутацкія партфэлі праз фальсыфікацыі, належыць праваабаронцу Валеру Шчукіну. «Не-не, гэта не альтэрнатыва апазыцыйным аб'яднаньням, — пераконвае ён. — Галоўная мэта — стварэньне альтэрнатывы афіцыйнаму парлямэнту, якога ніхто не прызнае легітымным».

Валер Шчукін зьвяртае ўвагу на тое, што новае аб'яднаньне, хутчэй за ўсё, будзе называцца не парлямэнтам, а асамблеяй — каб пазьбегнуць магчымых юрыдычных праблем. Стваральнік асамблеі адразу папярэджвае яе патэнцыйных сяброў пра пэўную рызыку: іх могуць абвінаваціць у прысвоеньні чужых паўнамоцтваў, а гэта — крымінальная справа.

Чым будуць займацца «народныя парлямэнтары»? «Распрацоўкай альтэрнатыўных праектаў найбольш рэакцыйных законаў, прыняцьцем афіцыйным парлямэнтам, — мяркуе Валер Шчукін. — Яшчэ адной задачай будзе прыняцьце альтэрнатыўнага закону аб выбарах, які б дазволіў дэмакратычным кандыдатам быць абранымі».

«Ідэя цікавая, — кажа Алесь Міхалевіч (БНФ), які быў пазбаўлены ўладамі права ўдзельнічаць у выбарах за некалькі дзён да галасаваньня. — Мяне, аднак, цікавіць у першую чаргу пытаньне легітымнасьці гэтых дэпутатаў. Трэба было б правесьці сход кандыдатаў да выбараў, а таксама зладзіць падобны «хурал» пасьля і ўжо на ім прымаць рашэньне аб магчымасьці аб'яднаньня. Гэта патрэбная ініцыятыва, і варта было б сабраць асамблею дэмакратычных кандыдатаў, якія былі зьнятыя ці незарэгістраваныя, але нельга, каб гэтае ўтварэньне было альтэрнатывай «Пяцёрцы+», бо яна — рэальны цэнтар кіраваньня аб'яднанай апазыцыяй».

Юрась Зянковіч, прэс-сакратар ПБНФ, пацьвердзіў афіцыйную пазыцыю партыі: утварэньне «народнага парлямэнту» — гэта спроба стварэньня альтэрнатыўнага цэнтру прыняцьця рашэньняў па-за "Пяцёркай+", таму партыя падтрымаць яго ня можа. Тым больш што ўжо існуе аб'яднаньне легітымна абраных дэпутатаў — Асамблея дэпутатаў мясцовых саветаў.

Да непрыемных зьвестак ад ПБНФ Валер Шчукін паставіўся з паразуменьнем: «Партыі ў прынцыпе ня могуць падтрымаць Народны парлямэнт — іх жа за гэта адразу закрыюць. Гэта будзе строга пазапартыйная ініцыятыва».

Уладзімер Колас, які, паводле незалежных падлікаў, перамог у першым туры, ставіцца да «народнага парлямэнту» з сумневам. «У мяне да гэтай ідэі ёсьць досыць крытычныя заўвагі. Так, трэба склікаць канфэрэнцыю дэмакратычных кандыдатаў, якія бралі ўдзел у выбарах, абмяркаваць наступныя дзеяньні. Але ня варта адразу дэлегаваць камусьці паўнамоцтвы. Праўда, я б так рэзка ня ставіўся да гэтай ініцыятывы, як Партыя БНФ. Розныя могуць быць прапановы, абмяркоўваць трэба ўсё. І ўвогуле, трэба адмовіцца ад ужываньня эўфэмізму — па ўсім відаць, што ўжо вядзецца падрыхтоўка да прэзыдэнцкай кампаніі».


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Перамога «рэжыму» на рэфэрэндуме ды выбарах была «ашаламляльнай», але непераканаўчай. Апазыцыя адчувае, што мае маральнае права на ўдзел ва ўладзе, якое ёй далі людзі, калі прагаласавалі за яе кандыдатаў. Спробы неяк рэалізаваць гэтае права па-за афіцыйнымі дзяржаўнымі структурамі цалкам натуральныя. Аднак без хаця б адноснай згоды паміж дэмакратычнымі плынямі, партыямі ды палітыкамі будзе створаны толькі дыскусійны клюб для нявыбраных дэпутатаў, а не Народны парлямэнт.

**Алесь Кудрыцкі**

# Сацыёлягі: вынікі выбараў выссаны з пальца

Працяг са старонкі 1.

Цікава, што толькі ў дзьвюх з гэтых сямі акруг кандыдатам ад улады не супрацьстаялі дэмакраты. А ў адной, дзе ішоў двубой моцнага дэмакратычнага кандыдата і лукашэнкаўцаў, — у менскай Старавіленскай акрузе — экзыт-пол зафіксаваў сапраўды элегантную перамогу дырэктара Беларускага ліцэю Ўладзімера Коласа — 63,27% галасоў!

## Другі тур

Зьвесткі экзыт-полу сьведчаць: каб годна выступіць супраць улады, апазыцыя мусіла б максымальна згуртавацца, заклікаць выбаршчыкаў аддаць галасы за адзінага кандыдата-дэмакрата. У цэлым у Менску, Барысаве і Ваўкавыску за кандыдатаў ад «Пяцёркі-плюс», «Эўрапейскай кааліцыі» і «Рэспублікі» разам узятых галасавалі 55—65% выбарцаў. У Воршы, Жлобіне, Наваполацку, Горадні і вясковых раёнах большасьць галасоў сабралі вылучэнцы ўлады. Але нават пры такім раскладзе апазыцыйныя кааліцыі рэальна маглі разьлічваць на 5—7 мандатаў у 20 акругах. Напрыклад, беспартыйны кандыдат меў рэальны шанец перамагчы ў Ваўкавыску. Прадпрымальніку Мікалаю Аўтуховічу экзытпол даваў у першым туры 45,61% супраць 42,40%, якія атрымала дырэктарка гімназіі №2 Тамара Навасад, і магчыма, што яму ў другім туры адышлі б галасы кандыдатаў ад партый «Пяцёркі-плюс», што падзялілі рэшту. Генэрал Фралоў у менскай Масюкоўшчынскай акрузе саступаў лукашэнкаўцу 35:37, але ў другім туры меў рэальныя шанцы перамагчы, бо яшчэ 23% галасоў у акрузе ўзялі кандыдаты ад «Пяцёркі-плюс».

## Рэцэпты ды антырэцэпты

Апазыцыя мела найгоршыя вынікі на выбарах у акругах, дзе некалькі малавядомых палітыкаў спаборнічалі з папулярным фаварытам улады. Прыклад — акруга №27 у Воршы, дзе Ўладзімер Жвікаў, беспартыйны дэпутат ПП НС, перамог у першым туры і па-афіцыйнаму, і па-гелапаўску (75,68%), а сярод астатніх пяці кандыдатаў, уключна з Фадзеем Шамаравым (ПКБ, 3,15%) ды Фёдарам Муханавым (БСДП (НГ), 7,21%), не было такога, хто б набраў больш за 8%.

Рэцэпт перамогі — адзіны кандыдат-дэмакрат. Гэты варыянт выдатна спрацаваў у акрузе Ўладзімера Коласа. Сацыёлягі раяць: калі дэмакраты хочуць удзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах-2006, яны мусяць вызначыцца з адзіным кандыдатам.

## У сьлёзы — ня варта, у скокі — зарана

Вынікі экзыт-полу даюць апазыцыі асьцярожныя падставы для аптымізму: пры сумленнасьці падліку галасоў дэмакраты мелі шанцы прайсьці ў парлямэнт. А калі б перадвыбарная кампанія была раўнапраўнай, перамога не была б немагчымай. Вядома, што самых праходных кандыдатаў ад апазыцыі (за малым выключэньнем) «зарубілі» яшчэ да выбараў. Тым ня менш, за кандыдатаў дэмакратычных кааліцый у цэлым у краіне прагаласавалі 47% выбарцаў. А калі адкінуць тыя акругі, дзе кандыдатаў-дэмакратаў не зарэгістравалі, дык і 54%.

Інфармацыя «Gallup» не дазваляе адназначна сказаць, хто меў больша посьпех на выбарах — улада ці апазыцыя. Аднак яна дае магчымасьць ацаніць тактыку і прагназаваць магчымы зыход выбараў пры разнастайных раскладках.

**АК**

# «Гэта наша разуменьне дэмакратыі»

## Беларусь — не краіна ўдоў і адзінокіх маці, амаль кожная жанчына мае магчымасьць стварыць сям'ю

**Старшы інспэктар аддзелу кадраў дзяржаўнага прадпрыемства УП «БелНДІПградабудаўніцтва» Валянціна Пісарэнка — шараговая прыхільніца цяперашняй улады. Чаму яна галасуе за Аляксандра Лукашэнку, спн. Валянціна патлумачыла карэспандэнту «НН».**


АРЦЁМ ЛЯВА

**— Чаму вы зрабілі выбар на карысьць зьменаў у Канстытуцыі?**

— Са свайго досьведу працы, а я займаюся кадравай палітыкай амаль 30 гадоў, я зрабіла выснову, што чалавек становіцца прафэсіяналам у сваёй справе, калі працуе на сваім месцы ня менш за пяць гадоў. Чалавек толькі тады здольны адаптавацца, вывучыць кола пытаньняў, якія давядзецца вырашаць, наладзіць эфэктыўныя зносіны зь людзьмі, зь якімі давядзецца мець службовыя дачыненьні, і, урэшце, атрымаць жыцьцёвы досьвед, досьвед у працы.

**— На вашу думку, для прэзыдэнцтва мала нават дзесяці гадоў?**

—Так, мала. Я лічу, чым больш чалавек працуе на пэўнай пасадзе, тым большых прафэсійных вышынь ён дасягае. Таму для такой адказнай справы, як кіраваньне краінай, так бы мовіць, пяці год стажу абсалютна недастаткова.

**— Але ж у іншых краінах, са сталай дэмакратыяй, прэзыдэнты неяк упраўляюцца і за чатыры гады.**

— Гэта ня наш выпадак. Мы — людзі зусім іншага характару, мысьленьня і выхаваньня. У нас іншае ўспрыманьне сьвету, адно аднаго як людзей, і гэтаксама мы выхоўваем сваіх дзетак. Я лічу, што павінна мінуць некалькі пакаленьняў, каб людзі ўспрымалі прэзыдэнта так, як на Захадзе, і ён адпаведна ставіўся да людзей. Хаця я супраць зьменаў у мэнтальнасьці. Цяпер мы маем талерантны, памяркоўны, працавіты, гасьцінны народ, дзякуючы чаму ў нас добра адчуваюць сябе прадстаўнікі розных нацыянальнасьцяў і веравызнаньняў.

**— Якія заслугі А.Лукашэнкі на пасадзе прэзыдэнта вы можаце адзначыць?**

— Стабільнасьць, спакой, мір, тое, што ў ваенных канфліктах ня гінуць маладыя людзі — генафонд нашай нацыі, тое, што наша краіна — не краіна ўдоў і адзінокіх маці, што амаль кожная жанчына мае магчымасьць стварыць сям'ю. Лукашэнка кожнаму гарантаваў пэўны мінімальны ўзровень задавальненьня ягоных патрэб. Гэта таксама важна.

**— Стабільнасьць — гэта добра. Але ці забясьпечваюцца ўмовы разьвіцця краіны, грамадзтва?**

— Я мяркую, што так. Дзяржава клапоціцца аб працаўладкаваньні моладзі, створана сыстэма размеркаваньня маладых спэцыялістаў пасьля навучаньня ў ВНУ. Шмат, вядома, у станаўленьні чалавека залежыць ад працавітасьці і сумленнасьці яго самога… Да таго ж Лукашэнка добра ведае людзей, наш народ. Чалавек, які пражыў у вёсцы, спазнаў усе бядоты і пакуты жыцьця бяз бацькі, цяжкую сялянскую працу, ведае цану хлеба. Ён можа зразумець і працаўніка вёскі, ягоныя праблемы, і рабочага чалавека, і чалавека з вышэйшай адукацыяй, бо сам праз усё прайшоў.

**— На вашую думку, ЦВК абвясьціла рэальныя лічбы вынікаў рэфэрэндуму?**

— Мяркую, што рэальныя. Бо ведаю, як галасавалі мае сябры-аднагодкі, людзі, якія маладзейшыя за мяне на год дзесяць, мае дзеці. Да таго ж вы зразумейце, справа тычыцца ня толькі А.Лукашэнкі, гэта тычыцца ўсіх прэтэндэнтаў на прэзыдэнцкую пасаду ў 2006-м і іншых гадах. Выбраць могуць любога годнага маладога чалавека — пэрспэктыўнага, разумнага, адукаванага. Любому чалавеку на месцы Лукашэнкі спатрэбіцца досьвед.

**— Наколькі ў такім разе адэкватнай была жорсткая рэакцыя ўладаў на акцыі пратэсту супраць вынікаў рэфэрэндуму цягам некалькіх дзён?**

— Я ў прынцыпе супраць усялякіх несанкцыянаваных акцый. Рэч у тым, што трэба ўладам дазваляць такія акцыі і рабіць зь іх пэўныя высновы. Але асабіста ў мяне, нават калі акцыі дазволяць, наведваць іх няма ніякага жаданьня. Мне страшна, калі юнакі ў стане алькагольнага ап'яненьня (? — **Рэд.**) ідуць на несанкцыянаваныя зборышчы, калі яны ўсё разбураюць на сваім шляху, пераварочваюць аўтамабілі, кідаюцца камянямі ў міліцыянтаў, якія выконваюць свой абавязак, што мела месца ў другой палове 90-х гадоў. Трэба дэмакратам скарыстоўваць іншыя шляхі: мірныя зборы, сустрэчы зь людзьмі, тлумачальную працу сярод насельніцтва. Выкарыстоўваць СМІ, каб данесьці сваю пазыцыю. Мяркую, што свобода слова ўсё-такі ёсьць у рэспубліцы (? — **Рэд.**). Словам і справамі можна дасягнуць нашмат большага, чым акцыямі пратэсту, тым больш несанкцыянаванымі.

**— Такім чынам, вы расчараваліся?**

— Так, я расчаравалася. Я сама бачыла нецьвярозых падлеткаў у Курапатах. Гэта ж несумяшчальныя рэчы — памяць пра продкаў і гарэлка. Увогуле я праціўніца ўжываньня алькаголю на тую ж Радаўніцу…

**— Як хутка, на вашу думку, павінна разьвівацца грамадзтва?**

— Я прыхільніца эвалюцыйнага разьвіцьця. Ня трэба падганяць падзеі. Тое, што мы маем цяпер, — гэта наша разуменьне дэмакратыі. Мы хочам сёньня такую ўладу, магчыма, аўтарытарную. Магчыма, праз некаторы час нашы ўнукі захочуць іншага і зробяць свой выбар. Страшна, калі сёньня моладзь хоча нічога не рабіць, а мець многае. Так ня можа быць. Усё дасягаецца праз пэўную працу.

**— Гэтай восеньню ў розных краінах сьвету адбываюцца выбары: у ЗША, Украіне... Ці адсочваеце вы гэтыя падзеі?**

— Я ўважліва сачу за падзеямі ва Ўкраіне. У мяне ў Кіеве жыве старэйшая сястра. У Нарыльску жыў старэйшы брат, а малодшы жыве ў Рызе. Дый карані мае ва Ўкраіне.

**— Хто з кандыдатаў у прэзыдэнты Ўкраіны вам больш сымпатычны — Юшчанка ці Януковіч?**

— Я нацыяналізм у любым праяўленьні не прымаю. Мне сымпатычны той, хто не выступае за тое, што, маўляў, Украіна ўкраінцам, Латвія латышам і г.д.

**— Дарэчы, калі параўнаць жыцьцё ў Латвіі і ў нас?..**

— Мой брат — не грамадзянін Латвіі. У іх тамака шмат залежыць ад таго, ці знайшоў расейскамоўны спэцыяліст сваю нішу. Ён гэтую нішу знайшоў. Кіруе фірмай па мантажы ліфтавага абсталяваньня, сам сабе гаспадар, вядзе свой малы бізнэс. Спэцыялісты там цэняцца. Але ж у Латвіі вельмі цяжка расейскамоўным пэнсіянэрам. Ёсьць выпадкі, калі людзей высяляюць за няўплату за жыльлё (а дамы часта прыватныя) на вуліцу…

**— Як вы мяркуеце, мог бы ваш брат арганізаваць свой бізнэс у Беларусі?**

— Думаю, што гэта ў нашых умовах складана. Ён хацеў быў пераехаць у Беларусь, але знаёмыя адрадзілі. Там у яго ёсьць пэўнае імя, напрацавана рэпутацыя, яго ведаюць у Латвіі і за мяжой. Тут трэба пачынаць усё з нуля і ня ў лепшых умовах, бо ў нашай эканоміц даміне дзяржава.

**— Што можаце сказаць на разьвітаньне?**

— Увогуле я паважаю людзей зь цьвёрдай грамадзянскай пазыцыяй. Добра, калі чалавек мае свае прынцыпы і адстойвае іх, а не вагаецца згодна з палітычнай кан'юнктурай.

**Гутарыў Арцём Лява**

## Эўропа дапаможа Беларусі

Польскі ўрад унясе папраўкі ў дзяржбюджэт на 2005 г., каб выдзеліць сродкі на падтрымку грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі. Так было вырашана падчас сустрэчы прэм'ер-міністра Марка Бэлькі з прадстаўнікамі парлямэнцкіх фракцый, калі абмяркоўвалася сытуацыя ў Беларусі.

А на канфэрэнцыі «Выпрабаваньне ўсходняй палітыкі: выбары ў Беларусі і ва Ўкраіне», што адбылася ў Варшаве 6 лістапада, пасол Ганс-Георг Вік прэзэнтаваў праект эўрапейскай праграмы прарыву інфармацыйнай блякады жыхароў Беларусі. Праграма зь бюджэтам 15 млн эўра на год прадугледжвае стварэньне радыёстанцыі, якая б вяшчала на сярэдніх хвалях на Беларусь і ў дыяпазоне FM для жыхароў памежных тэрыторый, дзе жывуць беларусы Польшчы й Літвы, і даносіла да людзей аб'ектыўную інфармацыю пра сьвет. З часам да яе мае далучыцца спадарожнікавы тэлеканал.

## Юшчанка абышоў Януковіча

Афіцыйныя зьвесткі: за Юшчанку 39,87%, за Януковіча 39,22% галасоў. Аб падтрымцы В.Юшчанкі ў другім туры заявілі старшыня Канфэдэрацыі прафсаюзаў і прадпрымальнікаў экс-прэм'ер Кінах і мэр Кіева Амельчанка. Нават прадстаўнік Украінскай праваслаўнай царквы Маскоўскага патрыярхату мітрапаліт Уладзімер блаславіў кандыдата ад апазыцыі падчас аўдыенцыі.

## «Мотавэля» нацыяналізуюць

Дзяржава хоча нацыяналізаваць Менскі мотавэлязавод (ААТ «Мотавэля»), які знаходзіцца ў фінансавым крызісе пасьля ўвядзеньня Віетнамам 40%-га падатку на беларускія ровары. Камітэт дзяржкантролю па выніках праверкі прапанаваў акцыянэрам звольніць дырэктара Анатоля Язьвінскага. Дырэктар ня стаў чакаць — падаў заяву сам. Цяпер прадстаўнікі дзяржорганаў пераконваюць работнікаў заводу перадаць іхныя акцыі дзяржаве. Завод — рэдкае ў Беларусі прадпрыемства, якім валодаюць самі супрацоўнікі.

## Шантаровіч спыніў галадоўку

Рэдактар ваўкавыскай «Местной газеты» Андрэй Шантаровіч 9 лістапада, на 21-м дні, спыніў галадоўку пратэсту супраць прыпыненьня выхаду газэты.

## Беларускія найміты ў Афрыцы?

Міністарка абароны Францыі заявіла, што 9 французкіх міратворцаў у Кот-д'Івуары (Афрыка) былі растраляныя з двух самалётаў «Су», якімі кіравалі беларускія лётчыкі. Міністэрства абароны Кот-д'Івуару заяўляе, што ў краіне працуюць толькі 15 авіямэханікаў зь Беларусі, а лётчыкаў няма. Мінабароны Беларусі кажа, што дзейных афіцэраў за межамі краіны няма, а за адстаўнікоў яно не адказвае.

## Помнік Іваноўскаму

У суботу 13 лістапада а 13-й гадзіне на Кальварыйскіх могілках адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё памятнага знаку на магіле Вацлава Іваноўскага. Хто мае час, калі ласка, прыйдзіце аб 11-й і дапамажыце прыбраць могілкі.

Грамадзкая камісія склала акт пра вынікі збору сродкаў на ўшанаваньне памяці Васіля Быкава па стане на 3 лістапада гэтага году. Агульная сума сабраных грошай склала 982990 рублёў і 73 даляры ЗША.

# Левы хелоўін

Лёлік Ушкін

**З розьніцай у тры тыдні адбыліся эўрапейскі ў Лёндане і беларускі ў Менску сацыяльныя форумы — асамблеі прыхільнікаў левай плыні.**



АРХІЎ АЎТАРА

Прыхільнікі левай альтэрнатывы адчуваюць папулярнасьць сваіх ідэй, але як гэта выкарыстаць, ня ведаюць.

Для чайнікаў нагадаю, што гісторыя форумаў зьвязана з горадам Порту-Алегры, сталіцай штату Рыё-Грандэ-Ду-Сул, што ў Бразыліі. Дарваўшыся да ўлады ў тутэйшым муніцыпалітэце, сябры Партыі працыператварылі места ва ўзор самакіраваньня. Імі быў рэалізаваны т.зв. «партыцыпацыйны бюджэт», калі рады жыхароў і NGO вырашаюць, каму колькі асыгнаваць з гарадзкой казны. У вачах левакоў усяго сьвету Порту-Алегрэ адразу стаўся П'емонтам сацыялізму, таму ў студзені 2001 г. у піку эканамічнаму форуму ў Давосе менавіта тут сабраўся левы бамонд — ад герыльерас-сапатыстаў да міністра французкага ўраду Шэвэнмана. Прысутнымі была асуджана мадэль нэакапіталістычнай глябалізацыі і закладзена традыцыя сацыяльных форумаў, якія хутка лякалізаваліся на кантынэнтальным і нацыянальным узроўнях.

У 2002 г. у Флярэнцыі адбыўся першы, а ў наступным годзе ў Парыжы — другі Эўрапейскі сацыяльны форум (ЭСФ). У гэтым годзе гаспадаром форуму быў абраны Лёндан. Беларусы таксама не засталіся на пэрыфэрыі сусьветных трэндаў. У 2003 г. у Менску ўбачыў сьвет аргкамітэт Беларускага сацфоруму (БСФ), які планавалі на каталіцкія Каляды. На жаль, выбарчая кампанія і фінансавыя траблы прымусілі падкарэктаваць пляны. Форум адбыўся толькі ў мінулы ўік-энд.

Натуральна, маштабы менскага і лёнданскага форумаў цяжка параўнаць.

Галоўным фундатарам ЭСФ выступаў мэр Лёндану Кен Лівінгстан. Лёнданскі бурмістар, па мянушцы Чырвоны Кен, стаў левым гуру яшчэ ў 80-х, калі ўзначальваў лёнданскую Раду. Тады ён проста фантанаваў сацыяльнымі праектамі. Кульмінацыяй яго фантазій стаў праект дэмантажу калёны адмірала Нэльсана на Трафальгарскай плошчы, на месцы якой плянавалася закласьці помнік Нэльсану Мандэлу. Прыколы Кена даканалі тагачаснага прэм'ера Тэтчэр, і яна пазбавіла сталіцу магдэбурскага права. Праўда, як толькі лейбарысты прыйшлі да ўлады, самакіраваньне аднавілі, Кен вярнуўся у фатэль мэра і ўзяўся за старое, у выніку чаго Лёндан і стаў гаспадаром ЭСФ. Натуральна, і памяшканьне пад форум ён выбіў салідное — ЭСФ адбываўся ў т.зв. Аляксандар-палацы — будынку, вядомым як першая рэзыдэнцыя ВВС (якраз адсюль бітлы трансьлявалі ў лайфе на ўвесь сьвет вядомы гіт «All You Need Is Love»).

У Беларусі ніводны бос традыцыйных левых форуму не падтрымаў. Гэта надало тусьні сапраўды нефармальны фармат і не адштурхнула моладзі. Форум у сінявокай замуцілі маладыя эсдэкі, анархі і фэміністкі.

Дарэчы, каапэрацыя анархаў і эсдэкаў на захадзе — рэч неймаверная. На першым форуме ў Порту-Алегры нейкую герлу так прыплюшчыла ад сьпякоты, што яна вырашыла ў касьцюме Эвы паплаваць у фантане. Ахова форуму яе арыштавала. Факт рэпрэсій настолькі ўразіў анархістаў, што з тых часоў яны пастанавілі праводзіць паралельна з афіцыйнымі форумамі свае альтэрнатыўныя. У Парыжы справа дайшла да мардабою. У Лёндане анархі, акрамя таго што бухалі на сквотах, вырашылі штурмаваць Аляксандар-палац. Ахоўваць антыглябалістаў прыехалі славутыя бобі. Але пагромшчыкі не зьявіліся. У Менску альтэрнатыўны форум абмежаваўся расьпіцьцём гарэлкі трыма панкамі на парозе будынку.

Да плюсаў БСФ можна аднесьці і адсутнасьць крэйзанутых. Каго я толькі ні сустракаў у Лёндане — ад камбатантаў руху супраць відэакамэр да фанатаў лёзунгу «Набывайце кубінскае!». Апошнія інструктавалі, як адрозьніць віно Бакара, якое вырабляецца на востраве Свабоды, ад палёнкі, якую вырабляюць эмігранты-контррэвалюцыянэры ў Маямі. БСФ у гэтым пляне выглядаў больш сьціпла. Касьцяк складалі сябры моладзевых левых арганізацый. Усяго набралося каля 120 асобаў — ад праваабаронцаў з «Амністы Інтэрнэшнл» да журналіста часопісу «Ідыёт».

Форум на Сьвіслачы атрымаўся больш практычны, чым на беразе Тэмзы. Амаль 300 сэмінараў, пленарных пасяджэньняў і ўоркшопаў, якія былі заяўлены на ЭСФ, вялікага практычнага сэнсу ня мелі. На пасяджэньнях, якія праходзяць у агромністых холах, набітых пад завязку інтэрнацыянальнай публікай, нават прамаўляць цяжка. Асабіста я хадзіў на сэмінары або патусавацца, або паглядзець на славутасьцяў накшталт дачкі Чэ Гевары, актрысы Ванэсы Рэдгрэйв, чачэнскага эмісара Закаева або лідэра Шын Фэйн Джэры Адамса. Праграма БСФ у гэтым пляне можа даць ЭСФ фору: усіх сакрэтаў не адкрыю, аднак ужо ў найбліжэйшы час стартуе сайт «Індымэдыя» — беларуская філія сусьветнага інфармпраекту антыглябалістаў.

Адзінае, чаго не хапала БСФ, — добрага энтэртэйнмэнту.

Эўрапейскія сацыяльныя форумы — гэта Камароўка ўсялякіх левых фенек: ад баек з профілем Чэ да дыскаў Чумбавамбы. Мой сябар з Масквы другі год наведвае ЭСФ, каб падняцца на продажы значкоў з выявай Лукіча і цыгарэт «Беламор». У адрозьненьне ад эўрапейскага, на айчынным форуме шапінгаваць было сумна. Адзіны, хто намагаўся зрабіць на левых гешэфт, быў т.Міхельсон, які прапанаваў усім набываць падборку контркультурнага самвыдату.

Па-другое, кожны форум — вялікі культурны фэст. Напрыклад, напярэдадні ЭСФ у якасьці яго рэклямы свой праект прэзэнтавалі «Pet Shop Boys»: пад кадры зь фільму «Браняносец Пацёмкін» Эйзенштэйна «хлопчыкі з заакрамы» сьпявалі сацыяльныя прыпеўкі. Хедлайнэрам культурнай праграмы БСФ стаў «гоблінаўскі» пераклад Настасьсі Слуцкай («Навінкі Home Video») і вядомы бард Лёха Чыканас, які марыць запісаць дыск беларускага шансону. У фінале яго выступу публіка завялася да таго, што штурмавала сцэну. А вось Жан з рэгі-бэнду «Сонца» так і не даехаў.

Высновы. Калі меркаваць па заходняй прэсе, лёнданскі тучас ня стаў этапным для эўралевых. Як піша «Guardian», «антыглябалісты зноў адчулі сілу, але як яе выкарыстаць, ня ведаюць». Наадварот, беларускі форум — пункт зэра новага левага руху ў РБ. Упершыню на яго тусоўках дамінуе нанканфармісцкі сярэдні слой, моладзь і інтэлігенцыя, патэнцыяльна здольная змагацца з правымі нэалібэраламі за культурную гегемонію. Вось будзе чым папантавацца на наступным ЭСФ, які, дарэчы, адбудзецца ў Атэнах.

*Лёндан—Стайкі—Менск*

ДАЕШ ТУРЫСТАЎ!

# Прыяжджайце да нас праз пяць гадоў



ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

Здавалася, ну чым яшчэ можа зьдзівіць публіку Лукашэнка? Але патрапіў пацешыць. Напрыканцы мінулага тыдня ён пешшу шпацыраваў па цэнтры Менску. Гэтай карцінкаю ілюстравалася рупнасьць Лукашэнкі пра зьберажэньне нацыянальнае спадчыны й разьвіцьцё турызму, чаму папярэднічала адмысловая нарада. Там ён заявіў: «Гэта ненармальнае становішча, калі дзяржава пэўныя сродкі ўкладае ў аднаўленьне гістарычных помнікаў, а ўсё гэта не прыносіць даходаў». Як Бог да мяне, так і я да Бога.

У любой сур'ёзнай гаспадарцы мусіць быць даход: зуброў можна страляць за даляры, лес — папаліць у печах, помнікі перарабіць на піўныя… У добрага гаспадара нічога лішнім ня будзе. Лукашэнка ж тамсама цалкам слушна заўважыў: «Мы павінны стварыць належныя ўмовы для знаходжаньня замежных і айчынных турыстаў у нашай краіне». Праўда, з таго не вынікае, ці будуць «належныя ўмовы для знаходжаньня» ў гэтай краіне яе грамадзянаў. Наўрад ці абсалютнай бальшыні беларусаў патрэбен шыкоўны паркінг на Нямізе, паверх якога будуць пабудаваныя муляжы тых дамоў што стаялі колісь на зямлі. Праўда, ня ў тым месцы і ня з тых матэрыялаў. Як і найноўшы гатэль «Эўропа» на тры дзясяткі месцаў. 99,9% ніколі не пабываюць у яго «эўрапейскіх» нумарах.

Калі б на тым самым месцы быў узноўлены будынак першага тэатру, то сацыяльная значнасьць была б несувымерна большаю. Прынамсі, Музычны тэатар пры кансэрваторыі быў бы лягічным, ня кажучы ўжо пра сьлёзы радасьці на вачах бацькоў, якія б слухалі сваіх дзетак на выпускных кансэрваторскіх іспытах ці проста на камэрных вечарынах пад партрэтамі Дуніна-Марцінкевіча ды Манюшкі. Але й сапраўды, «даходаў» тут не было б. Дый маштаб ня той, не прэзыдэнцкі.

**Каб пацешыцца з сэкс-індустрыі, ёсьць у сьвеце недасяжныя канкурэнты. На руінах гістарычных помнікаў узводзяцца танныя муляжы. А наведваць Дыснэйлэнд саветызму — паўтара мільёна дурных ня знойдзецца.**

Працяг на старонцы 7.

# Аскірка & Антусевіч

## Адзіная акруга ў краіне, дзе, паводле афіцыйных зьвестак, выбары не адбыліся, а на рэфэрэндуме А.Лукашэнка не набраў 50% галасоў, — у Горадні. Дасканалая сыстэма назіраньня, пагоні па начным горадзе і параза ўладаў: гутарка з экс-кандыдатамі

**Храналёгія падзей**

Горадня, Цэнтральная акруга №52

**Пятніца, 15 кастрычніка**.

Фаварыт уладаў, дэпутат палаты прадстаўнікоў Андрэй Лосеў зь невядомых прычын здымае сваю кандыдатуру. Выбарчую гонку працягваюць Людміла Сяўко (старшыня гаркаму Прафсаюзу работнікаў адукацыі і навукі) і Валянцін Аскірка (БСДГ).

**Нядзеля, 17 кастрычніка**.

**23.30**. Штаб Аскіркі—Антусевіча падсумоўвае зьвесткі па акрузе, атрыманыя ад назіральнікаў: Сяўко не набірае 50% + 1 галасоў, патрэбных для перамогі.

**23.40–3.00** Акруговая камісія аналізуе афіцыйныя дадзеныя. Урэшце, паведамляецца, што падвесьці канчатковыя вынікі нельга: не стае афіцыйных зьвестак галасаваньня па двух участках (у тым ліку па ўчастку, разьмешчаным у інтэрнаце Мэдыцынскага каледжу).

**3.10**. Каманда Аскіркі—Антусевіча падазрае, што ўлада вырашыла «нацягнуць» галасы для Сяўко. Аскірка, яго даверанная асоба і Антусевіч сьпяшаюцца да інтэрнату, каб перашкодзіць магчымым фальсыфікацыям.

**3.30**. Вокны пакою на першым паверсе інтэрнату сьвецяцца. За шыбамі — 8 жанчын, якія сядзяць вакол пустога стала. Пабачыўшы візытантаў, яны зачыняюцца ў каморцы вартаўніка.

**3.45**. Да інтэрнату пад'яжджаюць «Жыгулі». Частка сяброў камісіі зьяжджае ў невядомым напрамку. Аскірка ды Антусевіч гоняцца за імі на машыне. Як выявілася, камісію развозяць па хатах.

**4.30**. Аскірка накіроўваецца ў акруговую камісію, якая ўжо невядомым чынам атрымала зьвесткі, якіх раней не ставала.

**5.00**. Акруговая камісія дае выніковы пратакол, падпісаны сакратаром (ні старшыні камісіі, ні ягонага намесьніка ў будынку акруговай камісіі няма): выбары ў акрузе №52 не адбыліся. Аскірка набраў 33,28% галасоў, Сяўко — 46,92%.

## Сяргей Антусевіч: «Буду гуртаваць людзей»

**«НН»: Чаму вы вырашылі балятавацца?**

**СА:** Падрыхтоўку да вылучэньня мы пачалі яшчэ год таму. Мы правялі пасьпяховыя перамовы, і ўжо да моманту рэгістрацыі я ведаў, што дэмакратычныя кандыдаты пагаджаліся зьняць свае кандыдатуры на маю карысьць. Калі б выбары адбыліся па нармальным сцэнары, я б мог прэтэндаваць на ролю адзінага дэмакратычнага кандыдата ў гэтай акрузе. Але ж сталася так, што мяне «вырубілі».

**«НН»: На якой падставе?**

**СА:** Прydраліся, што я ня ўнёс у дэклярацыю зьвесткі аб долі ў кватэры бацькоў ды аб удзеле ў статутным фондзе ліквідаванай у 2000 г. фірмы, якую я заснаваў. На мясцовых выбарах гэтых зьвестак ніхто ад мяне не патрабаваў.

**«НН»: Што вы зрабілі пасьля таго, як вам адмовілі ў рэгістрацыі?**

**СА:** Уся каманда была сабраная, мы раіліся, ці варта ісьці далей. Вырашылі, што варта. У першую чаргу мы працавалі супраць трэцяга, пажыцьцёвага тэрміну Лукашэнкі. Размаўлялі зь людзьмі, разносілі ўлёткі, выраблялі некаторыя свае матэрыялы.

**«НН»: Праблем не ўзьнікала?**

**СА:** У прынцыпе, асаблівых складанасьцяў не было. Я маю статус дэпутата гарсавету, для мяне асабіста гэта не было цяжкасьцю, але ж для таго, каб гаварыць зь людзьмі, не абавязкова трэба мець нейкі статус. Мы таксама назіралі за галасаваньнем, каардынавалі сваю працу з кандыдатам Аскіркам. Такім чынам, мы «закрылі» ўсю акругу назіральнікамі. На кожным з 40 адкрытых участкаў працэс галасаваньня адсочваў хаця б адзін назіральнік ці даверанная асоба Аскіркі. На шасьці ўчастках назіральнікі знаходзіліся ад першай хвіліны датэрміновага галасаваньня да вечара 17 кастрычніка.

**«НН»: Ці лічыце вы выбары, якія не адбыліся, сваім адносным посьпехам?**

**СА:** Назваць іх посьпехам — гэта было б нацяжкай. Але элегантнай перамогі ў іх не ўдалося. Паўплывала зьняцьце кандыдата Лосева. Часьцяком нам проста не завяралі копій пратаколаў, але мы дамагаліся свайго. Я сам выяжджаў на адзін з такіх участкаў, дзе на працягу больш як гадзіны мы стаялі і чакалі, калі камісія азнаёміць нас з вынікамі галасаваньня.

**«НН»: Ці будзе сэнс у тым, каб накіраваць усе сілы на назіраньне за паўторнымі выбарамі, што мусяць адбыцца праз два месяцы?**

**СА:** На жаль, цяперашнія выбары паказалі, што камісіі не баяцца назіральнікаў. Яны навучыліся падрабляць вынікі абсалютна нахабна. Ігнараваньне назіральнікаў зрабілася нормай. Я ня ведаю, як можна камісію прымусіць лічыць галасы сумленна, калі ў ёй няма сумленных людзей. Відаць, толькі абсалютнай перавагай кандыдата, які будзе балятавацца.

**«НН»: Што вы самі будзеце рабіць цяпер?**

**СА:** Мой адказ, магчыма, ня ўсіх задаволіць, але: я ўжо інфармую людзей пра той вынік, які ёсьць. Трэба даваць інфармацыю, што ня так усё кепска ў самім грамадзтве. Пратэст нарастае. Наша задача — гуртаваць людзей. Змагацца было варта, я цудоўна гэта разумею цяпер. Пры любым выніку я ведаю, хто, дзе і як фальсыфікаваў.

**«НН»: Вось толькі ці прыдадуцца гэтыя веды?**

**СА:** Веды — гэта сіла.



Сяргей Антусевіч нарадзіўся ў 1973 г. у Берасьці ў сям'і рабочых. Школьнікам пераехаў зь сям'ёй у Горадню. У 1996 г. скончыў Беларускі тэхналягічны ўнівэрсытэт у Менску, вярнуўся ў Горадню. Працуе на «Азоце». З 2000 г. — старшыня незалежнага прафсаюзу гэтага гіганту нафтахіміі. Дэпутат Гарадзенскага гарсавету.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Валянцін Аскірка нарадзіўся ў 1975 г. у Горадні. Скончыў фізтэх Гарадзенскага ўнівэрсытэту, асьпірантуру. Працуе выкладчыкам катэдры агульнай фізікі ва ўнівэрсытэце, жанаты, мае сына і дачку. Некалі меў шмат розных хобі, але галоўнае зь іх — палітыка — падмяла пад сябе ўсе астатнія.

## Валянцін Аскірка: «Мяне пакідалі як слабога»

**«НН»: Вы — перакананы сацыял-дэмакрат. Чаму?**

**ВА:** Праз пару дзён пасьля рэфэрэндуму 1995 г. я вырашыў, што не магу быць проста грамадзянінам, а павінен быць актыўным грамадзянінам, і ўступіў у БСДГ. Потым была трансфармацыя ў БСДП-НГ, пасьля зноў вяртаньне ў БСДГ. Чаму сацыял-дэмакратыя? Ідэі сацыяльнай справядлівасьці — гэта для мяне істотна.

**«НН»: Для чаго вы вырашылі ўдзельнічаць у выбарах?**

**ВА:** Ня ўдзельнічаць у выбарах я ня мог. Праўда, у выніку толькі я адзін стаўся зарэгістраваным разам з двума «супернікамі ад улады».

**«НН»: Вы не здагадваецеся, чаму зарэгістравалі менавіта вас? Сяргею Антусевічу (БНФ) ды Анатолю Іванчыку (ПКБ) у рэгістрацыі адмовілі.**

**ВА:** Гэта першае пытаньне, якое я задаў сам сабе і сваім калегам з ініцыятыўнай групы. Мяркую, адзін з фактараў — пакінулі слабейшага, другі з фактараў — пакінулі залежнага, бо я працую ў дзяржаўнай установе. Хаця якія там насамрэч былі пляны — невядома.

**«НН»: Што ўяўляла зь сябе вашая каманда?**

**ВА:** Першапачаткова ініцыятыўная група складалася з 43 чалавек, большасьць зь іх — студэнты, выкладчыкі гарадзенскіх ВНУ. Я праводзіў трэнінгі для іх па эфэктыўнай камунікацыі, назіраньні, а таксама ладзіў мінісэмінар «Ад дзьвярэй да дзьвярэй». Аднак асноўны досьвед быў атрыманы ў працэсе самой працы.

**«НН»: Вынік па вашай акрузе зрабіўся выключэньнем у маштабах краіны. Тое, што выбары не адбыліся, — гэта ваша перамога?**

**ВА:** З аднаго боку, мяне нібы «пакідалі» як самага слабага кандыдата, а ў выніку аказалася, што ўсе ўчасткі былі «закрытыя» маімі даверанымі асобамі і назіральнікамі «Пяцёркі+». Гэта дазволіла нам мець ужо да дванаццаці гадзін ночы зьвесткі з 95% участкаў. У дзень выбараў у акруговай камісіі ад сёмай вечара знаходзілася мая даверанная асоба, якая своечасова атрымала гэтыя дадзеныя. А з другога боку, былі моманты, ніяк не зьвязаныя са мною і маёй камандай. Падчас гонкі зьмяніліся ўладныя фаварыты — замест Лосева асноўнай прэтэндэнткай зрабілася спн.Сіўко. Магчыма, гэта было зьвязана з устаноўкай на павышэньне колькасьці жанчын у парлямэнце. Не магу сказаць, што гэта мая перамога ці нават наша, але гэта найлепшы вынік, які ўдалося атрымаць у Беларусі. Яго не было б, калі б мы не працавалі.

**«НН»: Што вы будзеце рабіць далей, і што трэба рабіць усім нам?**

**ВА:** Буду і надалей спрабаваць жыць прыстойна і годна, з пачуцьцём уласнага гонару, не зважаючы на тыя зьмены, якія адбываюцца навокал. Наконт таго, што трэба рабіць усім нам далей, — з большым розумам хіба… Ня ведаю нават, як сказаць.

**«НН»: Ці выключаеце вы палітычную барацьбу праз выбары?**

**ВА:** Сапраўдных выбараў у найбліжэйшай беларускай гісторыі не прадбачыцца. Але я не магу сказаць, што заўтра буду з дубальтоўкай ці нейкім іншым чынам, акрамя выбарчага працэсу, дасягаць сваіх мэтаў. Мы павінны быць падрыхтаваны да працы ў дэмакратычных умовах, умець удзельнічаць у выбарах і іх выйграваць, нават калі гэтае ўменьне не прыдасца ў найбліжэйшыя пару гадоў. Спадзяюся, даўжэй чакаць не спатрэбіцца.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

# Аднагодак з-за Буга

Раман Якаўлеўскі

**У наступным годзе ў яго скончыцца другі прэзыдэнцкі тэрмін, і паводле Канстытуцыі ён павінен будзе сысьці. А пакуль 15 лістапада ў рэзыдэнцыі кіраўніка дзяржавы ён адзначыць сваё 50-годзьдзе. Можна з упэўненасьцю казаць, што гэты юбілей стане прыкметнай зьявай ня толькі ў Польшчы.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Пасьля прыходу да ўлады легендарнай «Салідарнасьці», лідэр якой Лех Валэнса быў абраны прэзыдэнтам краіны, у 1995 г. у Польшчы адбыліся другія па ліку прэзыдэнцкія выбары. Напярэдадні выраашальнага другога туру крытыка на адрас Валэнсы амаль спынілася, затое друк і тэлебачаньне прыгадалі пра ўсе асаблівасьці палітычнай кар'еры лідэра левых. Здавалася, Аляксандар Квасьнеўскі прайграе. Так здавалася нават тады, калі пачалі паведамляць папярэднія вынікі галасаваньня. Зьвесткі апытаньняў выбарцаў дэманстравалі перамогу Валэнсы. І толькі зьвесткі Цэнтральнай выбарчай камісіі зарэгістравалі перамогу Квасьнеўскага. Як выявілася, многія не жадалі прызнавацца, што аддалі свой голас будучаму прэзыдэнту зь левых, але ў кабінках для галасаваньня выбарцы вырашылі інакш. Ім спадабаўся малады палітык, які валодае замежнымі мовамі і лёгка знаходзіць супольную мову з прэзыдэнтамі Расеі і ЗША. І яны ў Квасьнеўскім не падмануліся. Цягам амаль дзесяці гадоў палякам не было сорамна за сваіго прэзыдэнта на міжнароднай арэне.

Ён займаецца ў асноўным замежнымі сувязямі. І гэта якраз тое, на чым Польшчы шмат удалося выйграць у апошнія гады. Квасьнеўскі здолеў усталяваць кантакт з Пуціным. Абодва яны вялікія практыкі, абодва разумеюць слэнгавую мову, што спрыяла паразуменьню. Канечне, гэта ня зьменіць расейска-польскіх дачыненьняў. Але над імі, прынамсі, ужо не вісіць адсутнасьць усялякіх кантактаў на найвышэйшым узроўні.

Квасьнеўскі — вялікі рэаліст. Мне запомніўся адказ польскага прэзыдэнта на пытаньне, зададзенае яму летась у Крыніцы: дзе ён бачыць Расею? Ён адказаў, што Расею бачыць там, дзе яна ёсьць, а самае галоўнае, ён яе бачыць так, як Расея бачыць сябе сама. І калі Расея гатовая да інтэграцыі, да супрацоўніцтва з Эўразьвязам, то Польшча ад гэтага толькі выйграе. Можна сьмела сказаць, што амаль такім самым чынам Квасьнеўскі адказаў бы, калі б у яго спыталі пра суседку Беларусь. Толькі вось у адрозьненьне ад сябра Уладзімера з пагодкам і цёзкам з-за Бугу ў яго за дзесяць гадоў асабістыя стасункі так і ня склаліся. З розных прычын.

Для характарыстыкі прэзыдэнта Квасьнеўскага будзе дарэчы пераказаць успаміны журналістаў, якія ляцелі разам зь ім у адным самалёце. Хоць яны не былі палякамі, Квасьнеўскі даў ім пакарыстацца сваім «бортам». Ляцелі з Варшавы ў Кракаў. Мэталадэтэктар перад узьлётам замежныя журналісты праходзілі разам з прэзыдэнцкім атачэньнем. На тых жа агульных падставах селі ў мікрааўтобусы пасьля пасадкі на вайсковым аэрадроме. Ахова паводзіла сябе амаль непрыкметна. Начальнік службы пратаколу падаў голас толькі раз: «Панове, а вас хто-небудзь сустракае?» — спытаў ён на добрай ангельскай. Пакуль высьвятлялася гэтае пытаньне, журналістаў разьмясцілі ў гасьцявым дамку, ізноў жа — побач з прэзыдэнтам, у якога можна было пры жаданьні ўзяць незапланаванае інтэрвію. Потым усе зноў расьселіся па аўтобусах — і ў дарогу без аніякіх мігалак, спэцкартэжаў, зонаў ачапленьня, хрыпатых паліцэйскіх сырэн і іншых актыўных мерапрыемстваў запалохваньня ў фармаце фэйс-кантролю. То бок, абышлося без бізантыйства.

> Польшча Квасьнеўскага адкінула бізантыйскую канцэпцыю ўлады як прывілеяванай закрытай супэрструктуры, непадсправаздачнай грамадзтву. Польскія кіраўнікі паводзяць сябе па-эўрапейску — як звычайныя грамадзяне.

«У часы Варшаўскай дамовы ўсё было б іначай, у дакладнай адпаведнасьці з савецкімі намэнклатурнымі правіламі — ну, вы ж разумееце», — сказаў адзін з прысутных. КПСС стварала братнія партыі паводле свайго вобразу і падабенства, але потым Польшча перастала быць Польскай Народнай Рэспублікай. Выбраўшы шлях у Эўропу, краіна адкінула і бізантыйскую канцэпцыю ўлады як прывілеяванай закрытай супэрструктуры, непадсправаздачнай грамадзтву. Польскае чынавенства ўсіх узроўняў прайшло праз сіта закону аб люстрацыі. Сёньня польскія палітыкі і чыноўнікі не надаюць асаблівага значэньня ўладнай атрыбутыцы. Галоўнае — рэпутацыя. Яны паводзяць сябе па-эўрапейску — як звычайныя грамадзяне.

Расея на словах таксама ня супраць стаць чальцом цывілізаванага грамадзтва. І тым ня менш, адзначаюць многія назіральнікі, настойліва працягвае ісьці сваім «асаблівым шляхам», песьцячы, пялегуючы і кшталтуючы ўласнае бізантыйства, праводзячы працоўныя пасяджэньні ў пазалочаных залах, лецячы з уключанай мігалкай па сустрэчнай паласе… А астатнія грамадзяне — альбо стаяць і баяцца, альбо бяруць прыклад. Нешта падобнае назіраецца і ў Беларусі, кіраўнік якой стаў усё часьцей казаць «наша Расея».

Квасьнеўскі завяршае сваю прэзыдэнцкую кар'еру. Узрост і стан здароўя дазваляюць казаць пра яго далейшую палітычную будучыню. Раней шмат гаварылася пра кіраўнічыя пасады ў міжнародных арганізацыях, у ААН, у NATO, у Міжнародным алімпійскім камітэце і г.д. Цяпер пра гэта гавораць меней, а больш пра тое, што ён прыйдзе ратаваць левыя сілы і ўзначаліць іх. Як вядома, папулярнасьць польскай левіцы ўпала. А ў наступным годзе — яшчэ і парлямэнцкія выбары ў Польшчы. Квасьнеўскі дзесьці ўжо прагаварыўся пра тое, што ён прыйдзе, калі левым сілам будзе пагражаць поўны развал, — тады ён уключыць свой аўтарытэт дзеля стабілізацыі палітычнай сцэны. Многія актывісты саюзу левых дэмакратычных сіл, асабліва тыя, якія ня любяць экспрэм'ера Мілера, з энтузіязмам прынялі б такое выйсьце. Але ці будзе гэта — невядома. Прынамсі, Квасьнеўскі наўрад ці выступіць проста ў ролі мужа прэзыдэнткі Іяланты Квасьнеўскай.

Аляксандар Квасьнеўскі нарадзіўся 15 лістапада 1954 г. у Бялаградзе (Заходне-Паморскае ваяводзтва, мяжа зь Нямеччынай). Вучыўся ў Гданьскім унівэрсытэце. У 1977—1990 г. сябар Польскай аб'яднанай рабочай партыі, удзельнік студэнцкага руху. Рэдагаваў моладзевыя газэты, заснаваў першы ў Польшчы кампутарны часопіс. У 1985—1987 — міністар па справах моладзі і спорту, пазьней — старшыня Польскага алімпійскага камітэту. Заснаваў Саюз дэмакратычных левых сілаў, які перамог на парлямэнцкіх выбарах 1993 г. Жанаты, жончына фірма займаецца апэрацыямі зь нерухомасьцю. Мае дачку Аляксандру.

# Правы рэванш

У другой палове XX ст. Захад разьвіваўся пад моцным уплывам лібэральных ідэй. Пачынаючы з 60-х, рух за далейшую сэкулярызацыю грамадзтва, эмансыпацыю жанчын, правы расавых і сэксуальных меншасьцяў фармуляваў ледзь не афіцыйную сацыяльную дактрыну Захаду.

Нельга сказаць, што левы лібэралізм быў усёмагутны і ўсёабдымны. У пытаньнях замежнай палітыкі кансэрватары мелі што прапанаваць заходнім грамадзтвам дзякуючы свайму прынцыповаму антыкамунізму і гатоўнасьці да рашучых дзеяньняў дзеля абароны дэмакратыі. Менавіта прыход да ўлады выбітных кансэрватыўных палітыкаў — Рэйгана, Тэтчэр, Коля — скончыўся перамогай дэмакратыі ва Ўсходняй Эўропе. З другога боку, эканамічная праграма кансэрватараў, хоць і не заўсёды падтрыманая большасьцю заходняга электарату, у 80-х гадох фактычна выратавала капіталізм ад заняпаду дзякуючы памяншэньню ролі дзяржавы, паніжэньню падаткаў і спрыяньню прыватнай ініцыятыве.

І ўсё ж пазыцыі кансэрватызму ў сацыяльна-культурных пытаньнях здаваліся безнадзейна адсталымі. Пасьля перамог Захаду ў халоднай вайне менавіта сацыяльныя пытаньні зноў выйшлі ў цэнтар увагі заходніх грамадзтваў. У культурных баталіях пра царкву, ролю жанчыны, талерантнасьць і сэксуальную разьняволенасьць кансэрватарам не было чаго проціпаставіць супэрсучасным лібэралам. У 90-х гадох культурныя ўстаноўкі лібэральных рухаў накшталт фэмінізму фактычна сталіся дзяржаўнымі ідэалёгіямі шмат якіх заходніх краін. Гэтаму таксама спрыялі дэмаграфічныя зрухі ўнутры заходніх грамадзтваў — урбанізацыя, павелічэньне колькасьці адзінокіх і працуючых жанчын, падзеньне аўтарытэту рэлігіі. Панаваньне лібэралізму спарадзіла заснаваныя на маскультуры сучасныя выбарчыя тэхналёгіі і прывяло да ўлады хвалю палітыкаў, сьветапогляд якіх быў сфармаваны пад моцным уплывам сэксуальнае рэвалюцыі і сацыяльных трансфармацыяй канца 60-х гадоў мінулага стагодзьдзя. Першым зь іх быў Клінтан у Амэрыцы ў 1992-м, за ім — лейбарысты на чале з Тоні Блэрам у Брытаніі ў 1997 г. і чырвона-зялёная левацэнтрысцкая кааліцыя на чале з Шродэрам і Фішэрам у Нямеччыне ў 1998 г. Культурная перамога левага лібэралізму, здавалася, не падлягала сумневу.

Пры гэтым лібэральны рух паступова аддаляўся ад абвешчаных раней прыярытэтаў у галіне правоў чалавека. Насамрэч, на Захадзе амаль не засталося заканадаўчае няроўнасьці паміж прадстаўнікамі розных полаў, расаў або сэксуальных арыентацый. Таму галоўнай мэтай лібэралаў стаўся клопат пра выпраўленьне несправядлівасьцяў мінулага — а менавіта дапамога прыгнечаным у мінулым меншасьцям у пераламленьні супраціву кансэрватыўных слаёў грамадзтва і набыцьці новага, больш высокага сацыяльнага статусу. Фактычна розныя сацыяльныя групоўкі пачалі выкарыстоўваць лібэралізм у мэтах змаганьня за рэсурсы і ўладу. Адным з інструмэнтаў гэткае барацьбы сталася, напрыклад, увядзеньне палавых і этнічных квотаў на кіраўнічыя пасады ў палітычных партыях і дзяржаўных структурах.

Напрыканцы XX ст. на першы плян выйшла задача перавыхаваць насельніцтва заходніх краін дзеля лепшае рэалізацыі ідэалаў сацыяльнае, палавое, расавае і сэксуальнае роўнасьці. Каб абмежаваць магчымасьці сваіх ідэалягічных апанэнтаў, асноўны акцэнт зрабілі на дзяржаўную палітыку. Пры гэтым ідэалягічная чысьцяком ставіцца лібэраламі вышэй за дэмакратычныя прынцыпы свабоды пераканаңьняў і слова.

**Працяг на старонцы 10.**

## Гіпэрсіяністы за Лукашэнку

Радыкальная групоўка габрэйскіх пасяленцаў «Бэад арцэйну» («За радзіму»), што выступае за жорсткасьць у дачыненьні да палестынцаў і за Ізраіль «ад Нілу да Эўфрату», прыняла заяву ў падтрымку беларускага рэжыму. Лідэрам «гіпэрсіяніскага руху», які налічвае колькі соцень прыхільнікаў, зьяўляецца жыхар Хеўрону Аўром Шмулевіч, сталы аўтар расейскай газэты «Завтра». У адозьве сьцьвярджаецца, што «ніколі габрэйскае жыцьцё ў Беларусі не дасягала такога росквіту, як цяпер», выказваецца спадзеў на супрацоўніцтва паміж Ізраілем і Беларусьсю.

**ВР**

# Разьня беларусаў — нацыянальнае сьвята

Міжрэлігійная рада Расеі прапанавала сьвяткаваць 4 лістапада як Дзень адзінства Расеі. Якраз у гэты дзень у 1612 г. войскі Кузьмы Мініна і Дзьмітрыя Пажарскага вызвалілі Маскву ад войскаў Речы Паспалітай, паклаўшы канец т.зв. Смутнаму часу. Ініцыятыва рады, якую актыўна лабіруе праваслаўная царква, ужо атрымала падтрымку шэрагу дэпутатаў Дзярждумы і губэрнатараў. Гэтай восеньню адбылася нават рэпэтыцыя фэсту, якім расейскія правыя хочуць замяніць у календары непаліткарэктны для іх дзень 7 лістапада. Дэлегацыя зь Ніжняга Ноўгараду — места, дзе Мінін і Пажарскі пачалі зьбіраць валанцёраў, — наведала сталіцу і была ўрачыста прынятая ў адміністрацыі раёну Ізмайлава.

Аднак летапісы даводзяць, што 4 лістапада было, хутчэй, днём нацыянальных пагромаў, чым нацыянальнага адзінства. Капітуляцыя польска-беларускага гарнізону выклікала рэпрэсіі па нацыянальнай і рэлігійнай прыметах супраць «злобных еретиков, кальвинистов, лютеран, армян, римских папистов и еврейских богоубийц». Больш за ўсё 4 лістапада 1612 г. перапала продкам тых, каго сёньня ў Маскве лічаць амаль галоўнымі стратэгічнымі саюзьнікамі, — беларусаў. Яны складалі большую частку арміі Рэчы Паспалітай, шмат іх падчас вайны перасяліліся ў Маскву. Хронікі паведамляюць: «По взятии же царствующего града Москвы многих литовских людей посекоша, а болших панов по темницам засадиша».

Якой можа быць афіцыйная рэакцыя Менску на кананізацыю пагрому прадзедаў сёньняшніх грамадзянаў РБ? Хутчэй за ўсё аніякай. Гэта тая частка гісторыі, якую цяперашняя ўлада імкнецца выкрасьліць з нацыянальнай памяці.

Затое можна не сумнявацца, што маштабнае праслаўленьне разьні 4 лістапада ў Расеі — выхад перад сьвятам фільмаў, правядзеньне адпаведнага лікбезу, арганізацыя ўрачыстых пасяджэньняў праз мэдыі — з часам набудзе рэзананс у сьвядомасьці беларусаў і выкліча нову цікавасьць да часоў ВКЛ. Дык са сьвятам нацыянальнага адзінства вас, дарагія расейцы!

**Лёлік Ушкін**

# Спартоўцы і сьмерць

**8 лістапада на Іванаўскіх могілках у Рызе прайшло пахаваньне форварда зборнай Латвіі Сяргея Жаўтка. Хакеіст памёр пасьля матчу Адкрытага чэмпіянату Беларусі паміж менскім «Дынама» і «Рыгай-2000», куды спартовец перабраўся на час лакаўту ў НХЛ.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Паводле вэрдыкту дактароў, сьмерць настала ў выніку сардэчнай недастатковасьці. І падчас кар'еры ў НХЛ у Жаўтка былі праблемы з сэрцам, таксама ён скардзіўся на стомленасьць і галавакружэньне, аднак дактары канстатавалі, што ўсё нармальна.

Мажліва, прычына, што прывяла да сьмерці, — вялікія перагрузкі. Над большасьцю хакеістаў паўночнаамэрыканскае лігі, перадусім маладых легіянэраў, вісіць дамоклаў меч высылкі ў фарм-клюб, адкуль вярнуцца вельмі складана. Выйсьце, сярод іншага, у тым, каб пастаянна павялічваць штодзённыя нагрузкі, тым самым даказваючы, што ты на гэтым месцы найлепшы.

Чэмпіянат НХЛ складаецца з 82 гульняў, амаль палова камандаў працягвае сэзон у розыгрышы Кубку Стэнлі, частка гульцоў выступае за зборныя сваіх краін, дададмо выстаўныя перадсэзонныя матчы — і атрымліваецца, што хакеіст з НХЛ праводзіць больш за 100 гульняў у год. Такое і са здаровым сэрцам цяжка вытрымаць.

Сяргей Жаўток — ня першая ахвяра спорту. У лютым у Швэцыі проста на пляцоўцы памёр баскетбаліст «Акрополю Баскета» латыш Раймандас Юмікіс. У кастрычніку падчас матчу чэмпіянату Літвы на баскетбольнай пляцоўцы памёр абаронца «Атлетасу» Таўрас Стумбрыс.

Адкрыўся «чорны сьпіс» у чэрвені 2003 г., калі на ліёнскім «Жэрляне» падчас футбольнага матчу Калюмбія—Камэрун памёр афрыканскі форвард Марк-Віўен Фаэ. Прычына — прыроджаны ган сэрца. Да таго ж, падчас аднаго з мэдаглядаў было выяўлена, што сэрца камэрунскага футбаліста павялічаных памераў. Пра гэта даведаліся падчас мэдагляду пры пераходзе футбаліста ў лёнданскі «Вэст Хем». Але кардыёлягі супакоілі: для прадстаўнікоў Афрыкі гэта норма.

Зрэшты, для жыхароў «чорнага кантынэнту» спорт — адзіны шанец выбіцца зь нішчымніцы ў людзі, таму часам яны заплюшчваюць вочы на свае фізычныя хібы.

А пры канцы студзеня 2004 г. сьведкамі сьмерці на футбольным полі сталі мільёны гледачоў. Падчас футбольнага матчу партугальскага чэмпіянату паміж «Бэнфікай» і «Віторыяй» (Гімарайнш) атрымаў жоўтую картку форвард лісабонцаў і зборнай Вугоршчыны Міклаш Фэхер. Ён усьміхнуўся арбітру, зрабіў два крокі — і страціў прытомнасьць. Частка гульцоў дапамагала мэдыкам, частка ўкленчыла і малілася. Больш за гадзіну дактары змагаліся за жыцьцё Фэхера, але ўсё дарэмна. Выказвалася здагадка, што прычынай сьмерці вугорскага футбаліста стала ўжываньне допінгу.

> Сьмерць на спартовай пляцоўцы стала звыклай рэччу.

На пачатку XX ст. шмат атлетаў паміралі ад злоўжываньня какаінам. Лічылася, што наркотык пазытыўна ўплывае на фізычны стан.

Цяпер жа новая бяда — шмат спартоўцаў паміраюць ад праблемаў з сэрцам. Праблема, якая патрабуе дадатковага вывучэньня.

17 месяцаў таму сьмерць М.-В. Фаэ шакавала ўсю спартовую грамадзкасьць. Навіна некалькі тыдняў не сыходзіла са старонак друкаваных і электронных СМІ. І чытачоў, і журналістаў цікавіла ўсё: прычыны, вынікі, разьвіцьцё падзей. Цяпер сьмерць на спартовай пляцоўцы стала звыклай рэччу. Навіна жыве дзень. Пра Жаўтка цяпер згадваюць хіба латвійскія СМІ.

**Алег Раявец**



WWW.TSN.CA

**Паводле вэрдыкту дактароў, Сяргей Жаўток памёр у выніку сардэчнай недастатковасьці.**

# Прыяжджайце да нас праз пяць гадоў

Працяг са старонкі 4.

БелТА падказвае, *які* ён мусіць быць: «Як лічыць прэзыдэнт, гэта частка гораду набудзе эўрапейскі выгляд ня толькі зьнешне, але й па сутнасьці. Побач з гатэлем адкрыюцца сучасныя магазыны, цэнавая палітыка якіх будзе адпавядаць эўрапейскаму ўзроўню. Гэты куток Менску задумваецца як «кавалак» Заходняй Эўропы». На чалавечай мове гэта азначае, што цэны на паслугі ў Верхнім Горадзе будуць недаступныя для большыні беларусаў. А пра музэі, галерэі, тэатры не вялося наагул. Ну добра, Лукашэнка цяпер «невыязны», але ж сёй-той зь ягоных памагатых бывае і ў Эўропе. Няўжо ўсур'ёз яны думаюць, што немцам ці бэльгійцам няма дзе піва папіць і паспаць?

Прынятая праграма разьвіцьця турызму да 2005 г. не дае вынікаў. Удзельная вага турыстычных паслуг у агульным аб'ёме экспарту паслуг у Беларусі не перавышае 1%. Доля турыстычных паслуг у ВУП складае 0,06%. І прасьвету не відаць. Símат калі адшураваць і пафарбаваць усю Беларусь аж да Шклова, трэба мець буйнае ўяўленьне, каб уявіць сабе, што сюды раптам прываліць 1,5 мільёна турыстаў з грашыма. Símат пры самых лепшых гасьцініцах. Бо перадусім паўстае пытаньне: навошта? Каб паглядзець «крэпасьць-герой», Хатынь і Курган Славы? Ці пакоіцца куды ў Гальшаны, Крэва, Смаляны, каб пераканацца ў тым, што тут нарабілі людзі са сваімі ўнікальнымі здабыткамі? Ці пойдуць паглядзець убогія нашыя нішчымныя музэйчыкі й галерэйкі? Тут нават беларускага можна нічога не заўважыць — ні мовы, ні музыкі, ні танцаў, ні кухні, ні строяў. Каб пацешыцца ж сэкс-індустрыяй, ёсьць у сьвеце недасяжныя канкурэнты. А наведваць Дыснэйлэнд саветызму — гэта насамрэч на рэдкі вычварны густ. Дый ці хацеў бы хто пражыць у такім «тэматычным парку» ўсё жыцьцё?

Адзінае, з чым не выпадае спрачацца, дык гэта з тым, што, паводле Лукашэнкі, кожны мэтар зямлі ў Менску павінен выкарыстоўвацца з улікам дзяржаўных інтарэсаў і прыносіць грошы краіне, у выніку чаго ў бліжэйшыя пяць гадоў сталіца павінна карэнным чынам зьмяніцца. Маўляў, тое, што робіцца цяпер, — гэта толькі пачатак…

І яму верыш. Верыш, калі глядзіш, як трушчыцца экскаватарнымі каўшамі старажытная муроўка на Нямізе. Верыш, калі бачыш наўкол зьзяньне плястыкавых шклопакетаў. Верыш, калі чуеш, як пілуюць самыя старыя дрэвы. Прыяжджайце да нас праз пяць гадоў і… вы не пазнаеце старога Менску. Ніхто тут нічога не пазнае.

**СХ**

## «Залаты матч» «трактарыстаў»

Апошні тур нацыянальнага футбольнага першынства ў вышэйшай лізе ня выявіў другога няўдачніка чэмпіянату. І менскі МТЗ-РІПА, і віцебскі «Лякаматыў» набралі аднолькавую колькасьць балаў — 27. І цяпер, паводле рэгляманту, другую пуцёўку на вылет разыграюць у дадатковым матчы, які пройдзе 11 лістапада ў Баранавічах. Пачатак а 13-й.

У гэты ж дзень пройдзе шэсьць матчаў 1/8 фіналу Кубку Беларусі па футболе.

## Ягр стаў аднаклюбнікам Калюжнага

Адзін з самых знакамітых чэскіх хакеістаў Ярамір Ягр на час лакаўту ў НХЛ заключыў кантракт з омскім «Авангардам», за які выступае беларус Аляксей Калюжны. Два месяцы Ярамір правёў у родным «Кладне», але, калі стала ясна, што сэзон у Паўночнай Амэрыцы наўрад ці адновіцца, вырашыў перабрацца ў Расею, дзе ў хакеі круцяцца большыя грошы.

Цікава, што раней Ягр вельмі нэгатыўна ставіўся да Расеі, нават нумар 68, пад якім ён выступаў у «Пітсбургу», «Вашынгтоне» і «Нью-Ёрк Рэйнджэрз», меў нагадваць сусьветнай супольнасьці пра савецкую акупацыю Чэхаславаччыны.

## Беларусы ўратавалі Перм

Дзякуючы двум трапным стрэлам гульцоў нацыянальнай зборнай Андрэя Лаўрыка і Віталя Булыгі пермскі «Амкар» застаецца ў расейскай футбольнай прэм'ерлізе. У матчы 29-га туру, што прайшоў у панядзелак, пермякі выйгралі ў гасьцях у «Аланіі» (Уладзікаўказ) зь лікам 2:1.

## Стрыпейкіс — найлепшы

Найлепшым снайпэрам беларускага футбольнага першынства-2004 стаў форвард наваполацкага «Нафтану» Валер Стрыпейкіс. Ён правёў 18 галоў у вароты сапернікаў. У 2002 г. Стрыпейкіс станавіўся найлепшым снайпэрам чэмпіянату ў складзе бабруйскай «Белшыны», і таксама з 18 галамі.

13 лістапада футбалісту споўніцца 30 гадоў.

## Курнева сплавілі

Пасьля апошняга туру берасьцейскае «Дынама» вырашыла прыпыніць дачыненьні з галоўным трэнэрам Уладзімерам Курневым. Матывацыя цьмяная: «Беручы пад увагу рашэньне дысцыплінарнага камітэту Фэдэрацыі футболу, які дыскваліфікаваў на два матчы У.Курнева, а таксама ў сувязі зь нездавальняючай гульнёй каманды ў апошнім туры» (Берасьце саступіла «Дарыдзе» зь лікам 0:3).

Між тым Курнеў быў запрошаны ў «Дынама» ў пачатку чэрвеня, калі клюб з 7 баламі займаў 14-е месца. Фінішавалі ж берасьцейцы восьмымі з 39 баламі.

## Узьлёт Мірнага

Дзякуючы пасьпяховаму выступу на турніры сэрыі «Мастэрз» у Парыжы, Макс дайшоў да паўфіналу ў адзіночным і парных разрадах — тэнісіст зрабіў значны рывок у сусьветным рэйтынгу. У чэмпіёнскай гонцы 2004 г. ён падняўся на 22 прыступкі і займае 44 радок, па выніках апошніх 52 тыдняў у беларуса 46 месца (было 71-е).

**АР**

# Арлен Кашкурэвіч: «Мне незразумелыя мае суайчыньнікі сёньня. Я ня зь імі»

## «Мастак суровы, паўночны». Народнаму мастаку Беларусі Арлену Кашкурэвічу

**Творчая біяграфія Арлена Кашкурэвіча ахоплівае цэлую эпоху. Менавіта ў аздобе гэтага мастака мы ведаем сотні кніг беларускіх і эўрапейскіх пісьменьнікаў. Яскравую характарыстыку стылю гэтага мастака даў ягоны сябар Уладзімер Караткевіч: «Даўно, яшчэ з самага пачатку, калі ён зрабіў ілюстрацыі да Халдоўра Лакснеса, — я зразумеў, што перад намі мастак суровы, паўночны. І, адначасова, беларускі, мяккі — калі можна гаварыць пра мяккасьць нашага народу, — добры, наш». Арлен Кашкурэвіч, жывая легенда беларускае графікі, рыхтуе вялікую ўласную выставу, што мае адбыцца ў Нацыянальным мастацкім музэі Беларусі. З мастаком гутарыў мастацтвазнавец Сяргей Харэўскі.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«НН»: Спадар Арлен, што будзе на вашай пэрсанальнай выставе ў траўні?**

**АК:** Там будзе некалькі блёкаў. Першы — гэта бесьсюжэтныя такія кампазыцыі, у якіх будзе прысутнічаць нейкі чалавек з музычным інструмэнтам. Кантрабас, віялянчэль, скрыпка — вельмі прыгожыя музычныя інструмэнты, у іх ёсьць нешта рамантычнае. І вось гэты ўмоўны чалавек уваходзіць у стасункі з гэтымі інструмэнтамі. Нешта гарманічнае, а разам з тым і дэструкцыйнае. Гэта будуць гісторыі спробаў аб’яднацца. І ўсе гэтыя спробы ў выніку застануцца безвыніковымі… Як у Ікара з крыламі.

Тэма гораду будзе. Літаральна цяпер працую над нізкаю «Чалавек у сучасным горадзе».

І будзе сэрыя аркушаў «Більярд». Памятаеце, як у Генрыха Бёля — «Більярд а палове на дзясятую»… Стол, які аб’ядноўвае дваіх людзей, і як разьвіваюцца адносіны паміж імі ў азартнай гульні. Маглі б быць і карты… У Сэзана ёсьць «Гульцы ў карты». Але більярд — гульня дынамічная, што дазваляе стварыць безьліч кампазыцыяў у розных ракурсах. Я некалі сам гуляў у більярд.

Тэхнікі ў мяне розныя, але цяпер я займаюся найбольш малюнкам. Бо гравюра, афорт, літаграфія вымагаюць вельмі шмат чарнавое работы. І пакуль дойдзеш да арыгіналу, то ўжо губляеш сьвежасьць, экспрэсію. А малюнак — гэта беспасрэднае выказваньне.

### Я ў сучасным Менску чужаніца

**«НН»: Вы карэнны мянчук, нарадзіліся ў Менску у 1929 г. Як вы яго вычуваеце, гэты горад, сёньня?**

**АК:** Ведаеце, некалькі гадоў таму была ў нас выстава нямецкае графікі, на якую прыехаў адзін прафэсар, вядомы мастацтвазнаўца. Мы сядзелі ў маёй майстэрні, вячэралі… Я яго спытаў, дзе ён жыве. Ён сказаў, што жыве ў тым доме, дзе й нарадзіўся! Ведаеце, мяне аж скаланула. У Менску даўно няма таго дому, дзе я нарадзіўся, дамоў, сярод якіх жыў. Няма іх! Што вайна спаліла, але найбольш зьнесьлі будаўнікі. І ў гэтым вялікая трагедыя. Няма больш старога Менску. У вайну я быў з бацькамі ў Расеі, у эвакуацыі. Калі мы вярнуліся, то ўбачылі разваліны, жэглішчы, але ўсё было пазнавальна, было багата таго, што ацалела. Стаялі ад дамоў каробкі, але гэта было сваё, роднае. А тое, што набудавалі пазьней, я зь вялікай цяжкасьцю ўвабраў у сябе як карэнны жыхар гэтага места. Я ў сучасным Менску чужаніца.

Калі адкінуць тое, што было, то гэта новы, адносна камфортны, адносна чысты горад, прасторны. Але не ляжыць да яго мая душа цяпер…

**«НН»: У вашых творах пераважае мінор. Адкуль гэткі драматычны погляд на рэчы?..**

**АК:** Покліч душы такі мой… Магу тут працытаваць Забалоцкага, які казаў, што мастацтва ня лекар, а боль! Маё ўспрыманьне гораду й людзкое масы — гэта адчуваньне варожасьці. Для мяне наагул горад варожы. Праз гэта й драматызм у маіх творах. Яшчэ зь дзяцінства ў мяне было гэткае адчуваньне… Заўсёды я быў дысыдэнтам. Тое, што іншым здавалася ясным і сьветлым, для мяне было нечым трагічным. Я добра памятаю канец 30-х гадоў. Мая цётка працавала ў НКУС. Дзякуючы ёй, удалося ўратаваць бацьку, на якога быў данос… Але я ведаў, што стала зь іншымі. І ўжо калі гэта ўсё прайшло, была «адліга», настала адносная стабільнасьць, можна было ўжо ня гэтак баяцца, ува мне заставалася адчуваньне таго папярэдняга часу. А колькі ж тады вакол было лжывага патасу дый проста хлусьні… Трэ было ўслаўляць савецкую ўладу. А я абраў сабе тады ваенную тэму, бо мне патрэбны быў канфлікт. Але ў той жа маёй сэрыі «Партызаны» ніякага дзьмутага гераізму, адно ахвярнасьць. Надзвычай вялікі ўплыў на мяне зрабіла знаёмства з Адамовічам і Быкавым, іх жыцьцёвы досьвед. Можа, гэта й наклала такі моцны адбітак на ўсю маю «мінорную» творчасьць?

### Як цуцыкі ў палонцы

**«НН»: Як жывецца сёньня беларускім мастакам? Стала лепей ці?..**

**АК:** Ведаеце што, калі ўзяць застойны пэрыяд — матэрыяльна жылося нам шмат лепш. Дакладней, лягчэй. Адчувалася такая абароненасьць сацыяльная. Тады будавалі нам кватэры й майстэрні. У выдавецтвах выходзілі выдатныя кнігі, было шмат арыгінальных ілюстрацыяў да цікавых аўтараў. І ўвогуле, тады беларуская кніга была адной з найлепшых у сьвеце! Цяпер усяго таго няма. Нас кінулі, як цуцыкаў у палонку, — выплывайце! Рынку мастацтва яшчэ няма, а дзяржаўнае падтрымкі няма ўжо. Цяпер мастакі творы носяць з майстэрні на выставу, а з выставы ў майстэрню. Няма як рэалізоўваць плён сваёй працы. А гэтай дзяржаве ад нас ня трэба нічога.

І мастацтва кнігі памірае. Я, напрыклад, працую цяпер амаль выключна ў станкавай графіцы. Зрабіў, праўда, кнігу Караткевіча «Ладзьдзя роспачы». Адзіны выпадак за пяць гадоў. А перад тым рабіў «Песьню песьняў, альбо Найвышэйшую песьню Салямонаву»…

Зьявілася была свабода думкі, людзі сталі нібы больш разьняволеныя. Але няма тае цікавасьці да мастацтва, што была раней. Прыходзяць зрэдку толькі на вэрнісажы, дый тое адзінкі…

**«НН»: З кім з тых літаратараў, над творамі якіх вы працавалі, у вас склаліся найбольш прыязныя стасункі?**

**АК:** З Караткевічам найбольш мы сябравалі. Ён быў вельмі, вельмі адукаваны. Добра ведаў мастацтва. Але зь ім было цяжка працаваць, бо ён хацеў, каб ілюстрацыі былі рыхтык такія, як ён вымысьліў сабе, апісаў… А я яму казаў: навошта ж мне маляваць тое, пра што ты гэтак добра напісаў?

Быкава я толькі некалькі твораў зрабіў. Мы былі вельмі добра знаёмыя, сустракаліся, на Новы год у Адамовіча зьбіраліся, але неяк ня склаліся такія блізкія адносіны. Пра тыя ілюстрацыі да ягоных твораў, што я яму паказваў, ён гаварыў вельмі сьцісла. Толькі некалькі заўваг быў зрабіў… Ён наагул быў чалавек замкнёны, пануры, стрыманы.

А вось з кім у мяне былі найлепшыя адносіны, то гэта з Алесем Адамовічам. Можа, нават больш блізкія, чым з Караткевічам. Мы зь ім часта сустракаліся, абмяркоўвалі, што робіцца ў сьвеце. Я ілюстраваў ягоныя кнігі, і Адамовіч усё прымаў з захапленьнем. Ужо пасьля ягонае сьмерці дачка была знайшла дзёньнікавы запіс такі: тое, што робіць Кашкурэвіч, вельмі блізкае мне па духу. Для мяне гэта было цікава, што ён нават занатаваў гэтую думку.

Шамякін назваў мяне сваім суаўтарам. Яму гэтак спадабаліся мае ілюстрацыі да «Сэрца на далоні», што ён нават у «ЛіМ» напісаў артыкул, як ён, аўтар, шануе мае ілюстрацыі. Пасьля я яшчэ ягоныя творы аздабляў, «Сьнежныя зімы», але зь ім былі такія адносіны… Ён ніколі ня быў маім сябрам. Добрыя былі дачыненьні, але ня цёплыя.

### Заходняя трактоўка

**«НН»: Якія кнігі, з тых, што вы рабілі, найбольш дарагія й важныя для вас?**

**АК:** Цэлы творчы этап для мяне — ілюстрацыі да «Фаўста». Пасьля — «Карнікі» Адамовіча. Тут нават нейкае перацяканьне адбылося: некаторыя фаўстаўскія пэрсанажы пе-

«Арлен Кашкурэвіч — яму імя. Сваёй працай ён заслужыў тое, каб імя гэтае ведалі».
*Уладзімер Караткевіч. «Быў. Ёсьць. Буду»*

# споўнілася 75 гадоў

райшлі ў «Карнікаў». Напрыклад, вобраз Мэфістофэля.

«Песьня пра зубра», што выйшла ў двух выданьнях, — гэта было цікава як нешта новае — у форме, у эпосе.

Зь «Бібліяй» былі цяжкасьці. Я сябраваў зь мітрапалітам Антоніем, тым, што быў да Філарэта, і ўладыка прапанаваў мне папрацаваць над біблійнымі сюжэтамі. Тады, хоць гэта было й небясьпечна, я пачаў гэтую тэму. Ну а потым — я добра ведаю Філарэта, сустракаюся зь ім. Але як я раблю арыгінальныя ілюстрацыі да «Бібліі», зрабіўшы ўжо іх да Новага Запавету, то гэтае блізкае нефармальнае знаёмства з герархамі царкоўнымі мне замінала. Праз тое не было ў мяне свабоды. Можа, я да Бібліі падышоў бы, як да Гётэ. Але нада мною моцна вісела традыцыя, я быў нявольны, хоць і цяпер працягваю гэтую працу. Хацеў быў выдаць альбом зь біблійнымі ўрыўкамі па-беларуску. Але ўладыку нагаварылі, што гэта не праваслаўнае мастацтва, трактоўка заходняя, пратэстанцкая. І Філарэт не бласлявіў.

## Перажываньні й калізіі

**«НН»: А адкуль у вас такая заходняя трактоўка? Калі не сакрэт, якія мастакі паўплывалі на ваш стыль найбольш?**

**АК:** Ніякага тут сакрэту. Найперш гэта італьянскія нэарэалісты, Рэната Гутуза, напрыклад. Пасьля нямецкі экспрэсіянізм, найперш Кетэ Кёльвіц. Вельмі моцна на мяне паўплываў Міхал Савіцкі, зь якім я некалі даўно быў нават сябраваў. Ён вельмі шмат мне дапамог і ў мастацтве, і па-чалавечаму. Але ўсё гэта было вельмі-вельмі даўно.

**«НН»: Вы веруючы чалавек?**

**АК:** Так. Я гэта ўсьвядоміў яшчэ перад вайною. Мне было тады 11 гадоў. Ня ведаю чаму, але я ўвадначасьсе адчуў прысутнасьць Бога. Бабка мая была вельмі моцна веруючая. Але ў маладосьці яна працавала аканомкай у нейкай пані, дык тая навучыла яе каталіцкім малітвам па-польску. І гэтак выйшла, што праз усё жыцьцё мая праваслаўная бабка малілася як каталічка.

**«НН»: Як вам, з вышыняў вашых гадоў, бачыцца новае пакаленьне мастакоў?**

**АК:** Маладыя мастакі цяпер вельмі таленавітыя, сур’ёзна адукаваныя, шмат ведаюць, шмат умеюць. Але ж надта захапляюцца формаю, гуляюцца аж занадта. Маёй жа задачаю заўсёды было перадаць нейкі ўнутраны стан чалавечы, увайсьці ў сьвет духоўных перажываньняў, жыцьцёвых калізіяў. А ў моладзі няма цяпер такіх праблемаў. Яны лёгка ідуць у жыцьці і ў мастацтве. Яны праз меру рацыянальныя. Маё ж пакаленьне было пакаленьнем рамантыкаў. Мы былі некарысьлівыя ў творчасьці.

## Чытаю Рыльке і Камю

**«НН»: Што вас змушае ці натхняе тварыць сёньня?**

**АК:** Апошнім часам я чытаю Рыльке, Камю… Акунуўся ў стыхію экзыстэнцыялізму. Я ня бачу ніякага выйсьця. Чым больш ведаеш, тым у большай апынаешся драме.

Які сэнс у творчасьці? Я ня ведаю. Гэта як хочацца есьці ці піць. Цяжка сказаць, што гэта такое, чаму хочацца ствараць. Стасаў, перасоўнікі там, яны нешта хацелі сказаць сьвету, перайначыць яго… Мастацтва нічога ня можа зьмяніць! Можа хіба музыка нешта зрабіць з чалавекам. Расчуліць яго, надаць высакароднасьць. А жывапіс, малюнак — толькі сродак выхаду душэўных парываньняў самога мастака.

**«НН»: Ці павінен мастак быць яшчэ й грамадзянінам?**

**АК:** Я ніколі ня быў ні камсамольцам, ні камуністам. Да таго грамадзтва я быў у апазыцыі, ва ўнутранай сваёй эміграцыі. Была блiснула надзея ў 1991-м і ўсё… А цяпер такое расчараваньне, пасьля гэных рэфэрэндумаў. Тут можна, вядома, гаварыць пра нейкія фальсыфікацыі. Але ж усё адно гэткія лічбы адсоткаў на адным падмане ня створыш. Мне зусім незразумелыя нашы суайчыньнікі сёньня… Я ня зь імі. Чым я ім дапамагу? У мінулыя эпохі рэлігійнае мастацтва, іканапіс, росьпісы ў сьвятынях адыгравалі, так, велізарную ролю. Мастацтвам можна стварыць летапіс духоўны, адлюстраваць станы душы, але што гэта цяпер такое?.. Нават плякат як мастацтва сёньня ў заняпадзе. Цяпер хіба кіно можа зрабіць наймацнейшае ўражаньне, нешта пераламіць у чалавеку. А выяўленчае ж мастацтва — яно вельмі камэрнае. Яно выклікае гледача на ціхі дыялёг. Толькі ціхі дыялёг.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**7 лістапада ў менскай кавярні «Добрыя мысьлі» адбылася прээзэнтацыя кніжкі паэта і барда Алеся Камоцкага «Наспадзяванае». Паводле словаў самога аўтара, яму ўпершыню давялося выступаць у бары.**

# Неперасаладжанае

Гладкая і прыемная ва ўсіх сэнсах кніжка. Хоць бы таму, што не пакідае па сабе глыбокіх узрушэньняў. Першае ўражаньне, калі дакранаешся, — ручная работа. Пастэльная вокладка, кішэнны фармат, шчыльная папера, роўная абрэзка — так цяпер рэдка выдаюць. Урэшце — ілюстрацыі: каляровыя, наклееныя (уласнаручна?) на старонкі. Але засакрэчаных вершаў пад імі няма. Праверана.

Дзе-нідзе паэт — колішні саксафаніст гурту «Зарціпо» — возьме й прыпомніць панк-рокерскую маладосьць, пагуляўшыся з этыкай і гуманнасьцю («Злодзей»). Але гэта адзінкавыя выпадкі. У цэлым юначы цынізм зазнае паразы і адступае перад стомай ад расчараваньняў. То бок лірыкай. Збольшага сьветлай.

Складанасьці абставінаў жыцьця
Неспадзявана ўжо не засмучаюць,
Ужо болей нечакана не зьдзіўляюць.
Жывём не прадчуваньнем адкрыцьця,
А намаганьнем выспацца начамі.

Тыя, хто ведае Алеся Камоцкага па бардаўскіх фэстах, заўважаць, як просяцца многія творы з кнігі на гітарны перабор, як нікнуць яны і губляюцца без музычнага суправаджэньня. Усё-такі бардаўская лірыка — ня месца для складаных вобразаў. Хоць сюжэты ў асобных вершах трапляюцца такія, нібыта пад псэўданімам «Камоцкі» дзейнічае Эжэн Ёнэско, якога нечакана прабіла на паэзію («Навіна»).

У кнізе раптам знаходзіш просты адказ на пытаньне, што ж такое аўтарская песьня і чым яна розьніцца ад, напрыклад, эстрады. У першай аўтар не перасаладжвае. Як толькі душэўныя струны напінаюцца і набываюць трагічнае гучаньне, ён з блазенскай усьмешкай бярэ фальшывую ноту:

**Алесь Камоцкі. Наспадзяванае: Вершы і песьні.** — Менск: Радыёла-Плюс, 2004.



Я пад асеньняе цяпло
Падстаўлю галаву і здохну.
І зарасьце пакрыху мохам
Маё апошняе жытло.

І гэтая неперасаладжанасьць дапамагае ставіцца да аўтарскай песьні сур’ёзна, даруючы дробныя ахвяры зьместам дзеля прыгаства.

Цікава, якія б вершы пісаў Сыд Вішэс, каб пажыў яшчэ?

**Яўген Квач**

НАВІНЫ

## Вуліца Ермаловіча

Пісьменьнік Леанід Дайнека выступіў у «Краязнаўчай газеце» з прапановай надаць вуліцы Рафіева ў Менску імя гісторыка Міколы Ермаловіча. На вул.Рафіева была кватэра Ермаловіча, на гэтай вуліцы ён і загінуў. Разам з прапановай Л.Дайнека друкуе свой верш «Настаўнік», дзе называе Ермаловіча «Герадотам беларускім».

## «Беларускія песьняры» ў Крамлі

У сьнежні «БП» маюць выпусьціць альбом зь песьнямі, якія прагучалі сёлета на канцэрце ў Крамлёўскім палацы. Назва — «Беларускія песьняры» ў Крамлі». Зь «песьнярамі» будуць сьпяваць Іосіф Кабзон («Александрыну» і «Бярозавы сок»), гурты «Самоцветы» й «Любовные истории».

## Ганкура — 32-гадоваму

У Францыі пачаўся сэзон літаратурных прэмій. Прэмію «Фэміна» атрымаў Жан-Поль Дзюбуа за раман «Французскае жыцьцё». Найлепшым замежным раманам названая кніга Х’юга Гамілтана «Нячыстая кроў». Прэмія «Мэдычы» сярод францускіх аўтараў дасталася Мары Нім’е за раман «Каралева маўчаньня», а з замежных — ізраільцяніну Арону Апэрфэльду за «Гісторыю жыцьця». Ляўрэатам найпрэстыжнейшай у Францыі прэміі Ганкураў стаў раман «Сонца Скорта» маладога пісьменьніка Лярана Гадэ. Першы раман Гадэ выйшаў у сьвет у 2001 г. Апрача таго, Гадэ — аўтар 5 тэатральных п’есаў. «Сонца Скорта» распавядае пра жыцьцё некалькіх пакаленьняў італьянскай сям’і з 1870 г. да нашых дзён.

**АВ, СБ; БелаПАН, Gazeta.pl**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# «Саша і Сірожа» вяртаюцца на Радзіму

**Беларускія шоўмэны вяртаюцца ў беларускі эфір. Ад 15 лістапада іх можна пачуць на «Першым музычным» у будні а 21.45 (паўтор а 01.45).**

Праграма мае назву «Новыя калыханкі». Тэмы першых перадачаў: «Што такое папса і чаму ёй трэба забараніць размнажацца», «Хто такія гобіты і што адбываецца сёньня ў сьвеце», «Цырконій крочыць па плянэце».

«Саша і Сірожа» — адзін з праектаў творчай суполкі «Дзеці Сонца». Пераможнае шэсьце дуэту распачалося, калі лідэр гурту «Ляпіс Трубяцкой» Сяргей Міхалок і мастак Аляксей Хацкевіч пачалі маляваць коміксы пра двух беларускіх хлопцаў — Сашу і Сірожу — «ужо не дзеравенскіх, але яшчэ не гарадзкіх». Потым нарадзілася ідэя праграмы «Калыханка». «Саша і Сірожа» заўважна папоўнілі вулічны слэнг сваімі словамі. Менавіта пасьля іх выступаў гіпэрпапулярным стала слова «калдыр».

«Сашу і Сірожу» належыць аўтарства «Опэры для лянотнікаў», што трансьлявалася на беларускіх і ўкраінскіх радыёстанцыях ды выйшла асобнымі дыскамі. Хлопцы таксама малявалі мульты для праграмы Дзіброва на расейскім ОРТ, вялі ўласную перадачу на БТ («Дастань зорку»), якую зачынілі з спасылкай на тое, што яна ня мае гледача. Нейкі час «Саша і Сірожа» зьяўляліся ў газэце «Прессбол». Апошнім часам выступалі на ўкраінскім канале «М-1», дзе набылі шалёную папулярнасьць. Ад 15 лістапада іх можна зноў пачуць на «Першым музычным» у будні а 21.45 (паўтор а 01.45).

«Саша і Сірожа»: «Мы ведаем, што «Калыханка» прыйдзецца даспадобы людзям, бо маем розныя перадачы — пазнавальныя, забаўляльныя, казачныя, выхаваўчыя ды інш. Яе могуць глядзець і дарослыя, і дзеці, і фізыкі, і таксісты. Каму абрыдла глядзець крымінал і дурнаватыя шоў, уключыце «Першы музычны»!»

**СБ**

# Беларусы наеліся і хочуць мары

Алесь Аркуш

**Лукашэнка правільна, хоць і вульгарна, сфармуляваў, чаго хацелі постсавецкія беларусы, — «чарка, шкварка і абы не было вайны». Хто наступны адчуе і ўзьніме на сьцяг новую народную мару?**

Улада, якой яна б ні была ўзурпатарскай, будзе знаходзіцца «ля руля», пакуль яна здольная дэманстраваць клопат пра свой народ. Чым больш улада дэспатычная, тым больш яна казырае клопатам аб паспалітых людзях. Згадайма СССР ці Кубу. Аднак клопат пра народ можа быць сапраўдным толькі пры дэмакратычным кіраваньні. Інакш як даведацца, чаго гэты народ хоча і аб чым марыць? Народ мусіць сам накіроўваць уладу на пошукі народнага шчасьця.

Гэта датычыць і апазіцыі. Калі яна ня цяміць, у чым клопат народу, яна асуджана на няўдачу. Бязглузда казаць беларусам: мы ведаем, як трэба здабываць тое шчасьце, маўляў, паглядзіце на суседзяў-прыбалтаў, мы пойдзем гэткім жа шляхам і хутка зажывём, як у Бога за пазухай. Але хто сказаў, што беларусы хочуць ісьці гэткім жа шляхам?

Лукашэнка правільна, хоць і вульгарна, сфармуляваў, чаго хацелі постсавецкія беларусы ў сярэдзіне 90-х, — «чарка, скварка і абы не было вайны». Нічога непрыстойнага ў гэтым жаданьні няма. Для беларусаў пэрыяды, калі «няма вайны і ёсьць што паесьці», доўгі час былі прыкладам шчасьця. Галоўнае, каб было спакойна навокал, астатняе мы самі заробім і створым. Так, немцы або французы больш дзейсна ўмеюць бараніць свае інтарэсы. Але вопыт сацыяльна-палітычнага змаганьня беларусы не маглі набыць ані пад царом, ані за СССР. Сама Эўропа падобны вопыт назапашвала стагодзьдзямі.

Крытыка, якая абрынулася ў 80—90-х гадах на ўсё беларускае савецкае, як сёньня ўжо выразна відаць, аказалася дэструкцыйнай. Дасталося ўсім — ад Купалы да Караткевіча, а асабліва — «саўковаму» беларускаму народу. Здавалася, вось ліквідуем галоўліт — і Беларусь набрыняе новым эстэтычным, палітычным, культурным сьветаглядам. І дзе той сьветагляд? Анічога вышэйшага за Караткевіча й Быкава дасюль ня маем.

Ці высьвятлялі сацыёлягі перад 17 кастрычніка, чаго хочуць жыхары гэтае таямнічае краіны? Наўрад ці беларусаў можна, як авечак, пагнаць па «агульнапрынятым цывілізаваным шляху». Народ — гэта не алюмініевы дрот, зь якога можна выгнуць любую фігуру. Гэта, хутчэй, сталёвы дрот, які ўпарта вяртаецца ў першапачатковую форму. Сьветагляд народу трансфармуецца марудна. Праходзяць дзесяцігодзьдзі, мяняюцца пакаленьні.

Напярэдадні выбараў гучалі толькі лічбы «даверу і недаверу» да Лукашэнкі. Так, «недавер» павялічваўся. Але што прапаноўвалася ўзамен? Няўцямныя «рынак», «інвэстыцыі», «правы чалавека», «эўрапейскі шлях». Няўдала выглядала праграма «Пяцёркі+» «Пяць крокаў да лепшага жыцьця». Усё там правільна. Але ці былі прывабнымі, зразумелымі тыя крокі для паспалітых беларусаў? Я так і не заўважыў, каб «пяцёркаўская» праграма хоць неяк запала ў галовы жыхароў краіны. Насамрэч на сьцягох мусіць быць напісана народная мара. А «крокі» — гэта толькі мэтад, як тую мару зьдзейсьніць. Цяперашні народны клопат яшчэ не сфармуляваны апазіцыяй гэтак жа зразумела, як некалі тое зрабіў Лукашэнка.

З Лукашэнкам мы прайшлі самы небясьпечны пэрыяд станаўленьня незалежнай Беларусі. Сёньня народ ужо ня мроіць пра аднаўленьне СССР або далучэньне да Расеі. Сёньня беларусы ўсьведамляюць сябе беларусамі. Яны ўсё радзей называюць маскоўскі «Спартак» сваёй камандай, яны хварэюць за Мірнага і менскае «Дынама», ходзяць на канцэрты Вайцюшкевіча, маюць свае любімыя айчынныя гатункі піва, гарэлкі і сыру. Яны, здаецца, наеліся і пачынаюць марыць пра нешта іншае.

**alesarkus@hotmail.com**




# Нешта новае

**На БТ адбылася прэм'ера дакумэнтальнага фільму «Супрацьстаяньне». Не падумайце толькі, што гэта прадукт Азаронкаў, — ён прысьвечаны паваеннаму антысавецкаму супраціву.**

Першы ў гісторыі фільм пра паваенны беларускі супраціў зьняло дзяржаўнае ТБ. Без «ура-патрыятызму», як робяць прыбалты, але і без старых савецкіх штампаў, як дагэтуль было ў нас. Факты — сур'ёзная рэч. Тысячы людзей змагаліся за незалежную беларускую дзяржаву супраць савецкага панаваньня, таму для Масквы яны былі «нацыяналістамі», «бандытамі». А кім яны мусяць быць для Рэспублікі Беларусі?

Фільм «Супрацьстаяньне» — як пробны шар. Яго місія не зусім ясная. Зьдзівіць беларускага гледача сэнсацыйнымі фактамі пра антысавецкую барацьбу аж да сярэдзіны 1950-х? Аб'ектыўна разабрацца ў складаным пасьляе палітычных гульняў другой сусьветнай, па розныя бакі франтоў якой апынуліся беларусы? У любым разе, столькі дакумэнтаў і фотаматэрыялаў пра антысавецкі ўзброены супраціў не абнародавалася за ўсю паваенную гісторыю.

Хаваць ад грамадзтва архіўныя матэрыялы пра «невядомую вайну ХХ ст.» надалей ужо няма сэнсу. Але, здымаючы пячаткі з тайных справаў, дзяржбясьпека пакідае за сабой ролю манапаліста. У 2002 г. выйшла кніга супрацоўніка КДБ Ігара Валахановіча «Антысавецкае падпольле на тэрыторыі Беларусі ў 1944—1953 г.», паводле якой Ксеніяй Бахаравай і зьнятае «Супрацьстаяньне».

«Гісторыя падпольля на тэрыторыі Беларусі з 1944-га да 1953 г. непарыўна зьвязана са складанымі і трагічнымі працэсамі станаўленьня беларускай дзяржаўнасьці», — гавораць аўтары фільму. Паводле іх, «ідэя пабудовы беларускай незалежнай дзяржавы прысутнічала ў праграмных дакумэнтах практычна ўсіх падпольных арганізацый і груп». Якія наватарскія ацэнкі!

На маю думку, ня варта спадзявацца на рэабілітацыю беларускага супраціву пры гэтай уладзе (у нас дагэтуль не рэабілітаваная нават Ларыса Геніюш). Аднак гэтую тэму будуць эксплюатаваць, ужо эксплюатуюць. У падзеях, асьветленых у «Супрацьстаяньні», застаецца маса нескарыстаных сюжэтных ліній.

**Сяргей Ёрш**

### Пра што фільм «Супрацьстаяньне»

З 1944 у Беларусі шырыцца антысавецкі супраціў. Адначасова нямецкая разьведка закідае ў БССР з Усходняй Прусіі дзясяткі дывэрсантаў-беларусаў, зь якімі змагаецца «Сьмерш». Але апошняга дэсантніка — Аўгена Жыхара — ліквідавалі толькі ў студзені 1955 г. Да таго часу савецкія спэцслужбы «зачысьцілі» і дэсанты, якія ў пачатку 50-х закідаліся ЦРУ і таксама складаліся зь беларусаў. У фільме цытуюцца дакумэнты з крымінальных справаў, дэманструюцца фотаматэрыялы (здымкі атаманаў Раманчука і Дэмуха, маёраў Гелды і Родзькі). У другой частцы, прысьвечанай дзейнасьці польскае партызанкі на тэрыторыі Гарадзеншчыны, нічога новага аўтары не адкрылі.

### ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

У Горадні 3 лістапада па 20 базавых велічыняў штрафу (480 тыс. рублёў) прысудзілі журналістам **Натальлі** й **Анатолю Макушыным** за ўдзел у пікеце пратэсту. Старшыню менскай суполкі крышнаітаў **Аляксандру Карзову** 3 лістапада Цэнтральны суд Менску вынес папярэджаньне за набажэнствы ў прыватным доме без дазволу ўладаў. У Ваўкавыску **Мікалай Аксаміт** 3 лістапада спыніў галадоўку па стане здароўя. На памежным пераходзе Бераставіца—Баброўнікі 4 лістапада супрацоўнікі мытні амаль разабралі на часткі аўтамабіль дэпутаткі Сойму Польшчы **Барбары Кудрыцкай**, у якім кіраваліся на канфэрэнцыю ў Беласток старшыня Партыі БНФ **Вінцук Вячорка** і ганаровы старшыня Саюзу палякаў **Тадэвуш Гавін** — так шукалі забароненае. 4 лістапада Берасьцейскае абласное аб'яднаньне ФПБ у аднабаковым парадку скасавала дамову пра арэнду зь мясцовай суполкай Прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці, аўтамабілебудаваньня і мэталаапрацоўкі. Каардынатар «Зубра» **Мікіта Сасім** 5 лістапада затрыманы ў Баранавічах на падставе пастановы суду Цэнтральнага раёну Менску, паводле якой ён ужо адседзеў 15 сутак. У той самы вечар у ягоную кватэру ўварваліся работнікі міліцыі ў цывільным, затрымалі «зуброўцаў» **Паўла Юхневіча**, **Аляксея Ляўковіча**, пасьляператрусу канфіскавалі даклад Х.Пургурыдэса. Пракуратура Партызанскага раёну Менску 5 лістапада адмовілася разглядаць скаргу экс-кандыдаткі **Людмілы Грaзновай** на паклёпніцкія ўлёткі без выходных зьвестак, распаўсюджаныя ў ейным раёне ад «Клюбу выбарцаў Менску». **Міхаілу Марынічу** 5 лістапада прад'явілі канчатковае абвінавачаньне: незаконныя дзеяньні ў дачыненьні да зброі (ч.2 арт.295 КК), крадзеж альбо пашкоджаньне дакумэнтаў, штампаў, пячатак (ч.2 арт.377 КК), крадзеж праз злоўжываньне службовымі паўнамоцтвамі, учынены групай ці ў асабліва буйным памеры (ч.4 арт.210), хаваньне афіцыйных дакумэнтаў і пячаткі (ч.1 арт.377). 5 лістапада ў Беларусь не пусьцілі **Гельмута Курта**, кіраўніка бюро па Ўкраіне, Беларусі й Малдове нямецкага сацыял-дэмакратычнага фонду імя Эбэрта. Здымачную групу журналістаў расейскага бюро французскага тэлеканалу **TF-1** затрымалі 5 лістапада, калі яны здымалі акцыю «Зубра» ў Менску, і пазбавілі акрэдытацыі. 8 лістапада ў пракуратуры Менску **Ірыну Халіп** папярэдзілі пра крымінальную адказнасьць за «паклёпніцкія выдумкі»: падставай стаў артыкул журналісткі наконт рэфэрэндуму ў расейскай «Новой газете». **Павал Мажэйка** спыніў галадоўку 8 лістапада, калі выйшаў са спэцразьмеркавальніку, у якім адседзеў сем сутак. Пракуратура Савецкага раёну Менску вынесла **Пятру Садоўскаму** 8 лістапада папярэджаньне: яго вінавацяць у ціску на сяброў выбарчай камісіі за агучваньне факту зьнікненьня 255 бюлетэняў.

**АШ**



# Правы рэванш

**Працяг са старонкі 6.**

У афіцыйных колах Эўразьвязу агучваньне кансэрватыўных ідэй фактычна зрабілася непрымальным. Самы сьвежы прыклад — скандал вакол аднаго з кандыдатаў у камісары Эўракамісіі Бутыльёнэ, рэлігійныя перакананьні якога выклікалі пратэсты Эўрапарлямэнту, і пасады ён так і не атрымаў. Аналітыкі небеспадстаўна прыраўнавалі адстаўку Бутыльёнэ да прэцэдэнту забароны на кіраўнічыя пасады для хрысьціянаў.

У сьвятле сацыяльна-культурнага панаваньня лібэралізму прыход да ўлады Буша ў Амэрыцы ў 2000 г. зь ягонымі яскрава кансэрватыўнымі поглядамі на рэлігію і сям'ю падаваўся недарэчнай выпадковасьцю. Тым больш што на тагачасных выбарах большасьці галасоў Буш не атрымаў. У 2004 г. гэтая недарэчнасьць мусіла быць выпраўленая. Перамога мусіла належаць Керы зь ягоным лібэральным стаўленьнем да большасьці спрэчных сацыяльных пытаньняў.

Аднак вынікі прэзыдэнцкіх выбараў у Амэрыцы прынесьлі іншы вынік. Буш атрымаў пераканаўчую большасьць галасоў у 3,5 мільёна выбарцаў. Рэспубліканская партыя ўзмацніла свой кантроль над абедзьвюма палатамі амэрыканскага парлямэнту. Праведзеныя ў 11 штатах рэфэрэндумы пацьвердзілі азначэньне сям'і як хаўрусу паміж мужчынам і жанчынай.

Аказалася, Буш лепей за свайго лібэральнага канкурэнта ведае сваю краіну. Менавіта акрэсьленая пазыцыя Буша ў пытаньнях забароны абортаў і павагі да сям'і дазволіла яму дагрукацца да сэрцаў амэрыканскае глыбінкі. Буш быў падтрыманы большасьцю замужніх жанчын і маці да працыючых вернікаў. Улічваючы неспрыяльныя стартавыя ўмовы для Буша ў сьвятле іракскага крызісу, падтрымка амэрыканцамі маральных каштоўнасьцяў Буша падаецца фэнамэнальнай. Лібэральныя ідэі, як аказалася, пануюць толькі ў прыбярэжных урбаністычных штатах. У пачатку XXI ст. рэлігія і сям'я вярнулі сабе ролю вызначальных вартасьцяў амэрыканскага грамадзтва. Кансэрватызм узяў пераканаўчы палітычны рэванш за культурныя паразы мінулых стагодзьдзяў. Можна прагназаваць перакідваньне гэтае тэндэнцыі за Атлянтычны акіян. Чакаем працягу кансэрватыўнага павароту ў Эўропе.

**Сяржук Вінаградаў,**
siarzhuk.vinahradau@tut.by

# Сяргей Будкін. Журфак

### СВОЙ СЛОЎНІЧАК

Раней студэнты што з Масквы, што з Львова, што зь Менску мелі адзіны слэнг, нават калі размаўлялі на сваёй роднай мове. Апошнімі гадамі сытуацыя мяняецца. Беларускамоўная моладзь, хоць часам і карыстаецца аднымі з расейцамі слэнгавымі здабыткамі, мае і свае ўласныя. Датычна нашай кампаніі (ля 30 чалавек), недзе падхопленыя ці прыдуманыя словы цалкам гарманічна ўпісаліся ў нашы размовы ды выцесьнілі адтуль русізмы. Гэта — невялічкая частка нашага слоўнічка.

**Абалдзянець** — ачмурэць ад чаго-небудзь, затлуміцца. *Сьвяткавалі два дні, пайшлі абалдзянелыя.*
**Адцягнуцца** — добра прабавіць час, адпачыць. *Хадзем на Вольскага — адцягнемся хоць.*
**Быкасты** — прадмет, што быў у карыстаньні. *Табе быкастую мабілу прадалі.*
**Варкіла** — нездаволены чымсьці чалавек. *Ягоны бацька — варкіла, усё мазгі кампастуе.*
**Віслы** (даць, атрымаць) — адказ на грубасьць, зьнявагу. *Гані бабло! — А віслы табе ня даць?*
**Гундос** — гугнявы чалавек; абыякавы да ўсяго, пасіўны, скнара.
**Гык** — мужчынскі палавы орган.
**Гыкасты** — дужа вялікі.
**Замандзячыць** — моцна ўдарыць па чым-небудзь.
**Ламэр** — неадукаваны, неахайны чалавек. *Каго ты адправіў, ён жа ламэр!*
**Маскальнуты** — прыхільнік расейскай поп-культуры. *На «Блін»* (клюб «Бліндаж») *ня пойдзем — там адны маскальнутыя.*
**Нармуль** — добра, у норме. *Калі ў нас усё нармуль, чаго ўсе пруць адсюль?*
**Нахвіга** — навошта, за што.
**Паратунка** — хуткая дапамога. *Маёй бабці паратунку выклікалі.*
**Патэліць** — затэлефанаваць. *Я ў Наваградку, заўтра патэлю.*
**Пляжыць** — ненатуральны стан чалавека, выкліканы дэпрэсіяй, бадуном, атручэньнем. *Пляжыла дні тры: чабурэкаў вакзальных наеўся.*
**Раскілбас** — ступень задаволенасьці.
**Сьнядзец** — ежа, звычайна хуткага прыгатаваньня. *Ты ж галодны, сьнядзец захапі.*
**Фурычыць** — функцыянаваць, працаваць. *Комп у мяне не фурычыць.*
**Хлапчыска** — кволы маладзён. *Юрык такі хлапчыска, затое як у футбол грае!*
**Чад** (даць чаду) — шалёнасьць ва ўчынках, хуткі рытм. *«Энэрэмы» прыедуць, дадуць чаду!*
**Шлупаць** — ісьці да д'ябла. *Шлупай ты, Міколенька!*
**Шчырка** — жаночы палавы орган.
**Шчырэц** — вынік зробленай працы, часьцей няўдалай, канец усяму.

**Сяргей Будкін**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# ЭТА ў эпоху постмадэрнізму

Лёлік Ушкін

**У францускай пячоры плошчай 40 м², дзе этарас хавалі свой абшчак і інгрэдыенты для вырабу выбуховых рэчываў, было арыштавана ўсё кіраўніцтва басконскай радыкальна-нацыяналістычнай арганізацыі ЭТА (у перакладзе з баскай — «Радзіма і Свабода»).**

Чэрвеньскай раніцай 1968 г. шэф паліцыі правінцыі Гіпузкоя Мэлітон Мансанас быў знойдзены мёртвы ў сваім доме. Сябры ЭТА забілі яго, помсьцячы за зьдзекі з апазыцыянэраў, арыштаваных за пратэсты супраць дыктатуры Франка. Рэха таго стрэлу, які паклаў пачатак амаль 40-гадовай гісторыі баскага тэрарызму, здаецца, нарэшце заціхла.

4 кастрычніка паліцыя Францыі і грамадзянская гвардыя Гішпаніі ў выніку аблавы ў маёнтку ў францускім мястэчку Саліе-Дэ-Бэран зашухерылі галоўных босаў палітычнага, эканамічнага і апэратыўнага аддзелаў арганізацыі ЭТА, т.зв. Artapallo, у тым ліку яе ідэйнага «пэрпэтуўм мобіле» — Мікеля Альбіцу Ірыяртэ (падпольная мянушка Мікель Антца). Акрамя штабу палітбюро ЭТА пінкертоны знайшлі пячору плошчай 40 м² з гідраўлічнай сыстэмай кантролю, дзе этарас хавалі свой абшчак і набор юнага хіміка — 40 кг хлярыту, 4 кг алюмінію і іншыя інгрэдыенты для вырабу выбуховых рэчываў. Дарэчы, у арсэнале лябараторыі экстрэмістаў была знойдзена таскама ракета «зямля—паветра» з лэйблам «Made in USSR» (ці не са складу з-пад Бабруйску?). Ракета, як заявіў гішпанскі пракурор Бальтазар Гарсон, была патрэбна сэпаратыстам для замаху на «Боінг» караля Карляса Бурбона. Дынаміт рыхтавалі для сэрыі фаервэркаў у цэнтры Мадрыду, якія пляналіся яшчэ на мінулы чэрвень. Усе грандыёзныя пражэкты баскаў тады абламалі фанатыкі з «Аль-Каіды», якія 11 сакавіка запусьцілі ў паветра чатыры цягнікі на мадрыдзкім вакзале Аточа.

Акцыя ісламістаў прымусіла тэрарыстаў перагледзець сваю стратэгію. Акрамя таго што тэрарызм як палітычны інструмэнт сябе скампрамЭТАваў, была надзея на дыялёг з уладамі. Кабінэт сацыяліста Сапатэра, які ў выніку выбараў 13 сакавіка зьмяніў урад кансэрватараў Азнара, тэарэтычна мог сесьці з сэпаратыстамі за стол перамоў, як калісьці прэм'ер-сацыяліст Гансалес. Тым больш што падчас сакавіцкага крызісу галоўным джокерам «ружовых» была вэрсія, што за выбухамі на Аточа стаялі ня баскі (гэтак сьцьвярджалі кансэрватары), а ісламісты, якія жадалі адпомсьціць гішпанцам за падтрымку Азнарам іракцкай авантуры Буша-малодшага.

Але сацыялісты і ня думалі карашыцца з ЭТА. Навошта, калі на гэты час маліна ЭТА ў Саліе-Дэ-Бэран была ўжо выкрыта і паліцыянты проста чакалі, пакуль у пастку трапіць як мага больш баскіх прафэсараў Плейшнэраў?

Тое, што Сапатэра не партнэр, а «аброн» (з гішп. «казёл»), баскія нацыяналісты зразумелі толькі ўлетку, калі зь бюлетэняў на выбарах у Эўрапарлямэнт Мадрыд выкрасьліў т.зв. «Народны сьпіс» — блізкі па поглядах да забароненай за кантакты з ЭТА партыі «Батасуна». ЭТА спрабавала дрыгацца: у верасьні ў рамках кампаніі супраць турызму — нэрва гішпанскай эканомікі — зьдзейсьніла акт сабатажу на чыгунцы, пасьля чаго паліцыя, відавочна, і вырашыла прыкрыць крамку.

Такім чынам, калі меркаваць па бравурным тоне гішпанскай прэсы, ЭТА прыйшоў капец. І сапраўды: па-першае, пасля 11.09 тэрарызм набыў адназначна нэгатыўную канатацыю, па-другое, апошнія рашэньні Шырака — удзел францужаў у аблаве ў Саліе-Дэ-Бэран і намер экстрадыяваць былога сябра «Чырвоных брыгад» Чэзарэ Батысьці — сьведчаць аб тым, што Парыж ня будзе болей даваць прапіску левым экстрэмістам, як гэта было ў часы Мітэрана. Раней тое самае зрабілі Лібія, Альжыр і Мэксыка. Сёньня нават за акіянам баскім індэпэндыстам няма спакою — сынхронна з акцыяй у Францыі ФБР арыштавала ў Нью-Ёрку супрацоўнікаў басконскай сэкцыі сайту «Indymedia».




Галоўнае — зьмяніўся культурны бэкграўнд. Тут трэба адзначыць, што, атрымаўшы аўтаномію, баскі вельмі сур'ёзна падышлі да стварэньня сваёй культуры. Выйсьці на лічбу ў 1000 выданьняў штогод на матчынай мове было для іх накшталт сацыялістычнага абяцаньня. Тэмпы рэалізацыі пляну былі сапраўды стаханаўскімі — пры канцы 80-х Мінкультуры радасна рапартавала аб тым, што колькасьць пісьменьнікаў у Краіне баскаў у пераліку на адзін км² найбольшая ў Эўропе. Самым модным літаратурным жанрам у тыя часы быў мікс паміж экзыстэнцыялізмам і рамантызмам з характэрнымі для іх парадыгмамі — нацыя, сэнс жыцьця і абавязак. Ня дзіўна, што Мікель Антца па прафэсіі філёляг-літаратар, як і арыштаваная разам зь ім яго гёрл-фрэнд Амбота Іпагуірэ.

Сёньня сытуацыя іншая. На старонках баскіх блякбастэраў, як і паўсюль у Эўропе, пануе таранцінаўшчына. Галоўныя пэрсанажы — не гарадзкія інтэлектуалы, якія, вярнуўшыся на канікулы ў вёску, бачаць, як трактары нейкай кастыльскай кампаніі нішчаць родныя краявіды, прыпадаюць да каранёў і займаюць радыкальную грамадзянскую пазыцыю. Куміры сёньняшняй маскультуры — сэксуальныя вычварэнцы і крымінальнікі, якім грохнуць чалавека — як два пальцы аб асфальт. На подзьвігі ў імя нацыі такі масліт нікога не штурхае, затое штурхае да высновы: знайсьці сьнежнага чалавека прасьцей, чым інтэграваць постмадэрнізм і нацыяналізм.

І усе ж ЭТА яшчэ не канец. З арыштамі ў Францыі так і засталіся нявырашанымі галоўныя прычыны канфлікту — падзел нацыі паміж Францыяй і Гішпаніяй, праблема захаваньня мовы і культуры, наяўнасьць каля 200 палітвязьняў, перасьлед з боку гішпанскай паліцыі.

Акрамя таго, стаўка на палітычныя інстытуты не дае адпаведнага плёну. Сымбалічна, што арышты этарас супалі з 25-гадзьдзем дэклярацыі аб наданьні Краіне баскаў статусу аўтаноміі, т.зв. статуту Гернікі. Юбілей аўтаноміі выклікаў шырокую дыскусію ў баскім грамадзтве, рэзюмэ якой — рэалізаваць нават легальнымі сродкамі прынцыпы аўтаноміі аказалася немагчымым. Як ілюстрацыя — намаганьні кіраўніка аўтаноміі Хуана Ібартэкстэ працягнуць рэфэрэндум аб пашырэньні паўнамоцтваў Віторыі — сталіцы баскаў. Спачатку яго ініцыятывы доўга мурыжылі ў гішпанскім Сэнаце. Закончылася валакіта тым, што мадрыдзкая Фэміда ўвогуле забараніла выносіць на плебісцыт галоўныя пытаньні праекту Ібартэкстэ. Натуральна, баскі будуць падаваць касацыю і судзіцца. Натуральна, паспрабуюць пашырыць межы аўтаноміі праз Брусэль і Страсбург, якім з разьвіцьцём эўраінтэграцыі Гішпанія перадасьць шэраг паўнамоцтваў. Нарэшце, ёсьць лобі ў краінах Лацінскай Амэрыкі, дзе баская дыяспара адыгрывае значную ролю ў эканоміцы. Аднак гэта доўгі шлях, і ці здольна ўсё грамадзтва яго прыняць — пытаньне.

Як прадэманстравалі сутычкі 24 кастрычніка ў Більбао, у наяўнасьці сацыяльная глеба для новай генэрацыі ЭТА.

Між тым, 25 кастрычніка этарас, якія засталіся на волі, перадалі вестачку. У шэраг рэдакцый паступіла відэакасЭТА з выявай двух ці то чувакоў, ці жанчынаў — казаць цяжка, бо абодва былі забінтаваныя дзеля канспірацыі, як муміі. На фоне баскага сьцягу муміі паведамілі, што ЭТА нават і «ня думае здавацца», і зноў прапанавалі Мадрыду дыялёг на аснове прызнаньня правоў баскай нацыі на незалежнасьць.




Знайсьці сьнежнага чалавека прасьцей, чым інтэграваць постмадэрнізм і нацыяналізм.

НА ПРАВОХ РЭКЛАМЫ

# Шанцы на разьвіцьцё аўтатранспарту

**Аўтатранспарт — галіна гаспадаркі, якая адразу ж пасьля далучэньня Польшчы да Эўразьвязу пачала перажываць грунтоўныя зьмены.**

Большыя шанцы на разьвіцьцё цяпер маюць прадпрыемствы, якім удаецца выкарыстоўваць шанец адкрыцьця эўрапейскага рынку. Тут істотнымі будуць такія элемэнты, як вядомая марка, давер кліентаў і сетка кантактаў. Такім чынам, немалое значэньне можа мець велічыня фірмы.

З 1957 г. у Польшчы дзейнічае Асацыяцыя міжнародных аўтаперавозчыкаў. Аб'ядноўвае яна прадпрымальнікаў, якія займаюцца міжнароднай транспартнай эканамічнай дзейнасьцю, гэта каля 4 тыс. асобаў. Гаворыць генэральны сакратар арганізацыі **Ян Бучак**.

— Высьвятлілася, што дзякуючы ліквідацыі межаў унутры Эўразьвязу няма прастояў на мяжы. За час, патрэбны калісьці на чатыры рэйсы, цяпер можна зрабіць 5—6. Зь іншага боку, зьвязаўскі рынак настолькі герметычны, што нашы транспартныя прапановы там не праходзяць.

**— Хто на дадзены момант у лепшай сытуацыі — малыя ці буйныя прадпрыемствы?**

— Нельга так адназначна акрэсьліць. Ёсьць эфэктыўныя дробныя прадпрымальнікі, якія выкарыстоўваюць усялякія нішы. Ёсьць таксама буйныя прадпрыемствы з добрым мэнэджмэнтам, што забясьпечвае ім стабільныя, доўгатэрміновыя кантракты. Як сярод малых, так і сярод буйных ёсьць фірмы, пазыцыя якіх пахіснулася ў дадзены момант, а ёсьць таксама і тыя, якія не адчуваюць зьменаў.

**— Моцным бокам польскіх фірмаў могуць быць ніжэйшыя расцэнкі ці гатоўнасьць да падарожжаў на поўдзень і ўсход Эўропы. Такіх трасаў іхныя калегі з Захаду вельмі часта пабойваюцца.**

— Баяцца — гэта, можа, замоцна. За апошнія 10 гадоў вельмі шмат памянялася. У першую чаргу, ліквідавана пагроза дарожнага бандытызму. Нейкія напады — гэта сёньня рэдкасьць. Упарадкаваны таксама мытныя апэрацыі, напрыклад, унутры Расеі. Такім чынам пагроза, што нехта бясправўна пяройме груз, а кошт залічаць на перавозчыка, амаль цалкам ліквідаваная. Гэтага ўжо няма. У сваю чаргу, адсутнасьць дарожнай інфраструктуры і доўгі час чаканьня на мяжы, а пазьней на тэрміналах на месцы прызначэньня адпалохвае замежных перавозчыкаў. Замест таго каб траціць тры дні на прастой на польска-беларускай мяжы, на беларуска-расейскай і яшчэ дзень ці два на тэрмінале ў Маскве, заходні грузаперавозчык можа выканаць шмат эфэктыўнай працы, курсуючы па раўнюткіх зьвязаўскіх аўтастрадах. Такім чынам, у першую чаргу адсутнасьць інфраструктуры зьяўляецца прычынай нежаданьня зьвязаўскіх аўтаперавозчыкаў падарожнічаць у згаданым напрамку.

Польшча таксама прыстасавалася да каардынацыі надглядаў са сваімі ўсходнімі суседзямі, у тым ліку на польска-беларускай мяжы. Узорны тэрмінал дзейнічае ў Кукурыках на нашым баку і Казловічах на беларускім. Для нас незразумелы толькі супраціў беларускай адміністрацыі, які заключаецца ва ўпартым пазьбяганьні размоваў з польскай адміністрацыяй, каб наладзіць супольны мытны кантроль. Таму пакуль што перавозчык мусіць затрымлівацца раз на польскай мяжы, едзе далей, затрымліваецца другі раз на беларускім тэрмінале і выконвае тыя ж самыя дзеяньні, што на польскім. Ад такой практыкі ўжо ўсе адыходзяць. Амаль усе эўрапейскія краіны адышлі. Але з боку беларускіх уладаў мы бачым настолькі вялікае нежаданьне, што трацім надзею на тое, што гэтая праблема будзе вырашана. З Расеяй мы маем вельмі малы кавалачак мяжы — толькі з Калінінградзкай вобласьцю. Там таксама дзейнічае беларуская мадэль, дзе польскія мытнікі знаходзяцца на польскім баку, а расейскія мытнікі — на расейскім. У сувязі з гэтым там таксама падоўжаны час чаканьня, і трэба зусім недарэчна два разы праходзіць кантроль.

**Паводле радыё «Палёнія»**
http://www.radio.com.pl/polonia

# Помнік сьвятару-адраджэнцу

**На могілках у мястэчку Целяханы, дзе побач пахаваныя нямецкія жаўнеры першай сусьветнай вайны і маці маршала Ракасоўскага, 6 лістапада быў асьвячоны помнік на магіле беларускага сьвятара Баляслава Пачопкі.**


АЛЕСЬ ТРАФІМЕНКА

Баляслаў Пачопка стаў каталіцкім сьвятаром бізантыйскага абраду ў 1926 г. Высьвячаў яго мітрапаліт Галіцкі Андрэй Шаптыцкі ў саборы Сьв.Юра ва Львове. Айцец Баляслаў атрымаў прызначэньне на пробашча каталіцкай парафіі славянска-бізантыйскага абраду ў вёсцы Бабровічы, а таксама выконваў абавязкі вікарнага сьвятара ў рыма-каталіцкай парафіі ў Целяханах. Апрача душпастырскай працы, якую ён вёў сярод людзей, Пачопка быў сталым удзельнікам унійных канфэрэнцый, якія ладзіліся ў Пінску ў міжваенным часе. Дарэчы, рабіў даклады выключна па-беларуску. Айцец Баляслаў працаваў сярод вернікаў у Бабровічах да самай сьмерці ў 1940 г. Прыход савецкай улады моцна ўскладніў ягонае служэньне. Ад арышту ўратавала яго толькі заўчасная сьмерць, а ягоныя жонка і дзеці мусілі хавацца і ратавацца ўцёкамі. Пахавалі яго на каталіцкіх могілках каля Целяханаў.

Доўгі час месца пахаваньня а. Баляслава Пачопкі было невядомае, бо старыя могілкі амаль зьніклі ў лясным гушчары. Дапамог шчасьлівы зьбег абставінаў. У мясцовым друку ўзьнялася дыскусія наконт стану могілак і патрэбы іх аднаўленьня. Невядома, што мела вырашальнае значэньне — тое, што на іх пахаваная маці маршала К. Ракасоўскага ці знаходзяцца магілы нямецкіх жаўнераў першай сусьветнай вайны, але летась могілкі былі ўпарадкаваныя. Тэрыторыю расчысьцілі, паставілі агароджу. З дапамогай мясцовых жыхароў адшукалі Пачопкаву магілу. Напачатку паставілі драўляны крыж, але адразу ж зьявілася ініцыятыва стварэньня помніка.

6 лістапада ў прысутнасьці грэка-каталіцкага духавенства і прадстаўнікоў усіх грэка-каталіцкіх парафій Беларусі адбылося пасьвячэньне драўлянага помніка аўтарства баранавіцкага разьбяра **Міколы Коласа (на фота — першы справа ад помніка)**. Дарэчы, Пачопка сам быў добрым майстрам па дрэве і разьбяром. Царкву ў Бабровічах ён пабудаваў сваімі рукамі. Дагэтуль як сямейную рэліквію захоўваюць яго нашчадкі, якія цяпер жывуць у Польшчы, ружанец, створаны айцом Баляславам і пасьвячоны пазьней папам рымскім.

Пасьля паніхіды на магіле Пачопкі, у Бабровічах, дзе яшчэ жывыя людзі, якія асабіста памятаюць а.Баляслава, адслужылі паніхіду на брацкай магіле жыхароў, якіх немцы спалілі падчас апэрацыі «Балотная трасца» ў 1943 г.

Царкву, збудаваную Пачопкам, зьнішчылі ўжо пасьля вайны, ён аказаўся апошнім сьвятаром, які служыў у Бабровічах. Памяць аб ім яшчэ дагэтуль такая моцная сярод мясцовых жыхароў, што яны прапаноўвалі нават адрадзіць грэка-каталіцкую парафію. Зьдзейсьніць гэта не ўдаецца толькі праз супраціў праваслаўнага сьвятара зь Целяханаў, які знайшоў падтрымку мясцовых уладаў.

Грэка-каталіцкі сьвятар зь Берасьця а. Ігар Кандрацьеў зрэдку даяжджае ў Бабровічы — і тады людзі сьпяшаюцца на могілкі, каб памаліцца на магілах продкаў і пачуць Божае Слова на мове, на якой гаварыў іхны даваенны душпастыр.

**Алесь Трафіменка**

### ДАВЕДКА «НН»

**Баляслаў Пачопка** нарадзіўся ў 1884 г. на Віленшчыне, у засьценку Уляны, што пад Рукойнямі. Ад 1907 г. быў сталым аўтарам «Нашай Нівы», а падчас пражываньня ў Вільні наладзіў сувязь зь беларускім нацыянальным рухам. У 1913—1915 выдаваў газэту «Biełarus». У 1915 г. Б.Пачопка стварыў першую Сьвіслацкую беларускую настаўніцкую сэмінарыю. Ён аўтар адной зь першых беларускіх граматык (1915) лацінкай.

## Адзін помнік рэстаўруюць, другі руйнуюць

У Воршы пасьля рэстаўрацыі ўрачыста адчынены жылы будынак былога кляштару трынітараў. Раней у помніку архітэктуры XVIII ст. месьціліся архіў ды жыльлё. Умовы для жыцьця 12 сем'яў былі ня вельмі спрыяльныя — пячное ацяпленьне (узімку ў архіўных сховішчах устойліва трымалася мінусавая тэмпэратура), выгоды — на двары. Дарэчы, было гэта ў самым цэнтры гораду.

На рэканструкцыю будынку выдаткавалі 1,5 млрд руб. Кажуць, ніводнага рубля на рамонт не атрымалі сёлета іншыя архівы краіны — усё забрала Ворша.

У будынку, выдатным узоры архітэктуры барока, падчас рэканструкцыі ў асобных памяшканьнях былі адкрыты ўнікальныя фрэскі, якія будуць захаваныя.

Большую частку будынку зойме занальны архіў.

Акрамя яго ў будынак пераедзе гарадзкі ЗАГС, для якога нават прыбудавалі асобны шыкоўны ўваход.

Каб не псаваць прывабнага выгляду адрэстаўраванага будынку, давялося зьнесьці дзіцячую кавярню, што месьцілася побач. Праўда, на месцы храму Сьвятой Тройцы (пазьней Уваскрасенскага сабору), які быў канчаткова зруйнаваны ў 1960 г., засталіся жэрдкі для бялізны, якімі карыстаюцца жыхары суседніх дамоў.

Несумненна, жылы будынак былога трынітарскага кляштару стане файным экскурсійным аб'ектам Воршы. На жаль, пакуль не хапае сродкаў для рэстаўрацыі жылых будынкаў Куцеінскага Богаяўленскага манастыра ды базылянскага кляштару. Калі не прыняць тэрміновых мераў для кансэрвацыі апошняга (пасьля мінулае зімы ён застаўся бяз даху), яго можа чакаць лёс будынку афіцыны былой езуіцкай калегіі. Нядаўна на гэтым аб'екце былі праведзеныя т.зв. супрацьаварыйныя кансэрвацыйныя работы — будынак зьнесьлі да падмуркаў. Калі ж надыдзе час для ягонага аднаўленьня і колькі на гэта спатрэбіцца сродкаў, цяпер сказаць цяжка.



**Віктар Лютынскі, Ворша**

## Кухары прыгадваюць крыўскія рэцэпты

Полацкія кулінары наладзілі ў рэстарацыі «Быліна» нараду. Тэма адмысловая — нацыянальная беларуская кухня. Сваё кулінарнае майстэрства прадэманстравалі кухары ўсіх значных пунктаў грамадзкага харчаваньня. Для сэрвіроўкі сталоў выкарыстоўвалі традыцыйны посуд — збаны, гаршкі, міскі, драўляныя каўшы і лыжкі. Дэманстравалі як клясычныя стравы: дранікі, верашчаку, мачанку, поліўку з грыбамі, жур, — так і сучасныя, якія самі распрацавалі, карыстаючыся асобнымі традыцыйнымі прыёмамі, напрыклад смажаны кабанчык з бульбы. Гэткая ўвага да нацыянальнай кухні нададзена на ўзроўні кіраўніцтва гораду. Старажытная крыўская сталіца ў пэрспэктыве мусіць стаць турыстычным цэнтрам, а таму ў кавярнях і рэстарацыях турыстаў павінна чакаць нешта калярытнае.

**Васіль Кроква, Полацак**

## З кірмашу маскоўскага — са стратамі

З сталічнай каманды ў Маскву на чатырохдзённы кірмаш вазілі сваю прадукцыю прадстаўнікі Слуцкага мясакамбінату, Салігорскага і Капыльскага малочных заводаў, а таксама мясцовага спажывецкага таварыства. Масквічы спакусіліся на параўнальную таннасьць прывазной прадукцыі і за першыя тры дні раскупілі 2,5 тоны слуцкіх каўбас і вяндліны. Аднак прыбыткаў ад гэтай далёкай паездкі ў рамках так званай «інтэграцыі» камбінат не атрымаў, а Салігорскі малочны завод панёс страт на 6 млн рублёў. Дый з завезеных у Белакаменную прамысловых тавараў раённага спажывецкага таварыства на суму 105 млн рублёў было прададзена за чатыры дні толькі на 20 млн — зноў жа прыбытак застаўся ў марах. Аб прымаўцы «За морам цялушка — палушка, а рубель перавоз» чулі беларускія вытворцы, ды баяцца не паслухацца каманды зьверху.

## Трохмільённы штраф за скрынку віна

Прадпрымальніца Сьвятлана Вяроўка набыла для асабістых патрэб дзьве скрынкі беларускага віна і захоўвала яго на складзе ўласнага магазыну. Але падатковая інспэкцыя «пранюхала» пра сьпіртовы запас і склала аж два пратаколы адразу — аб парушэньні дэкрэту прэзыдэнта ад 18.12.2002 г. №30 і аб парушэньні правілаў прадпрымальніцкай дзейнасьці. Судзьдзя Натальля Халадок прапанавала Сьвятлане падпісаць трэці пратакол — аб захоўваньні алькагольных напояў без суправаджальных паперак. Гэты дакумэнт і паслужыў асновай для вынясеньня адміністрацыйнага штрафу Сьвятлане Вяроўкі на суму 3,5 млн руб. Судзьдзя ня ўзяла пад увагу таго, што віно жанчына набыла для асабістых патрэб, што было пацьверджана касавым і таварным чэкамі. Вярхоўны суд, куды Сьвятлана Вяроўка зьвярнула скаргу, пакінуў рашэньне суду першай інстанцыі ў сіле. Цяпер жанчына рыхтуе матэрыялы для перадачы справы ў міжнародны суд.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Спакусіліся аленем

Егер Даманаўскай паляўнічай гаспадаркі С.Гарбавец кіраваў паляваньнем у лесе ля вёскі Вялікая Гаць, што на Івацэвіччыне. Адзін з паляўнічых падстрэліў аленя, на якога дазволу не было. Згодна з інструкцыяй, у такім выпадку егеру трэба скласьці пратакол на браканьера. Аднак ён гэтага не зрабіў, і зь ягонай маўклівай згоды тушу разабралі. Паласавацца сьвежанінай перашкодзілі прадстаўнікі дзяржаўнай інспэкцыі. Толькі пасьля гэтага егер паведаміў пра здарэньне кіраўніцтву гаспадаркі. Яна палічыла паводзіны свайго работніка за пазыцыю чаканьня і звольніла С.Гарбаўца з працы. Хоць удзельнікі паляваньня добраахвотна кампэнсавалі ўрон, нанесены гаспадарцы, на іх заведзена крымінальная справа, і стрэльбы ў іх забралі.

**Алесь Лаўранюк, Івацэвічы**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Прыемныя восеньскія клопаты

**З дня на дзень чакаем зіму. Прагнозы штовечар палохаюць. Пакуль не наваліла сьнегу, можна апошні раз схадзіць у лес і сад. На балотных купінах зьзяюць чырвоныя журавіны, а на пясчаных грудах можна знайсьці апошнія прымарожаныя падзялёнкі. У апошнія празрыстыя восеньскія дні не забудзьцеся абвязаць маладыя шчэпы хваёвымі лапкамі, каб узімку не абгрызьлі зайцы. Павыграбаць і папаліць сьмецьце. Перакапаць грады, панакрываць ігліцай ці лапкамі ружы, вінаград і іншыя нястойкія на мароз прысады. Выкапаць і пакласьці на захаваньне ў лёх вяргіні. Дзе-нідзе на рабінах пазаставалася па ягадзіне. Ня квапцеся — пакіньце птушкам.**

## Тэатры

**опэра**

**11** (чц) — «Лючыя ды Лямэрмур».
**13** (сб) — «Хаваншчына».
**14** (ндз) — «Чароўная флейта».
**18** (чц) — «Пікавая дама».
**20** (сб) — «Вясельле Фігара».

**балет**

**16** (аўт), **17** (ср) — «Сьпячая прыгажуня».
**19** (пт) — «Спартак».
**21** (ндз) — «Рамэо і Джульета».

**Купалаўскі тэатар**

**12** (пт), **20** (сб), **21** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
**13** (сб) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**14** (ндз) — «Я не пакіну цябе».
**15** (пн) — «Згублены рай».
**17** (ср), **18** (чц) — «Тутэйшыя».
**19** (пт) — «Ромул Вялікі».
**21** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».

**Малая сцэна**

**13** (сб), **20** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**14** (ндз) — «Саламея».
**15** (пн) — «Барух-Эмануэль».
**19** (пт) — «Баляда пра каханьне».

**Тэатар імя Горкага**

**11** (чц) — «Адзіны спадкаемца».
**12** (пт) — «Анджэла і іншыя».
**14** (ндз) — «Тэрмінова патрабуецца... самагубца».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**12** (пт) — «Па старонках маёй памяці».
**13** (сб), **14** (ндз) — «П’емонцкі зьвер».

## Выставы

**«З клясыкі беларускага мастацтва»**

Мастацкая галерэя «Ля-Сандр-Арт» (вул.Раманаўская Слабада, 24) запрашае на выставу «З клясыкі беларускага мастацтва». Творы Віталя Цьвіркі, Аўгена Красоўскага, Івана Ахрэмчыка, Мая Данцыга, Барыса Няпомняшчага, Антона Бархаткава, Натана Воранава, Мацьвея Беляніцкага, Мікалая Дучава, Івана Карасева ды іншых. Выстава доўжыцца **з 11 лістапада да 11 сьнежня**.

**Цэсьлер і Войчанка ў Парыжы**

Два вядомыя беларускія мастакі Ўладзімер Цэсьлер і Сяргей Войчанка запрошаны ў Парыж у рамках восеньскага «Салёну кампаньёнаў Манмартру». **З 12 да 17 лістапада** ў галерэі 18-й акругі Парыжу адбудзецца іх выстава плякатаў.

**Выстава мастакоў Беларускага ліцэю**

У памяшканьні Ўправы БНФ **да 21 лістапада** працуе мастацкая выстава навучэнцаў падпольнага Беларускага ліцэю імя Якуба Коласа.

**З прыватнай калекцыі Ксяневіча**

**З 9 лістапада да 1 сьнежня** ў гарадзкой мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава твораў з прыватнай калекцыі Яўгена Ксяневіча. Уваход вольны.

**Калекцыі Радзівіла ў Мастацкім музэі**

**З 5 лістапада да 5 студзеня** Нацыянальны мастацкі музэй запрашае на выставу «Нясьвіскія калекцыі Радзівілаў». Квіткі — 2000.

**Выстава аб першай сусьветнай**

У Нацыянальным музэі гісторыі і культуры **да 21 лістапада** працуе выстава фатаздымкаў «Сутокі: праз 90 гадоў і лінію фронту». Выставы прысьвечана першай сусьветнай вайне. Квіткі — 2000.

## Канцэрты

**Манюшка і ягоны час**

**11 лістапада** а 19-й варта быць у Камэрнай залі Белдзяржфілярмоніі (касьцёл сьв. Тройцы (сьв.Роха), дзе ансамбаль салістаў «Клясык-авангард» прадставіць праграму «С.Манюшка і ягоны час», прысьвечаную юбілею беларускага клясыка. У праграме музыка як самога юбіляра, так і іншых айчынных і «блізказамежных» аўтараў XIX ст. (М.Глінкі, А.Дворжака, К.Ельскага, М.Ельскага, А.Концкага, А.Курпіньскага, Ф.Міладоўскага), а таксама твор нашага сучасьніка Віктара Капыцькі.

**К/з «Менск»**

**12** (пт), 19.00 — новая праграма Алега Міцяева «З марнаваньня часу».
**14** (ндз), 19.00 — Бутусаў і «Юпитер» з новай праграмай «Біяграфіка».
**19** (пт), 19.00 — Гурт «Агата Кристи» з новым альбомам «Tru Ilep»

## Клюбнае жыцьцё

**Графіці** (693–74–16, 280–01–54)

**11** (чц), 20.00 — вечар аўтарскай песьні. Кацярына Варкалава.
**12** (пт), 20.00 — вечар ROCKавай музыкі. Гурт «Flame».
**17** (ср), 20.00 — вечар джазавай музыкі. Іван Барысаў & Co.
**19** (пт), 20.00 — Вечар ROCKавай музыкі. Гурт «Zombie zoo».

**Рэактар** (650–63–21)

**11** (чц), 20.00 — гурт «ТТ-34» прадстаўляе дэбютны альбом «Грубы памол». Квіткі: 8000 (танцпол), 12000 (столікі).
**12** (пт), 20.00 — прэзэнтацыя рэгі-праграмы «Кон-Цікі».
**19** (пт), 18.00 — прэзэнтацыя альбому «Hard Life — Heavy Music-3».

**Extreme** (679–00–00)

**12** (пт), 21.00 — першы беларускі сынт-поп-фэстываль «Электрарамантыка».

**Bronx** (288–10–61, «Velcom»: 103 і 105)

**11** (чц), 22.00 — Jennie Sobol Birthday.
**12** (пт), 22.00 — жывая музыка.
**13** (сб), 23.00 — dj-bar.

**Белая Вежа** (284–69–22, 239–16–00)

**11** (чц), 22.00 — «White Tower Party»: dj Dee, dj Top, dj Grizzly.
**12** (пт), 22.00 — адкрыты чэмпіянат музыкі і танцу: dj Палены vs dj Астап (Масква), dj Top vs dj Сыймэн (Масква); dj Міхель.
**13** (сб), 22.00 — dj Міхель.
**14** (ндз), 22.00 — dj Alex.

**Гудвін** (226–13–06)

**11** (чц), 21.00 — жывая музыка: джаз-трыё «N.C.».
**12** (пт), 21.00 — жывая музыка: Аркадзь Эскін і яго джазквартэт.
**13** (сб), 21.00 — жывая музыка: група «Мадэра Хард Блюз».
**14** (ндз), 21.00 — жывая музыка: Аркадзь Эскін і яго джазтрыё.
**15** (пн), 21.00 — жывая музыка.

**Бліндаж** (219–00–10, 671–58–65)

**11** (чц), 23.00 — dj Egor.
**12** (пт), 23.00 — «Blind Rave»: dj List (Масква), dj Noche: 8000/10000.
**14** (ндз), 23.00 — resident dj Egor.

**X-Ray** (223–93–55)

**12** (пт), 22.00 — «Back into the Groove-3»: dj Heiko (Camouflage), dj Arsenti Tchouprina.
**13** (сб), 22.00 — dj Grizzly.

## Менская кінаафіша з 12 да 14 лістапада

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні»: **12** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **13, 14** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.
«Кіроўца для Веры»: **12—14** (пт—ндз) 18.30, 20.40.
«Чумавая пятніца»: **12—14** (пт—ндз) 16.40.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Пярэпалах у інтэрнаце»***: **12** (пт) 16.30 (іл, пд), 18.50 (іл, пд), 21.00 (іл, пд); **13, 14** (сб, ндз) 14.00, 16.30, 18.50, 21.00 (пд).

**«Дружба»** (240-90-13)
«Адкрытае мора»***: **12** (пт) 20.00; **13** (сб) 18.00; **14** (ндз) 20.00 (іл).
«Цыпачка»: **12** (пт) 18.00 (іл); **13** (сб) 20.00; **14** (пт) 18.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Белыя цыпачкі» (прэм’ера): **12** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00 (пд); **13, 14** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00 (пд).

**«Масква»** (223-27-10)
«Белыя цыпачкі» (прэм’ера): **12** (пт) 16.20 (пд), 18.40 (пд), 21.00 (пд); **13, 14** (сб, ндз) 14.10 (іл), 16.20 (пд), 18.40 (пд), 21.00 (пд).

**«Мір»** (284-37-71)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні»: **12** (пт) 16.40, 18.50, 21.00; **13** (сб) 14.00, 16.40, 18.50, 21.00; **14** (ндз) 14.00 (іл), 16.40, 18.50, 21.00.
«Кепскія дзяўчаты»: **12—14** (пт—ндз) 18.10, 20.00.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні»: **12** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **13, 14** (сб, ндз) 16.20 (іл), 18.40, 21.00.
«Весьягонская ваўчыца»: **12—14** (пт—ндз) 14.00.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Хронікі Рыдыка»: **12** (пт) 16.20, 18.30, 21.00; **13, 14** (сб, ндз) 16.00, 18.30, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Пярэпалах у інтэрнаце»***: **12—14** (пт—ндз) 13.00, 17.00, 21.10.
«Паляўнічыя на розум»***: **12** (пт) 11.00, 15.00, 19.00; **13, 14** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.00, 19.10.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пд) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Для дзяцей

**опэра**

**21** (ндз) — «Пітэр Пэн».

**Тэатар юнага гледача**

**12** (пт), **16** (аўт) — «Паганага нораву варты плён».
**13** (сб) — «Шлях на Батлеем».
**14** (ндз) — «Парасё, якое сьпявае».
**17** (ср), **18** (чц) — «Тарас на Парнасе».
**19** (пт) — «Што стварыў цуд».
**19** (пт) — «Апошняя дуэль».
**20** (сб) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі».
**20** (сб) — «Рыцар ордэну Сонца».
**21** (ндз) — «Папялушка».

**Купалаўскі тэатар**

**14** (ндз) — «Афрыка».

## Юнаму гледачу

**«Аўрора»**
«Шрэк-2»: **12** (пт) 14.30; **13, 14** (сб, ндз) 12.00, 14.30.

«Берасьце»
«Два браты»: **12** (пт) 10.30.
«Казка пра рыбака і рыбку»: **13, 14** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**
«Легенда пра рыцара»: **12** (пт) 12.00; **13, 14** (сб, ндз) 11.00.
«Том і Томас»: **12** (пт) 14.00; **13, 14** (сб, ндз) 13.00.

**«Мір»**
«Шрэк-2»: **12** (пт) 15.00; **13, 14** (сб, ндз) 13.00, 15.00.

**«Піянер»**
«Пітэр Пэн у Нідзеляндыі»: **12** (пт) 11.00; **13** (сб) 14.00; **14** (ндз) 10.30.
«У пошуках Нэма»: **12** (пт) 14.30; **13** (сб) 10.00; **14** (ндз) 12.15.
«Тайна Блакітнай даліны»: **14** (ндз) 14.00.

КІНО Ў МЕНСКУ

# Круты дзядзька супраць сьвятых мерцьвякоў

**Калі ў гледачоў няма жаданьня траціць рэшткі розуму ў кампаніі «Белых цыпачак» ці складана трапіць на рэдкія кінасэансы Аляксея Мурадава, то даступныя ў кінапракаце «Хронікі Рыдыка» пададуцца ня самым кепскім кінатаварам.**



«Хронікі Рыдыка» («The Chronicles of Riddick»)

ЗША, 2004, каляровы, 119 хв.

**Жанр:** Касьмічнае фэнтэзі з элемэнтамі фільму жахаў

**Адзнака:** 3,5 (з 10)

У далёкай будучыні злыя паслугачы сьмерці Нэкрамонгеры зьнішчаюць цэлыя сусьветы ці навяртаюць іх у сваю веру. Адзіная сіла, здольная супрацьстаяць ім, — фурыянец Рыдык (Він Дызэль), які пераваандраваў у гэты фільм з фантастычнай карціны «Чорная дзірка». Рыдык не вылучаецца добрымі манерамі, але, як сьцьвярджае зданепадобная прарочыца Аэран (Джудзі Дэнч), «зло выбіваюць яшчэ большым злом».

На Рыдыка палююць піраты, але самотны герой адпраўляецца на плянэту-турму Крэматорыю, каб вызваліць знаёмую дзяўчыну (Алекса Давалас).

Карціна нагадае гледачам фільм Джона Траволты «Поле бітвы — Зямля». Элемэнты страхалюдзтва ў карціне больш самастойныя: монстрападобныя чытальніцы думак, фіялетавыя морды паляўнічых за жывымі, маскі, падвешаныя на круках адэпты новай веры (прывітаньне «Паўсталым зь пекла») і выдраная зь цела душа.

Але фаны Віна Дызэля будуць ад яго ў захапленьні. Герой Віна Дызэля вынаходліва б’е ворагаў сярпом, кулаком, аўтаматам і кубкам гарбаты. А ягоная незьнішчальнасьць пры тэмпэратуры 700 градусаў нагадае радасьці раздалбайскага трэшу. Праўда, рэжысэр Дэвід Туохі вырашыў надаць гэтым радасьцям сур’ёзны і эпічны маштаб.

**Андрэй Расінскі**

# Вячаслаў Корань: «Жыцьцё дзеля грошай — дрыгва»

**Што дае андэграўнд разумнаму музыку? Ці паедзе «Ўліс» на «Эўрабачаньне»? 31 кастрычніка ў рэдакцыі «Нашай Нівы» саліст «Уліс»у Слава Корань адказваў на пытаньні чытачоў на «жывой лініі».**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Забарона па-над намі

**— Ваша стаўленьне да забароны на беларускую музыку ў радыё- і тэлеэтэры і да таго, што адбылося 17 кастрычніка?**

— Я ня бачыў папер з забаронай, таму не магу камэнтаваць. У мяне адчуваньне забароны было даўно: кожны канцэрт — апошні, кожны — першы. Іх ня так шмат, каб успрымаць інакш. А гэтыя падзеі… Для мяне яны ня сталі асабістай трагедыяй. Негалосная забарона даўно лунае над намі.

**— «Уліс» знаходзіцца ў глыбокім андэграўндзе, як савецкі рок у канцы 80-х: няма ні ратацый на радыё, ні этэру на ТБ. Ці ёсьць нейкія плюсы ў такім становішчы?**

— Андэграўнд для разумнага рок-музыканта — мажлівасьць вольна працаваць. Жыцьцё дзеля грошай — шлях у дрыгву.

## «Басовішча» перастала быць скурніцкім

**— Ці будзеце вы ў журы адбору на «Басовішча» налета?**

— Калі запросяць, то абавязкова. У беларускай тусоўцы, як і ў прапрэзыдэнцкім музычным коле, кожны цягне сваіх. А музыка горшае, таму я буду выцягваць таленавітых. Музтусоўка становіцца ўсё менш дэмакратычнай.

**— Вашы прагнозы: у што ператворыцца «Басовішча»?**

— Пакуль усё даволі аптымістычна. Яшчэ пяць гадоў таму здавалася — гамбец фэсту. Пачаўся скурніцкі падыход: зарабіць шмат грошай, меней заплаціць беларускім музыкантам і найтаньней правесьці іх выступ, каб польскія каманды выглядалі мацнейшымі. Калі зьмянілася кіраўніцтва БАСу, больш дэмакратычнымі сталі і падыходы да арганізацыі.

**— Ці зьбіраецеся браць удзел у адборы на «Эўрабачаньне»?**

— Ды што вы! «Эўрабачаньне» — супрацьлегласьць маім уяўленьням пра музыку.

## Папса — лаянкавае слова

**— Спадару Вячаслаў, як вы ставіцеся да папсовых сайд-праектаў нашых музыкантаў?**

— Кожны вольны рабіць што захоча. Асабіста я не вітаю папсовых праектаў. Для мяне слова «папса» — лаянка.

**— А што ў Беларусі — поп ці папса?**

— Ні аднаго, ні другога. Усё, што ні робіцца тут, — толькі спроба зарабіць, «фабрыка зорак»: мо пашанцуе?! У нашай інфармацыйнай прасторы гэта магчыма, толькі калі капіяваць расейскае.

Вяршыня раскруткі для наскага слухача — этэры на расейскіх каналах. БТ проста ня мае такога аўтарытэту.

**— А чаму так?**

— Тут справа ў беларускім мэнталітэце, які склаўся за 70 гадоў савецкай улады, у прыніжэньні ўласнай годнасьці як нацыі. Для нашага гледача беларускае тэлебачаньне местачковае, а вось расейскае — сур'ёзнае. Няма кантактаў з Захадам, таму ўсе глядзяць у бок Масквы.

**— Вы калісьці былі на гастролях у Ангельшчыне, Германіі, убачылі іх шоў-бізнэс знутры. Няўжо ён адрозьніваецца ад расейскага?**

— Сыстэма тая ж, але ўзровень публікі вышэйшы за постсавецкі. Дзеля гэтага і не патрэбна людзям такая папса, як у Расеі.

## «Ты — пан зямлі, я — пан свайго сумленьня…»

**— Калі «Ўліс» зробіць акустычны запіс сваіх песень?**

— Новы склад гурту езьдзіў на «Бардаўскую восень», дзе гралі акустыку (бонгі, акустычная гітара і клявішы). Выступалі таксама на Беластоцкім радыё ўжывую. Калі ўзровень запісу прыстойны — праграма можа быць выдадзена.

**— Ці будуць на перавыданьнях першых альбомаў нейкія сюрпрызы?**

— Там будуць усе песьні, што запісаны ў той час. На кожным з альбомаў будуць адзэтрэкі ўрыўкаў зь першага «Басовішча» і канцэрту з «Холі Джой» у Менску.

**— Вершы якіх беларускіх паэтаў маглі б стаць тэкстам песень «Уліс»у?**

— Я не ўяўляю, што мы можам пісаць тэкст перад музыкай. Музыка больш абстрактная рэч, якая навеяна нейкімі ўнутранымі настроямі. Тэкст — гэта тлумачэньне. Пакуль зрабілі толькі тры песьні на вершы Караткевіча, бо проста не ўяўляю сабе «Ўліс» з паэзіяй. Нагул, зь беларускіх падабаюцца вершы Ларысы Геніюш. Любімы такі:

Ты — пан зямлі, я — пан свайго сумленьня,  
І нада мною ты не валадар.  
То за табою крыўда пойдзе ценем  
І будзе мсьціць разбураны алтар.

Дык ты дрыжы паміж уласных стражаў,  
Каб змыць віну, шукай у сэрцы слоў.  
А я пайду. І нехта ціха скажа:  
— Вунь чалавек дарогаю пайшоў.

…Якраз пад нашу сытуацыю.

**— Не спрабавалі на яго напісаць музыку?**

— Немагчыма. Я ня бард.

## «Ні на кога я не раўняюся!»

**— Па калямузычных колах хадзілі чуткі, што калі Корань бярэ чалавека ў групу, то забараняе яму граць у іншых калектывах…**

— Як жа можна забараніць чалавеку граць? Гэта, напэўна, Ганс хацеў сысьці з папярэдняга складу, дык і сказаў так, каб не даставалі журналісты. А Вольскі пераманіў яго: узяў на колькі канцэртаў, а пасьля забраў. Дарэчы, Ганс патрапіў ва «Ўліс» невядомым нікому і стаў найлепшым беларускім бубначом. Цяпер трэба падрыхтаваць новага найлепшага бубнача.

**— Выходзіць парадаксальная сытуацыя: «Уліс» — гэта вялізная «кузьня кадраў», аднак нясамаакупны праект…**

— Дык скажэце, які гурт самаакупаецца, тады я і падумаю пра гэта. Размовы пра самаакупнасьць — толькі праца на імідж у будучыні.

**— Хто працуе над вашым вобразам?**

— Гэта маё жыцьцё — ні на кога я не раўняюся.

**— Што для новых музыкантаў значыць быць «улісаўцам»?**

— У любой краіне патрапіць у групу, што мае вядомасьць, дзясяткі альбомаў, вельмі цяжка. Такі шанец выпадае толькі раз у жыцьці. Калі людзі гэта зразумеюць, яны стануць «улісаўцамі».

**— Вашая любімая песьня «Ўліс»у.**

— «Краіна доўгай белай хмары».

## Музычныя капіталісты

**— Хто ваша аўдыторыя?**

— Людзі, якія хочуць нешта ўбачыць, пачуць і зразумець. Ім ня ўсё адно, што ідзе са сцэны. Аўдыторыя «Ўлісу» ня будзе ўскокваць на крэслы па першым акордзе. Мне не патрэбна, каб яны танцавалі. Захочуць пляскаць у канцы — і добра.

**— Што можна будзе пачуць 13 лістапада на канцэрце ў КЗ «Менск»? Ці рыхтуецца нейкае адмысловае шоў?**

— Наагул, лічу, што для добрага рок-канцэрту важныя добрыя гук і сьвятло. А шоў — няўдзячная рэч, бо перабівае ўнутраны настрой. Іграць будзем усё «Люстэрка» і старыя песьні. Самае ж «смачнае» — упершыню ва «Ўлісе» зьявяцца клявішы апроч гітар.

**— Ці ходзіце на іншыя беларускія канцэрты?**

— На тыя, якія робіць Супрановіч, бо там можна задарма прайсьці. Аднак мне не падабаюцца выступы: няма ні добрага сьвятла, ні гуку. Сапраўдны рок-канцэрт у Менску зрабіць немагчыма. Затое падчас адбору на «Басовішча» зразумеў, што ёсьць шмат клясных гуртоў, якія разьвіліся адасоблена ад беларускай тусні і прапрэзыдэнцкага крыла ў музыцы. Гэтыя людзі здольныя рухаць рок на Беларусі.

**— За час кіраваньня Лукашэнкі ўзьнікла цэлая новая генэрацыя ў музыцы. Ці ёсьць у яе прадстаўнікоў нейкія мэнтальныя адрозьненьні ад тых, хто пачынаў яшчэ да 1994 г.?**

— Я няшмат зь імі кантактаваў. Але з падрыхтоўкі да «Басовішча» зразумеў, што яны больш прафэсійныя, чым папярэднікі. Гэтыя людзі не шкадуюць грошай на музыку. Летам працуюць замест паездак на поўдзень, каб набыць тую ж гітару. Капіталізм у музыцы і іншы падыход да жыцьця.

## «Пецю трэба стрымліваць»

**— Спадар Вячаслаў, раскажэце пра сваю працу саўндпрадусара.**

— Гэта вытворчасьць гуку. Я зрабіў першыя тры альбомы «N.R.M». У працу ўваходзіць запіс, зьвядзеньне. Вядома, саўндпрадусар можа даваць парады, як лепш сыграць. Гэта датычыць тых людзей, якія любяць доўгія і шпаркія сола. Таму трошкі стрымліваў Пецю, калі трэба было.

**— Некаторыя чытачы тэлефануюць і пытаюцца ў вас пра «NRM». Выходзіць, што значная частка беларускай музыкі жыве і разьвіваецца ў цяні гэтага гурту?**

— «N.R.M» патрапілі ў хвалю, калі ў нас быў голад на рок-гурты. На іх музыцы вырасла пэўная частка моладзі. Аднак ня тыя, хто працуе летам, каб набыць гітару.

**— Як вы ставіцеся да трыб'ютаў, што пачалі так часта зьяўляцца на Беларусі?**

— Мне падаецца, што гэта вынік адсутнасьці інфармацыйнага поля моладзевай культуры. Напрыклад, у Лёндане ў сфэры па дзьве тысячы груп штодня. Нашы трыб'юты — толькі мажлівасьць трапіць на кампакт-дыск. Я кепска стаўлюся да такіх праектаў.

**— Трыб'юту «Ўлісу» мы не дачакаемся?**

— Ішла размова нейкая ў Інтэрнэце. Аднак ня кожная каманда змажа зрабіць песьню «Ўлісу».

## «Мая гітара каштуе сто баксаў!»

**— Ці чулі вы пра ўкраінскі гурт «Улисс»?**

— Нядаўна даведаўся праз Інтэрнэт. На сайце запісаны сьпіс іх сяброў-музыкантаў, многія зь якіх ўдзельнічалі ў канцэрце ў Львове ў 1998 г., дзе былі і мы. Падаецца мне, што пасьля гэтага і ўтварыўся «Улисс». Склад у іх «наш» — бубны, бас-гітара, гітара, вакал. Я ім накіраваў прывітаньне. Адказу няма.

**— Якія асноўныя адрозьненьні беларускага і ўкраінскага музычнага рынку?**

— Калі ў Львове пазнаёміліся з гуртом «Плач Єремії», то зразумеў, што адрозьненьні скурніцкія. Падыходзіць да мяне адзін з «Плачу» і кажа: «А што ты на такой таннай гітары граеш? Во ў мяне за 2500 баксаў, а ў цябе за сто». Я адказаў, што мне ня важна гэта. Расейскі шоў-бізнэс забіў ва Ўкраіне рок-музыку. Пасьля нашага выступу нам сказалі: «У нас так нават у Кіеве ня граюць». Ва Ўкраіне няма музыкі зь цяжкай гітарай.

**— Дзе ў сьвеце шукаць месца для музыкі «Ўлісу»?**

— Імпэрыя паставіла свае парадкі на постсавецкай прасторы, таму месца ёсьць толькі ў сябе на радзіме. Моладзевая культура мусіць цягнуць, ісьці ў авангардзе, выхоўваць. А ў Расеі навучыліся зарабляць на тых, хто нічога ня ўмее. Верх шоў-бізнэсу! Паспрабуй зарабі на прафэсіяналізьме.

**— А ў вас не было спакусы так падзарабіць?**

— Не. Аб душы пара падумаць.

**Жывую лінію запісаў Сяргей Трафілаў**

**13 лістапада ў КЗ «Менск» адбудзецца сумесны канцэрт гуртоў «Уліс» і «Троіца». Пачатак а 19-й. Квіткі каштуюць ад 7 да 20 тыс. рублёў.**

# Што з Разанавым?

**Паэт Алесь Разанаў трапіў у рэанімацыю — палату інтэнсіўнай тэрапіі, як гэта называюць на Захадзе — бонскай унівэрсытэцкай клінікі. Першапачатковы дыягназ — інфаркт — не пацьвердзіўся.**

Радыё «Свабода» паведаміла, што Разанаў правёў некалькі дзён у коме. «Свабода» перадала таксама, што паэт пасьля выхаду з комы ў першы дзень сказаў некалькі словаў па-беларуску і толькі на другі дзень Разанаў загаварыў яшчэ й па-нямецку, на мове, зразумелай пэрсаналу клінікі.

Жонка паэта Галіна, якая вылецела да яго ў Бон, аднак, у гутарцы з карэспандэнтам «НН» абвергла зьвесткі пра каматозны стан Разанава. Зь яе словаў, у паэта напэўна выяўленае запаленьне лёгкіх і канстатуюцца парушэньні рытму сэрца. Яна падзякавала ўсім, хто тэлефануе ў Бон і турбуецца аб стане паэта, але папрасіла СМІ не публікаваць дадумак і не ўрывацца ў прыватнае жыцьцё паэта.

Мэдыкі ад камэнтароў наконт стану Разанава ўстрымліваюцца. Адно вядома пэўна: захворваньне паэта было ўскладнена запаленьнем лёгкіх. Цяпер стан Разанава паступова нармалізуецца, а дыягназ удакладняецца. Бонская клініка, у якой знаходзіцца паэт, лічыцца адной з найлепшых у фэдэральнай зямлі Паўночны Рэйн-Вэстфалія. Штодня паэт праходзіць разнастайныя адмысловыя дасьледаваньні. Які час Разанаву давядзецца яшчэ прабыць у клініцы, мэдыкі не канкрэтызуюць.

Паводле словаў Ганса-Ёхіма Губэра, прадстаўніка культурніцкага ведамства Бону, якое фінансуе сёлетняе пражываньне Разанава ў гэтым горадзе, мэдыкі кажуць «пра пазытыўную дынаміку».

**Адам Воршыч**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Алесь Разанаў** нарадзіўся 5 сьнежня 1947 г. у вёсцы Сялец Бярозаўскага раёну. У 1969 г. на філфаку БДУ выступіў за беларускамоўнае навучаньне. Пад пагрозай выключэньня вымушаны быў перавесьціся з сталіцы ў Берасьцейскі пэдінстытут, які скончыў у 1970 г.

Друкаваць вершы пачаў у 1961 г. Пераломным для творчасьці Разанава і беларускай паэзіі наагул стаў зборнік «Шлях-360» (1981). Для Разанава характэрны стылёвы пошук: ён увёў такія формы вэрлібру, як квантэмы, вэрсэты, пункціры. За кнігу «Вастрыё стралы» (1988) атрымаў Прэмію імя Янкі Купалы. Перакладаў зь літоўскай (Гяда, Сая, Авіжус), ангельскай (Шэкспір, Тагор), латыскай, грузінскай, баўгарскай, сэрбскай, харвацкай, чэскай моваў.

У 1989 г. быў абраны віцэ-прэзыдэнтам Беларускага ПЭН-цэнтру. Прыняў чынны ўдзел у аднаўленай у сярэдзіне 90-х «Крыніцы». Пры канцы 90-х з лукашэнкаўскай задухі выехаў у Нямеччыну. У Гановэры выдаў дзьвюхмоўную (беларуска-нямецкую кнігу) «Гановэрскія пункціры». Атрымаў прэстыжную эўрапейскую прэмію імя Гердэра. У Аўстрыі ў 2004-м выйшла кніга «Вортдыхтэ», напісаная па-нямецку. Гэта філязофска-паэтычнае тлумачэньне тых ці іншых нямецкіх словаў беларускім паэтам. Раней Разанаў практыкаваў такія «мэдытацыі» над словамі розных моваў, якія азначаюць адзін і той самы панятак, па-беларуску. Тэрмін «вортдыхтэ» зьяўляецца свайго роду нямецкім нэалягізмам, які стварыў сам паэт. У перакладзе гэта «шчыльнасьць словаў».

### Гановэрскія пункціры

*

Лопаецца на каштане
пупышка:
ого як няпроста
вылузвацца з абалонак!..
Ведаю, ліст.

*

У куксінах:
і калі
вы ўжо навучыцеся, як трэба
расьці, гарадзкія дрэвы?!

*

Прадвесьніца.
Дрэвы
ўслухоўваюцца ў вестку,
пні — ў немату.

*

Сьцяжынай дайшоў да ракі:
ні моста, ні кладкі.
Далей магчыма
ісьці адно толькі
вадою ці — па вадзе.

# «Arche» выціскаюць у падпольле

«Лукашэнкаўскі» нумар «Arche» добра раскупляецца (за месяц прадалося 700 асобнікаў з 1100), але выклікае раздражнёную рэакцыю ўладаў. Сьледам за «Белкнігай» прадаваць «Arche» адмовілася рэспубліканскае аб'яднаньне «Белсаюздрук». Паводле ліста за подпісам дырэктара «Белсаюздруку» Міхаіла Падгайнага, дамова на распаўсюджваньне часопісу скасоўваецца з 2 сьнежня. М.Падгайны тлумачыць сваё рашэньне тым, што «Arche» кепска куплялі. Як сьведчыць распаўсюднік Алесь Яўдаха, насамрэч «Arche» толькі адзін раз за 6 гадоў выданьня дасягнуў 50%-га сьпісаньня. У астатніх выпадках лічба была ў межах ад 0 да 30%, што вельмі мала для інтэлектуальнага часопісу. Так, вяртаньне папярэдняга «полацкага» нумару «Arche» зь Менгарсаюздруку склала 68 асобнікаў з 250, прычым вернутыя асобнікі рэдакцыя прадае праз кнігарні. Усяго праз шапікі «Саюздрукаў» прадавалася 450 асобнікаў часопісу.

Галоўны рэдактар выданьня Валер Булгакаў бачыць за гэткімі дзеяньнямі палітычны загад з Адміністрацыі прэзыдэнта: «Яны ўспрынялі наш часопіс як пагрозу для сябе на гуманітарным напрамку. Абы-што ў нас не забараняюць. І калі інтэлектуальны часопіс з накладам, меншым у 25 разоў за «Народную волю», забароняць, гэта будзе знакам для ўсяго сьвету, што ў Беларусі вынішчаецца ня толькі палітычная, але і культурная альтэрнатыва».

Пакуль на «Arche» можна падпісацца праз «Белпошту». Галоўнае ж, кажа В.Булгакаў, «ёсьць незалежныя распаўсюднікі і прыватныя кнігарні, якія не падначальваюцца ні «Белкнізе», ні «Белсаюздруку» і задаволяць попыт». Наклад «Arche» галоўны рэдактар абяцае не зьніжаць. «Мы робім часопіс ня толькі для інтэлектуальных мэтаў. Калі нам давядзецца пайсьці на зьніжэньне накладу, гэта будзе паразай усяго беларускага грамадзтва». Таму рэдактар «Arche» заклікае людзей актыўней шукаць часопіс.

**Аркадзь Шанскі**

### Самы танны «ARCHE»

**Часопіс «ARCHE» абвесьціў падпіску на 2005 год па надзвычай нізкай цане — 2360 рублёў за нумар. Такім чынам рэдакцыя хоча кампэнсаваць нэгатыўны ўплыў на продажы з прычыны забароны прадаваць выданьне ў кнігарнях «Белкнігі». Часопіс выходзіць з пэрыядычнасьцю раз на два месяцы. Падпісны індэкс 00345. Падпіску можна аформіць на ўсіх аддзяленьнях пошты.**

Аляксандар Ворвуль

# Слоўнік скептыка



**Ерась** — самая захапляльная ідэя.

**Ерэтык** — чалавек, які лічыць, што Бог ёсьць, але ня верыць у яго.

**Ёга** — разьдзел «Камасутры» для дзяцей і пэнсіянэраў.

**Жабрак** — чалавек, які паспадзяваўся на дапамогу сяброў.

**Жанаты** — чалавек, які любіць на адну жанчыну меней.

**Жанімства** — апошні камплімэнт мужчыны жанчыне.

**Жанчына** — слабая, безабаронная істота, ад якой немагчыма ўратавацца.

**Жанчына надзіманая** — жанчына тым больш прыгожая, чым мацнейшыя лёгкія.

**Жанчына нелюбімая** — жанчына, якая спрашчае жыцьцё мужчынам.

**Жанчына непрыгожая** — жанчына рэдкай прыгажосьці.

**Жанчына пасьпяховая** — жанчына, якая здолела знайсьці пасьпяховага мужчыну.

**Жанчына разумная** — адзіная жанчына, якая можа вытрымаць дурнога мужчыну.

**Жанчына сапраўдная** — жанчыная, якая павінна сьпілаваць дрэва, разбурыць дом і выгадаваць дачку.

**Жанчынаненавісьнік** — мужчына, які ненавідзіць жанчын ня меней, чым жанчыны ненавідзяць адна адну.

**Жуйка** — любімая ежа амэрыканцаў.

**Жнівень** — месяц, калі вы ня можаце адчыніць тое акно, што не зачынялася ў сьнежні.

**Журналістыка** — здольнасьць закранаць важныя тэмы, не закранаючы важных асоб.

**Жывапіс** — паэзія, якую бачаць.

**Жывы** — той, хто выбірае, каб зь яго лепей сьмяяліся, чым плакалі.

**Жыцьцё** — непрыемнасьць, якая адбываецца ў апошні момант.

**Жыцьцё палітычнае** — штодзённыя абдымкі з тымі, каго цярпець ня можаш.

**Жыцьцярадаснасьць** — імкненьне сьцьвярджаць, што ўсё добра, калі насамрэч усё дрэнна.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Аляксееў А., Лукашэвіч А. Спадчына Беларусі=Heritage of Belarus**. — Менск, 2004. 3000 ас.

Альбом выдрукаваны на аснове матэрыялаў аднайменнай фотавыставы, зладжанай сёлета ў штаб-кватэры ЮНЭСКА ў Парыжы. Дзеля падрыхтоўкі праекту маладыя аўтары аб'ехалі самыя рэпрэзэнтацыйныя гістарычныя куточкі Беларусі. Паліграфічная якасьць выданьня высокая, бракуе камэнтару да здымкаў. Выпуск альбому блаславілі і мітрапаліт Філарэт, і ксёндз Казімер Сьвёнтак. Цана ў «Акадэмкнізе» блізу 47500.

**«Беларускі Рэзыстанс». Часопіс найноўшай гісторыі. №1**. — Менск: Выдавецтва «Беларускі Рэзыстанс», 2004. — 110 с. 299 ас.

Дакумэнты і лісты, успаміны і дасьледаваньні — усё, што дагэтуль пылілася ў прыватных і дзяржаўных архівах, у Беларусі і за мяжой, знаходзіць месца на старонках гэтага выданьня. У № 1 зьмешчаны артыкулы Я.Матыса «Спробы арганізацыі беларускага антысавецкага партызанскага руху на Беласточчыне ў 1944—1945 г.», С.Ярша «Забойства Фабіяна Акінчыца», С.Шнэка «Ўзброеная Случчына, да гісторыі Беларускае краёвае абароны», інтэрвію Галіны Філістовіч і Міколы Рулінскага, савецкія агентурныя зьвесткі пра СБМ і інш. Цана 3500.

**Івашын В. Жрацы Імпрэзы:** Амаль навуковы трактат з галіны палітычнае паталёгіі. — «Голас Краю», 2004. — 20 с. 299 ас.

Кніга ідэоляга ўкраінскага нацыяналізму, лідэра арганізацыі «Трызуб» імя С.Бандэры. Цана 1000.

**Караткевіч У. Лісьце каштанаў:** Аповесьці. Вершы. — Менск: Сталія, 2004. — 138 с. 1000 ас.

Зборнік у мяккай вокладцы ўключае дзьве аповесьці («Лісьце каштанаў», «Чазенія») ды падборку зь сямі найбольш вядомых Караткевічавых вершаў («Быў. Ёсьць. Буду», «На Беларусі Бог жыве...» й інш). Цана 2300.

**Караткевіч У. Сівая легенда.** — Менск: Сталія, 2004. — 138 с. 1000 ас.

Апроч аднайменнай аповесьці, у кнізе друкуюцца таксама «Ладзьдзя роспачы» й «Паром на бурнай рацэ». Цана 2150.

**Катовіч А., Крук Я. Зімовыя сьвяты:** Нарысы / Маст. У.Васюк, А.Баранаў. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 119 с. — (Беларускі народны каляндар). 2000 ас.

Прычытаўшы яе, можна будзе ўжо сёлета «па ўсіх правілах» арганізаваць калядную вячэру, а потым шчодрую ды вадзяную куцьцю. Цана ў «Кнігарні пісьменьніка» 6940.

**Пракаповіч І., Вансовіч Н., Заяц І. — Манькавічы: гісторыка-геаграфічны нарыс.** — Паставы: «Сумежжа», 2004. — 60 с.

Гэтая кніжачка прысьвечаная невялічкай вёсачцы Манькавічы, што на Пастаўшчыне.

**Рагойша В. Паэтычны слоўнік**. — 3-е выд., дапрац. і дапоўн. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 576 с. 2000 ас.

Каля 1000 тэрмінаў па тэорыі паэзіі, зь іх — 50 новых.

**Харашэвіч К. Зьведанае і перажытае.** — Маладэчна: «Бібліятэчка часопісу «Куфэрак Віленшчыны», №9, 2004. — 144 с. 299 ас.

Кніга сьлыннага маладэчанскага мастака-рэаліста — гэта раней друкаваныя ў «Куфэрку Віленшчыны» ўспаміны.

**Анташкевич И. Беларусь: воспоминание о будущем или зов перемен.** — Можайск, 2004. — 256 с. 3000 ас.

Аўтар кнігі пры дапамозе міфаў, успамінаў і гістарычных экскурсаў разьбірае праблемы станаўленьня беларускага народу і дзяржаўнасьці. Цана 1000.

**Тацяна Вабішчэвіч, Сяргей Лескець**

ФЭЛЬЕТОН

# Памылка Пталямэя

## Пісьмо трудзяшчыхся роднай уладзе

Нягледзячы на ўзмацненьне стабільнасьці й разьвіцьцё дабрабыту рэспублікі, насуперак увядзеньню курсаў Ідэалёгіі й Вялікай Перамогі ў школах, стаўленьне да нас з боку краінаў сьвету па-ранейшаму застаецца асымэтрычным. З аднаго боку, абурае тое, як халодна прымаюць нашых парлямэнтэраў у высокіх эўракабінэтах, як тапырыцца на мяжы натаўская пошасьць, як кажанамі кружляюць над Бацькаўшчынай розныя міжнародныя назіральнікі й купленыя імі здраднікі зь ліку апазыцыі. І, зь іншага боку, нельга не заўважыць брацкае рукі дапамогі й падтрымкі, якую працягваюць нам далёкія, але блізкія па духу арабскія браты — такія ж абязьдоленыя і адрынутыя «залатым мільярдам».

У сваіх лістах, датаваных 1994-м і наступнымі гадамі, мы ўжо прасілі бязьлітасна карэктаваць падручнікі гісторыі, неабачліва выдадзеныя да ўсенароднага волевыяўленьня. Цяпер надышла чарга геаграфіі. Вучэньне пра часткі сьвету, вядомае нам з школьнага курсу, у прынцыпе, грунтуецца на антынавуковых грэцкіх мітах і безнадзейна ўстарэла. Геапалітычныя рэаліі патрабуюць ад цябе, родная ўлада, няпростага рашэньня, і мы, трудзяшчыеся, цябе ўпаўнаважваем і бласлаўляем. Нясьпеў час перавесьці нашу краіну з Эўропы ў шэраг дзяржаў Блізкага Ўсходу.

Плюсы відавочныя. Пасьля такога пераходу ў нашых нетрах па аналёгіі можа зьявіцца ў вялікай колькасьці нафта. А гэта дазволіць вырашыць паліўныя і мазутна-змазачныя праблемы. Апроч таго, Беларусь займее магчымасьць стаць монаканфэсійнай краінай — ці варта згадваць хаос першых гадоў незалежнасьці, калі праваслаўныя фактычна сядзелі на чамаданах? Апроч таго, будзе магчымасьць актыўней уключыцца ў працэс супрацьстаяньня міжнароднаму тэрарызму шляхам раскладаньня яго зь сярэдзіны. Зь пераходам на Блізкі Ўсход лягічна будзе выглядаць і недалучэньне краіны да эўраатлянтычных структураў. Дэ-факта для Эўропы мы і так краіна блізкага ўсходу, у адрозьненьне ад Расеі, якая ўжо крыху далейшая. А каб з нашым адыходам у мусульманскі сьвет не парушылася раўнавага, можна прапанаваць лічыць эўрапейскай дзяржавай Турцыю, якая даўно ўжо пнецца ў ЭЗ.

Яшчэ вышэйазначаны пераход дазволіць напоўніцу выкарыстаць турыстычны рэсурс нашай краіны і дасягнуць пастаўленай табой, родная ўлада, задачы аб валавым звароце ў 1,5 млрд турыстаў штогод. Фанабэрыстыя эўрапейцы ў такой колькасьці наўрад ці да нас паедуць, а вось блізкаўсходнія браты, калі спрасьціць візавы рэжым, паваляць валам. Бо ў жыцьці ні сьнегу, ні елак нашых ня бачылі.

Блізкі Ўсход — гэта надзейны партнэр, гэта гарантыя рэалізацыі прадукцыі савецкіх прадпрыемстваў, якія ва ўсіх іншых, апроч нашай, рэспубліках пачалі пасьля канвэрсіі вырабляць рондалі і прасы. Блізкі Ўсход — гэта сям'я народаў, якая ў адзіным парыве ўздымаецца супраць замежнай агрэсіі, — зь ёй нам ніякія пашырэньні ня страшныя. Яшчэ Блізкі Ўсход — гэта стабільная сыстэма ўлады, якая дазваляе не выкідаць вялізных сродкаў, такіх неабходных нашым людзям, на непатрэбныя выбары кожныя пяць гадоў.

Усё гэта можа станоўча паўплываць на імідж нашай краіны як асяродку стабільнасьці і дабрабыту.

**Сяргей Мікулевіч**



Андрусь Храпавіцкі

### Паміж Глыбокім і Вільняй

Паміж Глыбокім і Вільняй
Пішуцца гэтыя рымы...
Ў вагоне пад поглядам пільным
Узбоч ад Менску і Рыму,
Падскокваючы на рэйках,
Бы фэн на канцэрце «Рамштайну»,
Ня верш я пішу, а рэмэйк на
Наўкольную аднастайнасьць.
Твары пасьля плебісцыту:
Вунь Юзік зьбірае бутэлькі,
Вунь едуць Пятро і Рыта
Зь лёсам ушчэнт разьбітым —
Сын лёг у Аўгане пякельным.
Во Гена, мужык лысаваты,
Працуе ў Глыбокім чэкістам,
Па-мойму, крыху паддаты,
Нагадвае аб камуністах.
Вунь нейкія бабкі гамоняць,
Што зноў не прыйшла аўталаўка.
Ў аднэй сын паехаў у Слонім,
Ў дачкі будзе, пэўна, надбаўка,
Бо сакратаркай на ўчастку
Праседзела, і на працы
Дырэктар сказаў, што пашчасьціць
Ёй крыху на грошы ўзьняцца.
Вунь едуць два пратэстанты
Зь Менску дамоў у Паставы
З кніжкамі, сшыткамі й «Фантай».
Размову вядуць пра справу.
Неяк усё руцінна,
Нібы не было нічога —
Ні мітынгаў на Скарыне,
Ні фарсу на выбарах. Толькі
Дарога, дарога, дарога...
Пад поглядам Генавым пільным
Рымую сваё маналёгі
Паміж Глыбокім і Вільняй.

### Дарыда памёр

Дарыда памёр. Маўчаньне плыні.
Дарыда памёр. Руіны тэкстаў
Ад Парыжу да Глыбокага і Гдыні,
Ад Рэмарка да Дэкарта і Скарыны,
Увасоблены ў нэкралёгава аскецтва.

Дарыда памёр, як верш, што напісаны,
Які маім быў пяць хвілін таму, а зараз
Ён ужо не мой — ён вам адданы,
І можа быць па-рознаму любым з вас прачытаны.
Ён вашага ўяўленьня і пачуцьця ахвяра,

А я, мінак у чытачоў натоўпе,
Кілішак уздыму чырвонага сухога
За Дарыду, які ўвесь сьвет трымаў пад мікраскопам
І які, як гэты тэкст, пайшоў ужо да Бога.
*Глыбокае*

● КРЫЖАВАНКА ●

**Па гарызанталі:** 1. «...Томаса Краўна», фільм. 2. Рэчы падарожнага. 5. «Начны...», фільм. 7. Контур. 9. Ліпавы мёд. 10. Рускі «тяж». 11. Найпапулярнейшы кандытарскі выраб. 13. Салодкі мядовы напой. 14. Істота, якая дапамагае забыць пра прусакоў. 15. Садовы гадаванец. 16. Песьня з альбому «Крамбамбуля-1,5» у выкананьні Сяргея Міхалка. 18. Усё мінус крыху. 21. Матэматычная літара. 23. Калі ёсьць выбар. 25. Мяшочак для табакі. 26. Дакладнае месца жыхарства. 27. Мужчынскае адзеньне. 28. Ананімны допіс.

**Па вэртыкалі:** 1. Калі ўсё зьеў і больш ня можаш. 2. Падстава для чырвонага радка. 3. Рыбацкая пасудзіна. 4. Імя легендарнай францускай ваяўніцы. 5. Ліст. 6. Мясная страва з гароднінай. 7. Вынік неасьцярожнасьці з гарачымі рэчамі. 8. Вялікі і трывалы слуп. 11. Лодка для вандраваньня па хуткіх рэках. 12. Прэснаводная беларуская рыбіна. 15. Папяровая тара. 17. Палітычная ці эканамічная хеўра. 19. Злучнік двух берагоў. 20. Самы «італьянскі» музычны інструмэнт. 21. Старажытнаславянскі бэйсбол. 22. Рускі «овсюг». 23. Народная цырымонія. 24. Клетачная цяга.



**Па гарызанталі:** 1. Афэра. 2. Багаж. 5. Дазор. 7. Абрыс. 9. Ліпец. 10. Атоса. 11. Булка. 13. Сыта. 14. Клоп. 15. Плод. 16. Няма. 18. Амаль. 21. Лічба. 23. Альбо. 25. Кісет. 26. Адрас. 27. Армяк. 28. Данос.
**Па вэртыкалі:** 1. Адвал. 2. Абзац. 3. Баржа. 4. Жанка. 5. Допіс. 6. Рагу. 7. Апёк. 8. Стоўп. 11. Байда. 12. Акунь. 15. Пачак. 17. Альянс. 19. Мост. 20. Лера. 21. Лапта. 22. Аўсюк. 23. Абрад. 24. Осмас.

Запрашаем у падарожжа
**14 лістапада** (нядзеля)
па маршруце: **Менск—Крэва—Баруны—Гальшаны—Дзясятнікі—Вішнева—Валожын—Менск**. 18000
**21 лістапада** (нядзеля)
**«Нёманская каса»**: Вузда—Кухцічы—Наднёман—Нясьвіж—Вішнявец—Новы Сьвержань. 18000
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**19—21 лістапада**
**запрашаем у вандроўку**
**Варшава часоў «Салідарнасьці»**
Т.: 661-30-38, 202-23-38 (Алена), 755-03-70 (Зьміцер).
**Кошт: 25 у.а. + віза.**

**Шукаю аднадумцаў** для ўтварэньня беларускага турыстычнага клюбу.
btclub@tut.by

*Віншуем Віктара і Вольгу Савіцкіх*
з нараджэньнем сына.
Сям'я Грыневічаў



Нашаніўцы *віншуюць Вольгу Раковіч і Віктара Савіцкага*
з нараджэньнем сына.
Гадуйце
на радасьць усім!

● КАІСА ●

# Плюсы і мінусы Кальвіі

Не пасьпелі журналісты спартовых газэт раскрытыкаваць шахматных чыноўнікаў за зьняважлівае стаўленьне да чэмпіёна і віцэ-чэмпіёнкі краіны, якіх не ўзялі ў алімпійскую зборную, як Алімпіяда адшумела, нібы восеньскае лісьце. Шахматысты — папуляцыя скептыкаў, і ў колах, блізкіх да фэдэрацыі, адчуваецца незадаволенасьць 18-м месцам мужчынскай зборнай і 27-м — жаночай. Для рапарту ў мінiстэрства лепей пасавала б пара медалёў… Аднак што вы хочаце?.. У клясыфікацыі Міністэрства спорту і турызму шахматы ня лічацца прыярытэтным напрамкам, таму выйграваў не выйграваў — грошай не прыбудзе, ня кажучы пра кватэры ды іншыя «моркаўкі» для выдатных спартоўцаў.

Рэй на алімпіядзе вялі каманды Ўкраіны і Кітаю, але і беларуская шахматысты, якія прадстаўлялі пераважна Рэспубліканскі цэнтар алімпійскай падрыхтоўкі, паказалі, што зь імі трэба лічыцца. На трэцяй дошцы ў жанчын Рахіль Эйдэльсон заваявала сёмае месца (7 з 9), сярод мужчын вызначыўся Андрэй Жыгалка (5,5 з 8 ачкоў). Астатнія дамы й кавалеры згулялі ў сваю сілу. Што праўда, зьдзівіў Сяргей Азараў — саступіў малавядомаму таджыцкаму майстру Сухрабу Хамдамаву, а пазьней выйграў у грознага Найджэла Шорта, які яшчэ год дзесяць таму аспрэчваў у Каспарава першынство ў сьвеце. Гэткай жа пакручастай выявілася гульня першай дошкі жаночай зборнай Беларусі: у выніку Генрыета Лагвілава адзіная сярод беларусаў засталася ў «мінусе».

Паразы за дошкай — ня самае страшнае. Вось чэмпіёну Эўропы Зурабу Азмайпарашвілі на закрыцьці Алімпіяды дасталося дык дасталося: яго пабілі мясцовыя ахоўнікі ды яшчэ й пасадзілі «на суткі». Ледзь удалося калегам зь ФІДЭ яго вызваліць. І гэты скандал як у кроплі вады адлюстраваў неабароненасьць інтэлектуальнай эліты ў сучасным сьвеце.

Паралельна з галоўнымі спаборніцтвамі — двубоямі нацыянальных каманд — у гішпанскім мястэчку Кальвія праходзіла пяць пабочных турніраў. Народных, так бы мовіць, разьлічаных перадусім на вэтэранаў, дзяцей і аматараў бліцу. Уражвалі памеры прызавых фондаў — ад трох да трыццаці тысяч эўра. Беларусаў сярод удзельнікаў гэтых турніраў ужо не было.

**ВР**



### Як бы вы згулялі?

**Хусэйнаў Р. — Дыдышка В., Кальвія, 2004. Ход чорных.**

**Адказ:** 1...f2+! 2. Kpf2 Tae8 3. Tae1 f3. Белыя здаліся.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Ірыне В. з Лагойску.** Вы апісалі ня тое, як праходзіў рэфэрэндум у Лагойску, а свае ўражаньні ад яго. Гэта іншым ня так цікава. Апісвайце факты і зьявы, а ня ўласныя ўражаньні ад іх.

**Яўгену Б. зь Менску.** Тое самае датычыць перакладзенага Вамі тэксту. Акрамя таго, жанр «Кароткай гісторыі пра расчараваньне і безнадзейнасьць» — не газэтны, а хутчэй, для літаратурнага ці асяродкавага часапісу. Прапануйце ў «Дзеяслоў» ці студэнцкую газэту.

**Аляксею Ш. зь Менску.** Юбілеем «НН» лічыць дату з крокам у 25 гадоў. Ваш расповед пра сустрэчы з Станіславам Шушкевічам не выходзіць за межы прыватных уражаньняў і агульных заўваг.

**Міколу Б. з Дубровы.** Дзякуй за моўныя назіраньні й заўвагі. Перадамо іх аўтарам. Калі ласка, дасылайце іх часьцей. Скансэн — гэта музэй традыцыйнай архітэктуры й побыту пад адкрытым небам. Пытаньне да лідэраў «Пяцёркі+» карэспандэнт улічыць.

**Зьміцеру Х. з Страсбургу.** Матэрыялу пра эвалюцыю іншамоўных назоваў Беларусі не стае інтрыгі і разынак. Не захапляе.

**Сяргею П. зь Менску.** Вашаму агляду маладой беларускай драматургіі не стае ахопу. Таксама не выпадае аналізаваць свае творы, хай нават крытычна. Іншыя зробяць тое лепей.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Настасься Мацяш
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3499. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 10.11.2004.
Замова № 6888.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а